6a5882

ЯКУБ КОЛАС

АДШЧАПЕНЕЦ

ДВБ ЛІМ

Бл 5882

ЯКУБ КОЛАС

АДШЧАПЕНЕЦ

Бл 5882
Пол. адд. 1994 г.

ДЗЯРЖАЎНАЕ
ВЫДАВЕЦТВА БЕЛАРУСІ
МЕНСК ЛІМ 1932

. . C.
AS Nr. 269.811.

Рэдактар *А. Некрашэвіч*
Тэхрэдактар *Ул. Сокалаў*
Здана ў друкарню 24/VII—32 г.
Падпісана да друку 24/VIII—32 г.

Sk. J.M. r. N: 147022
3.X.34.

LATVIJAS VALSTS BIBLIOTEKA
25. 04. 2009

Зак. № 1682. 4.000 (6½ друк. арк.). Галоўлітбелу № а 2875.

Друкарня імя Сталіна.

АДШЧАПЕНЕЦ

I

Сьмела і ўпэўнена, як нейкі важны адміністратар, ходзіць на полі вецер. Відаць, і яго захапіла ідэя колектывізацыі: ён вельмі гарліва сьцірае ўсякія сьляды і знакі індывідуальнай гаспадаркі—засыпае сьнегам вузенькія межы, дзе матляюцца голыя вярхі сухога быльніку, абагульняе загоны і цэлыя палеткі, бязжаласна трасе хірлявыя кусты па канцох шнуроў, як-бы хочучы павырываць іх, каб і сьледу не засталося ад іх, каб не напіналі яны аб граніцах. І з асаблівай заўзятасьцю насядае ён на двор і сядзібу Пракопа Дубягі, наносячы туды цэлыя гурбы хрыбусткога сьнегу, пранятага ёмкім марозам. Ад Пракопавага плоту засталіся адны толькі кончыкі кольляў над замыславатымі карнізамі сьнягоў, а клуня па самую страху ўвайшла ў гурбы. І трудна сказаць, чаму так ня-

ласкаў вецер да дзядзькі Пракопа; ці то таму, што яго сядзіба крыху вытыркае з раду другіх сядзіб, тулячыся ў лагчынцы каля балота, што падступае амаль да самай вёскі Затоньне, ці можа і таму, што дзядзька Пракоп ня надта горнецца да колектывізацыі.

Ужо месяцы са два, а можа і болей як дзядзька Пракоп носіць ў сабе гэты цяжкі колгасны клопат і гэтыя недаступныя думкі аб колгасе. Ды як і ня думаць аб ім, калі ўсе і ўсюды толькі тое, і робяць, што гавораць аб колектывізацыі, аб колгасах і чым далей, тым ўсё галасьней і ўсё з большым запалам. Проста ў вушох гудзе ад гэтых гутарак.

Пракоп на дварэ тупае, пракідае сьцежку ад клуні да хлява, ды толькі пачмыхвае носам, каб прачысьціць трохі ноздры-люхты ад насеўшага там пылу—ён толькі што дамалаціў апошні пасад грэчкі. Матлошыць вецер Пракопаву бараду і псуе работу яму: засыпае сьцежку белымі струменчыкамі дробнага, пухкага, як мука сьнегу. Пракоп не зважае на гэта, упарта скробае лапатаю. Сказаць ня так і патрэбна яму гэтая работа—проста хочацца хоць чым-небудзь заняць рукі, каб адчапіцца ад надаедлівых думак. Але няма ад іх ратунку, сьвідруюць яны яму

мозаг, не даюць спакою, і работа ня клеіцца. Разгінаецца, выпроставае сваю крыху згорбленую сыпіну, трубіць пачырванелым носам у пальцы, на хаду зьняўшы рукавіцу, ды глядзіць на пагорак што за балотцам. На пагорку чуць рудзее пакручастая дарожка, як баразёнка, узораная плыўкімі палазамі, мястамі замеценая сьнегам, мястамі цямнеючы рудымі плямкамі конскага памёту. Маўклівая дарога, глуха і пуста на ёй.

І што яно будзе?—у соты, у тысячны раз пытае сябе Пракоп і не знаходзіць адказу. І як гэта так? ён больш ня будзе гаспадаром на сваёй зямлі! Цяпер ён волен рабіць, што хоча, як хоча і калі хоча, а там брат, дудкі: рабі тое, што табе прыкажуць. Нават над сваім конікам ня будзе ён гаспадаром!

Пракоп утыкае ў сьнег лапату, ідзе ў хлеў. Сваясаблівы і так знаёмы Пракопу запах хлява і конскага стойла востра б^{5}е ў нос. Падлясая карова з закарэлымі ад гною сьцёгнамі і трацячка-цялушка стаяць з аднаго боку, а па другую руку, зьвесіўшы губу, як адстаўны штацкі чыноўнік, дрэмле над жолабам рахманы чырвоненькі конік. Скаціна лагодна, кожная на свой манер, вітае гаспадара простымі аднаскладовымі

гукамі, што адпусьціла скупая для іх прырода. Колькі хвілін Пракоп стаіць моўчкі, глядзіць на скаціну, як-бы штось прыкідаючы ў сваім розуме, а потым гаворыць да цялушкі:

— Зробіш ты мяне, воўчае мяса, кулаком? А карысьці з цябе—кот наплакаў. Прадаць цябе ці што? Ці ты ў колгас пойдзеш?

Цялушка, чакаючы гаспадара, каб ён пачухаў яе пад сківіцаю, што рабілася ня раз, трасе галавою і выцягвае морду.

— Ня хочаш ў колгас? Ой, мусіць, пойдзеш— гаворыць Пракоп і чухае цялушку, а потым адразу абрывае гэтую сялянскую лірыку і дзелавіта падыходзіць да каня, глядзіць як там у яго ў жолабе. Строгім голасам робіць вымову каню за яго нешляхетныя паводзіны: конь умудрыўся накласьці ў жолаб таго, чаму быць там не палагаецца. Пракоп робіць у жолабе парадак і надае іншы характар свайму візыту ў хлеў, хоць асноўнаю прычынаю гэтага візыту было якраз жаданьне палюбавацца на сваю жывёлу, зрабіўшы парадак, яшчэ раз глядзіць на скаціну і выходзіць на двор. Работы няма там ніякай. Яго цягне на вуліцу паслухаць, што чуваць новага, што кажуць людзі. З раёну мелася прыехаць

сёньня нейкая брыгада. Будуць, кажуць, рабіць колектывізацыю. Пракоп ўздыхае і сунецца на вуліцу, яшчэ раз глянуўшы на дарогу.

II

Густа лепяцца наабапал вуліцы сялянскія хаты з такімі-ж вузкімі і цеснымі, як і сама вуліца дворыкамі. У агародчыках каля хат за пасівелымі частаколамі намецены гурбы сьнегу. Маленькія шыбы шчыльна затканы марозам. Тоўстым пластом зьлёг на саламяных стрэхах сьнег і здаецца, яшчэ ніжэй прыгінае да зямлі старасьвецкія будынкі, шэрыя, нізкія, аднастайныя. Адбітак старасьветчыны, убоства і акасьцянеласьці налажыў на іх глыбокі сьлед. Але Пракоп прывык да гэтых малюнкаў свае вёскі, як прывыкае прусак да свае шчыліны. Ён ня бачыць плесені заскарузлага ў сваёй архаічнасьці вясковага жыцьця.

Глуха і пуста на вуліцы, хіба толькі часамі прамільгне на ёй жаночая постаць з вёдрамі ды скрыпучым голасам зарыпіць журавель над прымітыўнаю студняю з трухлявым дзеравяным зрубам і гузамі лёду каля яго. Пустым, нібы вымершым здаецца і само затоньне. Але пад гэ-

тымі прыгнутымі саламянымі стрэхамі, за засьнежанымі шыбамі акон ідзе жыцьцё, вядуцца гарачыя дыскусіі, а часамі і ліквідацыя рухомай сялянскай маемасьці. Сям-там на задворках пылае агнём салома, а вецер разносіць гарэлы запах сьвіной шчэці. У гэтых ціхіх на погляд хатах на ўсе лады памінаецца колектывізацыя. Каля яе сконцэнтраваны ўсе думкі, пачуцьці і разрахункі практычнага сялянскага розуму, навокал яе вядзецца самая дзейнасная агітацыя і за і супраць. Яна робіць людзей і шчырымі прыяцелямі і зацятымі ворагамі, падзяляючы іх на розныя катэгорыі.

Пацягнуўшы носам паветра, Пракоп падымае галаву. Яго погляд запыняецца на хаце Лявона Марыніча. З коміна, дзе ўткнута шэрая пад колер сталі гліняная труба, тарапліва, як-бы яго ліхаманка трасе, плыве-бяжыць сіняваты дымок, а разам з ім расплываецца па паветры спакусьлівы запах сакаўных скварак.

— Гуляе Марынiч, запускі робіць,—сам сабе думае Пракоп,—у колгас наважыўся запісацца.

Павярнуўшы голаву на другі канец вуліцы, дзе яна ўжо выходзіць у поле, ён бачыць—чалавек пасоўваецца сюды. Хто-ж гэта? Пракоп прыглядаецца, пазнае. Да і пазнаць ня трудна: лісі-

ная шапка, кароткая на аўчынах бравэрка, суконныя нагавіцы з некаторым намёкам на галіфэ. Гэта Ігнат Чыкілевіч. Пракоп зноў прачышчае нос, праводзіць рукою па вусах—рыхтуецца да гутаркі з Чыкілевічам. Чыкілевіч—абаротлівы, сымякаліcты чалавек, спрытны гаспадар, жыве на водшыбі, індывідуальна абложаны, з чым ён ніяк ня можа пагадзіцца і лічыць, што з ім паступілі несправядліва.

— Дзень добры, таварыш Пракоп!

Чыкілевіч стараецца паказаць сябе савецкім чалавекам. Ён гарою стаіць за савецкую ўладу і часамі можа, дзе трэба, падпусьціць на яе карысьць агітацыі.

— Здароў!—кароткa адказвае Пракоп.

Чыкілевіч адразу заўважае, што Пракоп чымся заклапочаны, ня ў гумары.

— Што ня весел, голаву павесіў?—пытае Чыкілевіч і вострымі, крыху насьмешлівымі вачамі глядзіць на Пракопа. Пракоп, як і кожны селянін, дыплёмат. Свае карты раскрывае не адразу.

— Цяпер, брат, невясёлых няма. Усім стала весела. Работу пакідалі. А Марыныч, дык той зараз цэлага япрука прыкончыць. Такое зажар-

вае смажэньне, што ўсіх тхароў з ваколіцы пасьцягвае сюды... П'юць, гуляюць, як перад пустым канцом, прагульваюць і зводзяць гаспадаркі... Пагібель чуе народ,—ня выдзержвае нарэшце тону Пракоп. Чыкілевіч таксама мяняе позыцыю і заходзіць з дугога боку.

— Цёмны, дурны народ! Ой, які цёмны! І чаго яму валаводзіцца? Запісваліся-б у калгас.

— Ды некаторыя і пазапісваліся былі, але назад паадпісваліся.

— Бо дурні!—з жарам накідаецца Чыкілевіч:—ну, чым-жа кепска будзе ў колгасе? Ты-ж пасудзі сам: грамада, гуртовая праца, прастор. Ні табе гэтых межаў, ні вузкіх загонаў, дзе і з канём павярнуцца нельга. Зямля-ж, брат, вольнаю зьявілася ў сьвет, дык навошта дзяліць яе, рэзаць на шматкі, калаціцца з-за яе? А гуртам управіцца з ёю латвей. Што адзін чалавек, а што грамада! Вось табе прыклад. Ты адзін цупаеш цэпам і рукі дрантвеюць, падымацца ня хочуць. А стануць чатыры малацьбіты ды як жарнуць—адкуль яно што і возьмецца: і рукі лёгка ходзяць, і цэп сам падымаецца, проста як пад музыку, хоць у танцы ідзі. Так і ў колгасе. Да ці цапамі-ж там малаціць будуць? Машын

табе прышлюць, трактар пусьцяць, а ты сабе хадзі ды пасьвіствай.

— Як будзеш сьвістаць, то трасцу і мець будзеш,—панура адзываецца Пракоп:—а машына сама рабіць ня будзе. І перш, чым пусьціць трактар, то трэба папацець. І што твой трактар? Трактар каштуе вялікіх грошай: і сам ён дарагі, і бэнзін аплаціць трэба, аліву. Ды яго-ж хто-небудзь і вадзіць павінен, а мяне ці цябе на яго не пасадзіш. Ды па нашай зямлі, па камяніцы, ці пойдзе табе твой трактар? А паломіцца, вось тады і сьвішчы. А гною дасць ён табе? Рабіць-жа трамадою з нашым народам—ня многа ты наробіш. Адзін будзе працаваць, а дзесяць туліцца ад работы, як сабакі ад мух.

— Дысцыплінка, дысцыплінка, браце, павінна быць! Бяз гэтага нельга!— Чыкелевіч падымае палец і зьлёгка грозіць Пракопу, як настаўнік неразумнаму вучню і пераходзіць ужо на такі спосаб абароны колгасу, каб яшчэ больш адштурхнуць ад яго Пракопа.

— Перш за ўсё патрэбна цьвёрдая рука. Трэба пакомандваць нашым братам, кожнага на работу паставіць ды прымусіць і зрабіць яе. А свае меркаваньні і сваю волю прыдзецца ў

кішэньку схаваць. Там, брат, ня скажаш сабе: сёньня зраблю гэта, а заўтра тое, або сёньня даўжэй пасплю, а заўтра ўстану раней. Тут, брат, як па гудку на фабрыцы—загулі, і зьбірайся. І ўжо не паедзеш, куды табе зажадаецца. А калі такая патрэба здарыцца, то мусіш да начальства свайго пайсьці. Начальствам-жа можа быць і Кандрат Казей, бо хоць яго рукі да работы і ня здатны, але язык яго ходзіць спрытна. Ну, што-ж? работнік з яго хоць і ня важны, а адміністратар з яго можа быць добры. Пракоп, унурыўшыся, слухае, а потым перастае сачыць за словамі Чыкелевіча, разважаючы над пытаньнем, ці пойдзе ён у колгас, ці ня пойдзе.

Ня горне яго колгас.

Андрэй, старшы Пракопаў сын, быў у Чырвонай армії. Якраз у гэты дзень прышло ад яго пісьмо. Другі Пракопаў сын, Мікіта, сядзеў у хаце і чытаў матцы пісьмо. Між іншым Андрэй катэгорычна патрабаваў, каб ішлі ў колгас, што вельмі радавала і цешыла падлетка Мікіту. Ён ужо ня раз казаў бацьком, што колгас мае ўсе перавагі над дробнаю гаспадаркаю. Вось аб

гэтым у Таццяны і ў Мікіты і вялася гутарка. З маткаю Мікіта дагаварыўся лёгка: сваім практычным здаровым розумам яна бачыла, што ў колгасе чалавеку будзе лепей. Яшчэ да Андрэевага пісьма Таццяна выказвала Пракопу думку, што няма прычыны баяцца колгасу, бо калі чалавек будзе працаваць, то яму ўсюды можна жыць. Вось тут, на сваёй гаспадарцы, калі захварэе работнік, то ўся работа спыняецца. У калгасе-ж зусім інакш. Там работа ніколі не спыніцца: захварэе дзесяць, а на работу стануць сотні. Ды і работаю там ня будзе так душыцца чалавек. Праўда, гэтыя думкі выказваліся спачатку нясьмела, асьцярожна. Падаючы голас за колгас, маці пераважна кіравалася інтарэсамі меншага сына, якога яна дужа любіла і паважала. Мікіта-ж быў, можна сказаць, чалавек адукаваны. Мала таго, што ён скончыў сямігодку, дык ён яшчэ процьму кніг прачытаў аб колгасным будаўніцтве. Цяпер-жа, калі і Андрэй так цьвёрда гаворыць пра колгас, яна стала больш актыўнаю яго староньніцаю.

— Пражылі мы сваё жыцьцё. Дзеці заступяць наша месца,—разважала Таццяна,—а раз яны хочуць жыць у колгасе, дык навошта станавіцца ўпоперак ім дарогі?

Але калі ў хату ўвайшоў Пракоп, то маці і сын адразу змоўклі. Перастуліўшы парог і спыніўшыся ў качарэжніку, Пракоп, скоса зірнуўшы на жонку і сына, ушчаміў пальцамі нос, як музыка клярнэт, і двоякротна звонка затрубіў. Так ён рабіў кожны раз, калі быў чым-небудзь нездаволены або моцна заклапочаны. Не пазіраючы ні на кога і тупнуўшы разы са два, Пракоп моўчкі расьперазаўся і зьняў сярмягу. Некалькі хвілін у хаце панавала маўчаньне. Пракоп адчуваў, што і ў сваёй ўласнай хаце напірала на яго колгасная стыхія, выбівала грунт з-пад ног: ні ў жонцы, ні ў сыне не знаходзіў ён апоры ў сваім процівколгасным настроі. Але чым крапчэй напірала гэтая стыхія, тым з большаю сілаю і ўпартасьцю адпіхаўся ён ад яе. Хоць яго аргуманты блеклі, траціліся сілу ў яго ўласных вачох, але ён не здаваўся, ламаў галаву, шукаючы новых, прагавіта лавіў іх на вуліцы, на сходах і наогул дзе толькі можна злавіць.

— Апошнімі днямі цябе, Пракоп, і пазнаць няможна,—першая падала голас Таціяна:—ходзіш, панупы, як асуджаны, або як-бы на сябе зямлю носіш.

Гэтая прадмова была тою лішняю кропляю, што перапоўніла пасудзіну Пракопавых зґрызот.

Ён увесь ускіпеў і гатоў быў распрыжыцца ўсімі адзнакамі навальнічнай хмары, але раптам стрымаўся, сам ня ведаючы як, і заместа маланак і громаў, гатовых вырынуць з яго, ён са спакойнаю насьмешкаю адказаў:

— Ня можна пазнаць? то мусі-быць багатым буду.

Таціяна не спадзявалася такога спакойнага тону і наогул Пракопавага адказу, і гэты адказ зьбіў яе з тропу.

— Не вялікае шчасьце быць цяпер багатым,—заўважыла яна.

Мікіта, баючыся, што бацькі пачнуць парадзіць усякае глупства і Андрэева пісьмо можа выплысьці з цэнтру ўвагі, палічыў патрэбным умяшацца ў іх гутарку.

— Андрэй пісьмо прыслаў,—зьвярнуўся ён да бацькі і паказаў гэтае пісьмо, Пракоп перавёў погляд на Мікіту, а потым на пісьмо.

— Што-ж ён піша?

— А вось я пачытаю.

Мікіта разгарнуў пісьмо і стаў чытаць, Таціяна ціхенька ўходжвалася, каб не перашкаджаць чытаньню, а Пракоп вастрэй наставіў левае вуха і слухаў уважна, гледзячы ў неазначаныя прасторы.

Андрэй паведамляў, што ён здаровы. Апісваў сваё жыццё ў Чырвонай арміі, сваю вучобу, асабліва спыняючыся на вучобе агульна-асьветнага характару, а ў заключэньне, пытаючыся, што робіцца ў іх вёсцы, рашуча трэбаваў ісьці ў колгас. Калі Мікіта дайшоў да гэтага месца, то голас яго стаў званчэйшы, а тэмп чытаньня больш паважны. «Пара скончыць з аджытымі формамі гаспадараньня на вузкіх палосках і забіць асінавы кол ў магілу індывідуальнай гаспадаркі, дзе людзі толькі гібеюць, а на іх целе расьце шкодны грыб—кулак. Наш час—час разгорнутага наступленьня па ўсім фронце на кулацкія элемэнты ў вёсцы і на нэпманскія ў горадзе. Колектывізацыя сельскай гаспадаркі—вось лёзунг сёнешняга дня. Вы-ж там павінны стаць піонэрамі колгаснага будаўніцтва. Дык ня слухайце кулацкіх провокацый, а першымі запісвайцеся ў колгас».

Дачытаўшы апошні сказ, Мікіта выразьліва паглядзеў на бацьку. Пракоп сядзеў нярухома. Андрэева пісьмо яшчэ больш прыгнула яго. Вось насланое—як-бы ўсе згаварыліся супроць

яго і ціснуць з усіх бакоў! Але-ж трэба нешта сказаць, адгукнуцца на сынава пісьмо. Усьміхнуўся недарэчнаю ўсьмешкаю.

— Маладзец Андрэй: вeадe чырвонаармейскую дысцыпліну!

Мікіта не заўважыў іранічнага тону і палічыў бацькаў адказ за добры знак.

— Вось няхай толькі Андрэй са службы вернецца: яго старшынёю колгасу абяруць,—горача азваўся Мікіта. У ім гаварыла гордасьць за брата і ў той-жа час хацелася ўлагодзіць і бацьку.

— А цябе зробяць сакратаром, і будзеце бацькам камандваць... А працаваць на вас хто будзе?—Пракоп двойчы затрубіў носам. Мікіта расчаравана паглядзеў бацьку ў вочы. Але тут ня ўтрывала маці.

— Табе таксама ніхто не замінае быць сакратаром.

Пракоп з дакорам паглядзеў на жонку: навошта-ж гэты глум з яго? Як ён можа быць сакратаром, калі ён няпісьменны? Сярдзіта затрубіў носам, а маці сыпала далей:

— Ты-ж думаеш—пісаць дык гэта не работа? Нябось трэба пасушыць галаву, пакі навучышся.

Ба 5882

Ды ці зьнясе яшчэ твая галава, каб пісаць?

— Ды куды ўжо варта мая галава?—з крыўдаю ў голасе сказаў Пракоп:—стараўся, працаваў, колькі хапала змогі, зьбіраў дабро, як крумчак косьці...

— Хто-ж кажа, што ты не працаваў? Працаваў то ты многа.

— Многа ці мала, а падзяка адна.

І раптам, павысіўшы голас, зьняважліва сказаў:

Эх, вы, калгасьнікі! Батракамі захацелі быць! У яго зьявілася патрэба выказаць свае мысьлі аб колгасе. Даўно ўжо карцела ў яго думка выступіць з прамоваю на сходзе, а цяпер якраз налучаецца зручны выпадак. Дык ці не сказаць яе цяпер? Па-першае, будзе практыка яму, а па-другое, праверыць моц свае прамовы. Каб наблізіць сваю ролю да ролі прамоўцы на сходзе, Пракоп кашляну, устаў.

— Таварышы!—праз меру громка пачаў Пракоп. Таціна і Мікіта са зьдзіўленьнем і страхам падняліе на Пракопа вочы. Пракоп зрабіў невялічкі перапынак і сказаў яшчэ раз:

— Таварышы!.. Вось вы тут кажаце— колгас, абагульненьне жывёлы, каб, значыцца, нічыё,

колектыўна, ну, значыць, гуртам... леканструкцыя сельскай гаспадаркі...

— Рэконструкцыя!—паправіў бацьку Мікіта.

— Папраў казе хвост! Гіцаль ты! што ты не даеш мне слова сказаць?

— Што ты чаўпеш, Пракоп?—у тоне жончынага пытаньня чулася недаўменьне.

Пракоп зьбіўся з нагі, нос яго пачырванеў, і мысьлі вылецелі з галавы, як маладыя шпакі з дупла. Злосьць апанавала яго: правальваецца ён з прамоваю.

— Вы слухайце, пустыя вашы галовы! Гэта я вам кажу, як сказаў-бы я на сходзе! Павінен-жа я выказаць свае думкі, сваё арзуменьне, а ня кідацца з главою бухту, каб потым ня бегаць, як кот з падсмаленым хвастом. А вы мне рот затыкаеце... Калі вы ня хочаце слухаць мяне, дык я буду казаць гэтым глухім сьценам, няхай хоць яны паслухаюць мяне!—з горыччу выгукнуў Пракоп.

— Дурны ты чалавек, што ты забраў сабе ў галаву? Да ты-ж ня ведаеш, ці табе лепш аднаму на гаспадарцы, ці з людзьмі ў колгасе. Няўжо-ж гэта людзі ўсе дурныя, а ты адзін разумны? Проста глядзець на цябе моташна. Немаведама чаго згрызаецца чалавек. Жывуць-жа людзі ў

колгасе. І работаю так ня душацца, і жывуць лепей. Ня ты-ж, калі на тое пашло, жыць там будзеш, а дзеці твае. Пражылі мы ўжо, можна сказаць, свой век. Няхай дзеці жывуць. Не станавіся ты ім упоперак дарогі. Ці ліха сабе нажыць хочаш? Каго ты слухаеш?

— Клясавых ворагаў,—заўважыў Мікіта:— проста ня хоча паварушыць мазгамі, упёрся і ўсё. Тут робіш тысячы работ, а там будзеш рабіць адну. Тут дрыжыш ты за свайго каня, каб яго ня ўкралі ў цябе, а там хто будзе красьці? На чорта ён патрэбен каму? Кожны стане на сваю работу і будзе ведаць адну справу, а не разрывацца, як тут, на кавалкі. Зямля дасьць больш даходу—будуць абрабляць яе машынамі, падвязуць мінэральных гнаёў... Да што тут казаць? Сьляпому толькі ня відаць гэтага.

Мікіта трохі сароміўся, і прамова яго была ня зусім гладкая, але ён гаварыў шчыра, з пранканальнем.

Пракоп адчуў сябе пабітым і адзінокім. Унурыўся і маўчаў. У хаце зноў стала ціха. Свая-ж хата пазірала на Пракопа няветліва і негасьціна, як-бы ён тут быў чужы і лішні. А можа і праўда ён тут чужы і непатрэбны?

Гутарка змоўкла.

Ды й аб чым гаварыць?

Пракоп моцна задумаўся.

— Папал днуйце,—парушыла цішыню Таццяна і стала засцілаць настольнік.

Пракоп падняўся і, нічога не сказаў, выйшаў з хаты.

V

Затонская школа набіта бітком. Кажухі, сярмягі, шапкі і хусткі розпай формы і колеру стракацяць у вачох. Барадатыя і безбародыя, маладыя і старыя сядзяць і стаяць, дзе толькі можна, плячо ў плячо. Шуміць, гудзе сход, як разводзьдзе вясною. Настрой узьняты; сёньня на гэтым сходзе павінна так ці іначай скончыцца справа аб колгасе.

Старшыня сельсавету Мікалай Тур з суседняй вёскі Крутагор'е заметна хвалюецца. Па правую руку ад яго стаіць, разлажыўшы паперы, сакратар Міхайлік, наставіўшы буфером чуб, што прыдае сакратару значную долю заліхвацкасьці. Побач з ім шырокаплечы, худашчавы і жылісты, нібы зьбіты з чыгуна, Мірон, Брыль, брыгадзір, рабочы з заводу. Шырокі твар яго спакойны, а погляд сьмелы, упэўнены. З другога боку яшчэ два чалавекі: худы, бледны настаўнік

тутэйшай школы і пісьменьнік Базыль Базылец. Гэта высокі, жывы, рухавы чалавек, гадоў пад трыццаць, у чорным кажусе з вялізным каўняром. Быстрыя шэрыя вочы то бегаюць па натоўпу, то па тварах членаў прэзыдыуму. Перад ім на стале запісная кніжка, куды ён не-не ды нешта запіша. Гэтая кніжка і запісы ў яе робіць відавочнае ўражаньне на сход. Там нават перакідаюцца заўвагамі на гэты шчот, але, на шчасьце, Базыль Базылец іх ня чуе.

Пара-б ужо і сход пачынаць, але, там, за сталом, ня надта сьпяшаюцца: ў іх ужо ёсьць сходаўская практыка—чым больш нагаворацца, нашумяцца да сходу, тым гладзей праходзіць сход. І тут таксама ўжыта тактыка старога Гіндэнбурга аб крэпасьці нэрваў.

Сход пачынае выказваць нецярплівасьць—абрыдала ўжо так сядзець.

— Сход пачынаць!—заглушаючы шум грамады, чуецца, голас з цёмнага кутка.

— Пачынаць! пачынаць! — далучаюцца галасы.

Старшыня нахіляецца да Мірона Брыля, штось гаворыць, відаць, аб адчыненьні сходу. Брыль моўчкі ківае галавою, як-бы ўсё роўна яму, цяпер ці яшчэ пачакаць. Не сьпяшаючыся,

падымаецца старшыня, перабірае паперачкі, зьбіраецца з думкамі, а потым звоніць. З пярэдніх радоў шум заціхае, і хваля гэтага заціханьня паволі праходзіць па ўсёй школе і нарэшце зусім глухне на задніх партах.

— Абвяшчаю сход адкрытым!

Абіраецца прэзыдыум, запрашаецца туды некалькі асоб.

— Таварышы.—пачынае старшыня. Пракоп стаіць каля печы. Сэрца яго застукала мацней як і ў ва ўсіх членаў сходу. «Пет.», і я магу сказаць, але што скажаш ты далей?» думае сам сабе Пракоп.

— У нас сёньня на павестцы стаіць пытаньне аб колектывізацыі і бягучыя справы. Другіх пытаньняў ня будзе?

— Хоціць і гэта! гудзе сход.

— Ужо пяць сходаў утапілі ў гэтай колектывізацыі,—чуецца сярдзіты голас.

— А табе што—часу няма?—Хтось спакойна падае рэпліку з месца.

— Таварышы!—голас старшыні робіцца строгім:—давайце прыступім да справы і прашу спыніць гармідар—так мы ні да чога не дагаворымся. А дагаварыцца і вырашыць пытаньне мы павінны. Вось тут хтось сказаў, што ўжо

змарнована пяць сходаў. А хто ў гэтым вінаваты?.. Таварышы! Колектывізацыя сельскай гаспадаркі—наша чарговая, баявая задача, і мы павінны выканаць яе на сто процантаў.

— У некаторых мясцох яна зроблена на сто шэсьць, як пісалася ў газэтах,—з цёмнага кутка даносіцца нейчы насьмешлівы голас.

— Чулі мы ўжо гэтыя вашы песьні! Даколгасімся да таго, што і шалудзівай авечкі не застанецца—вырываецца прарэзьлівы жаночы голас.

— Да сьціхнеце вы там!—прыміць з другой групы сходу:—што не даеце слова сказаць?

Падымаецца шум. Старшыня звоніць з усяе сілы. Парадак наладжваецца. Узрушаны і выведзены з роўнавагі старшыня грозна ўсчуньвае крыкуноў.

— Таварышы! ці мы сабраліся тут справу рабіць, ці кулацкіх падпявалаў слухаць? Іншыя моры прыму проці тых, хто зрывае работу сходу!

— Правільна! — гудуць галасы з другога канца. У гэтым гармідары старшыня, відаць забыўся, што меўся яшчэ сказаць. Ён пацёр лоб і потым сказаў:

— Слова даецца таварышу Брылю, рабочаму з заводу. Тав. Брыль, тваё слова!

Шырокі і зьвязісты Брыль падымаецца і ўдаравеннымі мазолістымі кулакамі, парадкам прапрацаваўшымі каля станка, упіраецца ў стол. Ён весела акідае вачамі шэрую сялянскую масу.

— Таварышы!—пачынае ён. Голас яго чысты, звонкі.

— Я думаю, т. сяляне, што нашаму старшыні ня прыдзецца зварачацца тут да строгіх мер: мы—людзі свае, а чужынцаў мы лёгка пазнаём. Дык давайце пагамонім папростаму, як гаворыцца на чыстую.

Брыль робіць кароткі перапынак. І яго магутная постаць, і голас,і нейкая прастата і шчырасьці у яго словах робяць на сялян добрае ўражаньне.

— Ня лішнім тут будзе запытацца, таварышы,—паніжаным прыяцельскім голасам гаворыць далей Брыль:—у чым сіла і моц нашай пролетарскай дзяржавы?

Як напрактыкованы настаўнік, ён робіць ізноў кароткі перапынак, як-бы даючы сходу падумаць.

«Куды-ж гэта ён гне?» думае сход, а Брыль зараз-жа адказвае сам:

— Будзе правільны адказ, калі я скажу: сіла і моц нашай дзяржавы трымаецца на саюзе ра-

бочас клясы з працоўнай сялянскай, батрацкай і серадняцкай масай. Гэты саюз даў перамогу Кастрычніцкай рэволюцыі. Ён вызваліў нас ад памешчыцкага гнёту, выпраг з ярма капіталізму. Ён-жа абараніў нас ад навалы белых армій і іх саюзнікаў, замежнай буржуазіі, што ў сьмертнай хватцы прабавала задушыць нас, каб ізноў вярнуць панаваньне памешчыку і капіталісту. Нарэшце, гэты саюз зрабіў нас гаспадарамі на зямлі і на фабрыцы і будаўнікамі свайго ўласнага жыцьця на аснове соцыялізму. І калі, таварышы, я чуў тут злосныя выкрыкі, недавер'е, то гэтыя выкрыкі можна расцэньваць толькі як голас або сьвядомага ворага, які імкнецца рашчапіць нас саюз з працоўным сялянствам, або проста як голас неразуменьня і політычнай несьвядомасьці.

— Правільна!—пацьвярджаюць галасы, з пярэдніх радоў. Сход слухае ўважна. Настрой яго мяняецца.

— Цяпер я пераходжу да асноўнага нашага пытаньня, да перабудовы нашай сельскай гаспадаркі на аснове колектывізацыі. Гэтая перабудова, таварышы, так вялікa і настолькі нова, што сьвет бачыць яе ўпяршыню. Дык ня дзіва, таварышы, што вы падыходзіце да яе з нека-

торым страхам і сумненьнем. Але давайце разьбярэмся, дойдзем да канца, каб прыняць правільнае рашэньне. Прыпусьцім таварышы, што каму-небудзь з вас прыходзіцца перарабляць той ці іншы свой будынак. Вось ён пачынае аглядаць яго, што падправіць і як. І аказваецца: страха сапрэла, латы спарахнелі, сьцены пакрывіліся, бярвені згнілі, падмуроўка збуцьвела. Што-ж ён тады будзе рабіць?— Прыклад, прыведзены Брылём, спадабаўся. Яму заплясkалі, а з пярэдніх радоў гукнулі гусьцей:

— Ламаць гнілы будынак і будаваць новы, крэпкі!

— Правільна, таварышы! У пляне савецкага будаўніцтва, калі на нашых вачох гіблыя балоты абарачаюцца ва ўраджайныя землі, калі краіна пакрываецца сецьцю электрастанцый і вынікаюць волаты-заводы, фабрыкі і цэлыя гарады, ваш будынак, ваша форма дробнай сельскай гаспадаркі ёсьць гніль! Вашы гаспадаркі раскіданы, адгароджаны межамі, а на гэтых межах і ў гэтых межах разам з палыном і быльніком будзе расьці і гадаваццца і тое дзікае зельле, што ўжо ў сілу свае прыроды імкнецца разарваць наш саюз—будзе расьці кулак. Ваша

гаспадарка, таварышы, у яе цяперашняй форме, адна недарэчнасьць. Вы працуеце многа, а зьбіраеце мала. Жывяце ў душных і цесных хатах разам з жывёламі, у гразі, у брудзе, але вы ня бачыце гэтага бруду—вы аблужаны павуцьцём старасьветчыны і знаходзіцеся ў яе палоне. Наша задача, таварышы, задача партыі і савецкай улады—захаваць сілу чалавека, зрабіць палёгку ў яго рабоце, вызваліць яго з-пад улады зямлі, што так скупа аплачвае яго працу наша задача—павялічыць яго прадукцыю, даўшы яму машыны. А гэтага можам дабіцца толькі тады, калі мы дашчэнту зломім тнілы будынак цяперашняй гаспадаркі, а на яго месьце паставім новы на падмурку колектыву свабодных людзей.

Таварыш Брыль быў ня кепскі прамоўца. Ён вельмі прыгожа і трапна даў малюнак жыцьця ў колектыве, не заплюшчваючы вачэй і на тыя труднасьці, што няўнікнёна павінны быць на першых часах. І калі ён скончыў прамову, то яму дружна і доўга пляскалі. Нягоршым прамоўцам аказаўся і пісьменьнік Базыль Базылец. Як пісьменьнік, ён галоўным чынам спыніўся на культурным баку і пераважна апэляваў да жанчын, да іх гаротнай долі ў старой гаспадарцы. А калі ён спыніўся на дзецях, аб якіх мала

дбаюць бацькі, і ў імя дзяцей заклікаў бацькоў у колгас, то некаторыя больш мяккія натуры пусьцілі сьлязу.

VI

Мікіта седзячы ў першых радох і слухаючы прамовы, увесь гарэў. Мацней і шчырэй за ўсіх пляскаў ён прамоўцам, і радасьць яго ўсё ўзрастала, у меру таго, як раставаў лёд недавер'я ў сялянскіх сэрцах пад іскрамі гарачых слоў прамоўцаў. Павесялеў і прэзыдыум: перамога выяўна хілілася ў яго бок.

Зусім іначай адчуваў сябе Пракоп. Перад сходам ён цешыў сябе надзеяй, што і сёнешні сход скончыцца так-жа, як скончваліся і ранейшыя сходы: пагаворацъ, пакрычацъ, можа хто і запішацца, а ў агуле справа наперад не пасунецца. Але калі з прамоваю выступіў гэты рабочы і захапіў сялян прастатою свае гутаркі і шчырасьцю веры ў пераможнасьць новых форм жыцьця, то Пракопава надзея пагасла, і ён ціха сказаў свайму суседу, таўкануўшы яго локцем:

— Пазапісваюцца ўсе!

— Пазапісваюцца!—пацьвердзіў сусед.

Пракоп слухае прамоўцу, а думкі яго ўжо пачынюць вярцецца каля колгасу. Ён бачыць шырокае поле, нідзе ні межачкі, і яго палоска, што пад восень так добра даў гною, зьлілася, захлынулася ў суцэльнай заворанай лаве зямлі. Ён бараную паркаю колгасную зямлю, а за ім таксама за бараною ідзе Марыніч. Марыніч — хітры, гультаяваты чалавек, толькі від паказвае, што робіць, а сам пасьмейваецца з Пракопа.

— Глядзі, Пракоп, як Міхалка сьцябае твайго каня! Што значыць не свая ўласная скаціна!

Пракоп забірае злосьць на Марыніча: сам папрагульваў усё сваё дабро ды яшчэ насьміхаецца, што ён, Пракоп, захаваў сваю маемасьць і ў колгас прыйшоў, як маладая з заможнага дому ў сям'ю свайго мужа. Пракоп успамінае, што ён яшчэ не ў колгасе, шукае вачамі Марыніча. А Марыніч сядзіць сябе з выглядам нявінната дзіцяці ды слухае. Пракоп упэўнены, што ён адзін з першых папрэцца ў колгас, і вялікая няпрыязьнь да яго шавеліцца ў Пракопавым сэрцы.

Мікіта часта назад аглядаецца—хочацца ведаць, як успрымае бацька словы гэтага слаўнага Брыля. Брыль у яго вачох робіцца героем. Але нічога ня можа разгледзець Мікіта на бацька-

вым тварыс: Пракоп сядзіць ззаду каля сьцяны, і твар яго відаць цьмяна.

Кончыліся прамовы. Старшыня зварачаецца да сходу, якія ў каго ёсьць запытаньні.

— Запытаньняў няма?

— Няма.

— Хто хоча выказацца?

Сход маўчыць, а потым чуецца адзін голас, другі, а за ім хор галасоў гудзе:

— Чаго там выказвацца? Запісацца і ўсё!

— Давайце запісацца,—гаворыць старшыня;—але можа запішам пастанову?

— Гэта і будзе пастанова калі пазапісваемся.

— Ну, хто першы?

Замінка. Ніхто не адважваецца выступаць першым. Падштурхоўваюць адзін аднаго, патроху жартуюць, пасьмейваюцца. Нарэшце выпхнулі Амяльляна Нічыпарука, мотывуючы гэта тым, што Амяльлянава рука лёгкая. Амяльян набіраецца сьмеласьці, падыходзіць да стала і жорсткімі заскарузлымі пальцамі выводзіць сваё прозьвішча.

— Ну, колгас, дык колгас!—кажа расьпісаўшыся. За ім сьмялей і дружней валіць народ. Каля стала робіцца чарга. І Марыніч у першых

радох. Парог, што стаяў між сходам і колгасам, пяройдзены, людзі апынуліся на другі бок мяжы.

Мікіта з трывогаю назірае за бацькам. Пракоп падаецца наперад, запыняецца. Углядаецца ў папярэднія гады, у чаргу каля стала. Бачыць Марыніча. Пракоп хмурыцца, топчацца на месцы і незаметна падаецца ў дзьверы. Яшчэ з большаю трывогаю глядзіць Мікіта на дзьверы, што зачынілі бацьку на той бок сходу. Няма, не варочаецца бацька. Мікіта таксама падаецца да дзьвярэй—дагнаць, вярнуць бацьку назад!

Ужо трэція пеўні прасыпявалі на вёсцы. І які дзіўны, які далёкі і глухі голас іх! Гэта вясковыя гудкі і сырэны, што з глыбіні вякоў данеслі свой голас аж да гэтага часу і першабытнаю мераю мераюць вясковым людзям час і вяшчаюць аб зьменах пагоды. Пашумлівае вецер у голым вецьці бярозы, у вокны пазірае бясконцая зімняя ноч, а там, за вёскаю, ляжаць бяскрайныя, амярцьвелыя прасторы. Пракоп бачыць іх у сваіх мысьлях, лежачы на палку каля печы. Дакучлівыя, невясёлыя думкі, таўкуцца ў яго галаве, і на сэрцы цяжка. Ад гэтага ніяк ня можа за-

снуць Пракоп. Перабірае ў памяці падзеі сённяшняга дня і вечара. І які гэта доўгі, бясконца доўгі дзень!

Прыпамінае раніцу, спатканьне і гутарку з Чыкілевічам. Чыкілевіч можа і рад быў-бы пайсьці ў колгас, ды яго ня прымуць, бо ён пазбаўлены голасу. Можа і вышлюць яго. А што зробяць з ім, з Пракопам? Нешта гэты рабочы як-бы ківаў на сваёй прамове. Пракоп у непакоі варушыцца пад дзяругаю. Мысьлі яго ідуць на другое. Яму прыпамінаюцца і жаночыя словы—ці ты ліха сабе шукаеш?—І праўда: ці ня шукае ён сабе ліха? Пракоп ціха ўздыхае. Адвечны круг сялянскага жыцьця яму робіцца цесным. Падымаецца, садзіцца, зьвешвае ногі і думае. Яму штось трэба зрабіць, але што? Ня ведае. Трэба знайсьці нейкі выхад, на нешта адважыцца. У ваччу ўстае Мікіта. Як прасіў, як маліў, як дакараў бацьку, каб вярнуўся на сход! Але ён не вярнуўся, а хлопец плакаў ад крыўды.

Пракоп падымае галаву, пазірае праз цемень на тапчан, дзе сьпіць Мікіта. Мікіта сьпіць роўна і спакойна—што значыць моладасьць: яе не бяруць так згрызоты, як забіраюць яны яго, старога. На патускнелыя ад гадоў і працы вочы

набягаюць сьлёзы. Пракоп адчувае сябе адзіно-кім, яго штось есьць, грызе. І ён тут чужы для ўсіх, лішні. Адшчапіўся ад грамады, ад сям'і, як лень тырчыць на іх дарозе.

Перад яго вачамі ўстаюць белыя прасторы за вёскай, халодныя, неласкавыя, і дарожка на пагорку з рудымі плямамі аб чымсі напамінае яму.

Ён рашуча падымаецца з пасьцелі, запальвае газоўку. Абуваецца. Накручвае на ногі суконкі, надзяе лепшыя боты. Адбірае адзежу, як-бы ён зьбіраецца ў госьці. Прачынаецца жонка, палохаецца, моўчкі глядзіць на Пракопа.

— Куды гэта строішся?—у жончыным голасе чутна трывога.

— Пайду ў сваю дарогу: нашы дарогі разыходзяцца.

— Пракоп! да адумайся ты! Што ты забраў сабе ў голаву?—лемантуе Таццяна:—ох, божачкі!

— Глухім стаўся бог для нас, і няма чаго ўспамінаць яго,—строга заўважае Пракоп.

— Тата! што з табою робіцца? Куды зьбіраешся?

Пракоп маўчыць. Адзяе кароткі кажушок, а наверх нацягвае дойгі, новы з шырокім каўня-

ром. Становіцца перад абразамі, стаіць колькі хвілін, а потым насоўвае на вушы шапку, бярэ торбу з хлебам і палку.

Таццяна і Мікіта слупянеюць, а потым старая зрываецца з пасьцелі, хапае Пракопа за руку. Пракоп адпіхае яе, вырывае руку. На дапамогу ёй бяжыць Мікіта. Пракоп замахваецца на іх палкаю.

— Прэч!—Строга крычыць ён, а потым больш лягодным тонам гаворыць:

— Не замінайце мне, як не хачу замінаць і я вам. Цяпер ідзеце ў колгас: ня буду стаяць вам упоперак дарогі. А я цяпер—бабыль і вольны чалавек. Аставайцеся здаровы, жывеце шчасьліва.

І павярнуўся к парогу.

Жонка і сын кідаюцца зноў запыніць яго, але ён трасе на іх кіем і адганяе ад сябе.

— Ня ўводзьце мяне ў злосьць!

Скрыпнулі дзьверы, адны і другія, разоў пару хрыбуснуў сьнег, і стала ціха.

Цёмная ноч ахапіла Пракопа з усіх бакоў, і прыпнутая постаць яго зараз-жа зьнікла ў цемрадзі, не даходзячы да алешніка, дзе праходзіць дарога.

VII

Добрыя вярсты тры прайшоў Пракоп, калі ў полі пачало сьвятлець, займацца на сьвет. Парадзеў, рассунуўся цяжкі і сьляпы змрок, выпускаючы з свае няволі тонкія празрыстыя абрысы зімняга пэйзажу, журботнага ў сваёй застылай панылаасьці.

Ніякай акрэсьленай мэты ў Пракопа ня было, калі ён наважыўся на гэтае самавыгнаньне. Ён проста выказаў свой протэст, абурэньне і крыўду ў форме гэтых старых традыцыйных прочак. Але чым далей адыходзіў ён ад свайго котлішча, тым з большаю сілаю ахаплялі і наступалі на яго гэтыя чужыя, халодныя прасторы, сярод якіх вастрэй адчувалася адзінота і сіроцтва на сьвеце, і тым ярчэй уставала ў вачох яго хата, гаспадарка, сваякі і суседзі і ўсё, з чым ён зжыўся за доўгія гады сялянскай працы.

Жаласьць да самога сябе агарнула Пракопа. Хто ён цяпер? брадзяга, жабрак, бяздомнік! Але разам з гэтым была і нейкая асалода ў той жаласьці і пакуце і ў гэтым бадзяньні яго, няясным, як і гэты змрок. Праўда, яго ніхто не выганяў, ён сам захацеў так, гэта яго добрая воля. У яго ўласнай волі вярнуцца назад. Пра-

коп прыпыніўся, азірнуўся. Некалькі агоньчыкаў блішчэлі сям-там у парадзелым ранічным змроку... было кароткае змаганьне з самым сабою... Не: назад ён ня вернецца—не скарыцца перад чужою воляю! І ён моцна пратрубіў носам апошняе разьвітаньне з тым, што засталося там, і цьвёрда заківаўся далей. У яго ёсьць яшчэ сіла, ёсьць прывыкшыя, прызвычаеныя да работы рукі. З імі ён не прападзе. З гэтымі думкамі ішоў ён наперад.

Быў у Затоньні Пракоп, цяпер яго там няма. Затонская грамадзкасьць яшчэ і ня ведала аб гэтым: час быў дужа раньні, а пасьля такога важнага сходу спаць пакладліся позна. Толькі ў Пракопавай хаце сьвяціўся агонь. Таціяна і Мікіта адчувалі крыху сваю віну перад Пракопам, і ня так было-б ім цяжка, калі-б ён проста памёр, як належыць кожнаму чалавеку. А то жывы, і няма яго. Кінуў дом і пашоў, куды невядома. Вернецца ён ці не, ці наложыць на сябе рукі,— нічога невядома. Вось гэтая невядомасьць і прыгнятала іх больш за ўсё.

— Што-ж рабіць? — поўная бездапаможнасьць чулася ў Таціяніным голасе.

Мікіта панура маўчаў, адчуваючы, што на ім цяпер ляжыць адказнасьць, бо ён адзін мужчы-

на ў хаце, ён галава. А ў гэтай галаве і ў маладым сэрцы мітусіўся заблітаны клубок мысьляў і пачуццяў. З іх перапляценьня выразьней вылучаліся дзьве процілеглыя плыні: жаласьць да бацькі і абурэньне супроць яго тупой несьвядомасьці.

Накінуўшы на плечы кажушок, Таццяна ў непакоі вышла на двор. Панурыя сьцены нізкіх будынкаў, белая зямля, нахмуранае цёмнае неба і халодны змрок між імі таілі ў сабе няветлую цішыню і маўклівасьць. З усходу падыхаў востры, калючы вецярок, шурхаючы па страсе сухім сьнегам, а з-пад балотца даносіўся няроўны перарывісты шум аголеных кустоў. Таццяна прыслухоўваецца да гэтых шолахаў і таемных шумаў ночы і ўглядаецца ў няясныя і зманлівыя контуры цёмных сілуэтаў, прыймаючы іх часам за Пракопа.

І раптам яна ўся здрыганулася: каля прыгрэбніку пад чэзлаю вішняю стаіць і нехта памахвае рукою, як быццам-бы падзывае да сябе Таццяну.

— Хто там?—аклікае перапалоханая Таццяна.

Чалавек маўчыць, але рукою махаць не перастае. Яшчэ большы страх забірае Таццяну. Яна баязьліва азіраецца, як-бы мяркуючы, ці па-

сьпее ў часе ўцячы ў хату ў выпадку, калі гэты невядомы чалавек—а можа і Пракоп—раптам рынецца на яе. Яна ўжо хацела пазваць Мікіту, але голас яе сарваўся, а ў гэты момант з-за вугла рвануўся вецер, і рука страшнага чалавека адарвалася ад яго і сама некалькі разоў закруцілася ў паветры.

— Тфу, прападзі ты!—мімавольна вырвалася ў Таццяны, і страх яе расьсеяўся, але рукі і ногі яе моцна дрыжалі.

Страшны чалавек аказаўся даволі ёмкаю плашкаю, прыслоненаю да страхі, а яго рука—кусок рызмана, што нейкім спосабам зачапіўся за вішнёвую галінку, і матляўся на ветры.

Перад Мікітавымі вачамі ўвесь час стаяў бацька ў розных постацях і момантах яшчэ так сьвежага часу. Адзін момант і адна постаць асабліва воста ўрэзаліся ў памяць: адзеты, гатовы ў дарогу, з кіем у руцэ, бяз шапкі стаіць бацька тварам да абразоў. Мікіта сам падымае на іх вочы. Цэлы рад абразоў, крыху нахіленых. У цэнтры, скрозь слаба асьветлены змрок, выглядае Мікалай Мірлікійскі. Пранізьлівыя вочы пазіраюць упарта, куды-б ты ні павярнуўся. Рука паднята, і пальцы зложаны для благаславеньня. З нянавісьцю і з адчаеньнем нейка-

га страху глядзіць на яго Мікіта. Яму робіцца крыўдна за бацьку, за яго пашану і веру ў гэтых ідалаў.

— Сукін ты сын!—ціха, але сярдзіта і выразна гаворыць Мікта на сьв. Мікалая. Трошачкі счакаўшы дадае:

— Кулацкі рупар і падпявала!.

У парыве злосьці зрываецца і рашуча накіроўваецца да сьвятых.

— Зьліквідаваць, як прадстаўнікоў кулацкае клясы.

У хату ўваходзіць Таціяна. Мікіта запыняецца ў сваім парыве і свой цьвёрды намер распрявіцца з багамі адкладае на болей зручны час.

— Што-ж будзеш рабіць, сынок?

— Як разьвіднеецца, пайду ў сельсавет. Заявіць трэба. А там відаць будзе. Выясьніцца.

Малады, а ўсё-ж такі разважае па-мужчынску,—сама сабе думае Таціяна і плача.

VIII

Новае жыцьцё пачынаў Пракоп, пачынаў бадзяньнем і надзеяй на свае прывыкшыя да работы рукі.

І ня мала прабадзяўся ён па сьвеце, і ня надта соладка было яму гэтае бадзяньне. Але затое-ж Пракоп набыў пэўную жыцьцёвую практыку. Яго заскарузлы сялянскі розум змушан быў паварушыцца і пакіраваць мысьлі крыху ў іншы бок, каб лаўчэй прыстасавацца да гэтага вандроўніцкага жыцьця і ня згінуць. Яго не пакідала думка знайсьці сабе прыпынак на сьвеце, а на сваё вандроўніцтва ён глядзеў, як на часовую зьяву. Але хоць сьвет і прасторны, ды чалавеку, сарваўшамуся з наседжанага месца, прастор гэты мала чаго дае. І калі Пракоп і ня згортваў сваіх крыльляў, то толькі таму, што на такое бадзяньне ён наважыўся сам і зрабіў так, як знаходзіў лепш.

Шмат вёсак і гаспадароў абышоў Пракоп; але прыпынку ўсё не знаходзілася. Прыходзілася паспрабаваць і жабрацкага і батрацкага хлеба. Ды ня вельмі смачны такі хлеб, і ня так ужо лёгка і ён даецца. Гэта вандроўніцтва і шуканьне прыпынку паказала Пракопу, якое вялікае значэньне для чалавека ў жыцьці мае рамяство. Калі-б ён быў шаўцом або краўцом, сталяром ці сьлёсарам, то і гора ня ведаў-бы. Але гэта ўсьведамленьне важнасьці ў жыцьці рамяства карысьці Пракопу не давала, а пры цяперашнім

стане рэчаў попыту на Пракопавы «прывыкшыя да работы рукі» сярод сялян амаль што ня было. Асабліва трудна было яму ў першыя дні, калі ён яшчэ не асвойтаўся з сваёю новаю роляю вандроўніка. Перад ім паўстаў цэлы рад новых пытаньняў, і трэба было знайсьці на іх ясныя адказы. Сялянскім нутром ён адчуваў сваё ваганьне па нейкіх крыжовых дарогах. Уся яго бяда была ў тым, што ён меркаваў замацавацца ў жыцьці на сваіх старых поглядах і на старым грунце. Тым-жа часам гэты стары грунт правальваўся пад яго нагамі. Гэта было ясна Пракопу. З кожным днём пераконваўся ён у тым, што патрэбна нейкая зьмена яго курсу. І сапраўды: хто з сялян возьме яго цяпер на работу? Навошта людзям гэты клопат, каб потым яшчэ папасьціся ў бяду? І што-ж выходзіць? Пракоп, трэба прызнацца, зьбег ад колгасу, але ўсюды куды ён ні пойдзе, колгасу ня ўнікнеш: грыміць і грыміць аб ім гутарка. Ліквідацыя дробных гаспадарак ідзе поўным ходам. Як ні круці, як ні мяркуй, а парасткі новага жыцьця прабіваюцца буйна, густа, сакавіта.

Вандруючы ад сяла да сяла, Пракоп гэта бачыў, а свае пераходы скарачаў думкамі аб тым, што-ж рабіць яму? Праўда, людзі давалі яму

часовы прыпынак, прымалі, кармілі. Былі нават і такія, што і спачувалі яму. Але-ж век так жыць ня будзеш. Тулячыся, начуючы, дзе-небудзь у кутку на саломе ці на гарошынах, гасьцінна прынесеных гаспадаром, Пракоп цэлымі гадзінамі ня спаў і разважаў, прапускаючы праз нажы самакрытыкі свае паводзіны, няяснасьць і няпэўнасьць свайго соцыяльнага стану. А да гэтага далучаліся і думкі аб пакінутай гаспадарцы, аб сям'і і доме. Шкода было старога котлішча і цесных закуткаў уласнага дворыка, дзе Пракоп так многа пакінуў свае працы, свайго жыцьця. Варочаўся Пракоп у сваім логаве сярод цемры сялянскай хаты і мернага пахрапваньня чужых людзей. Ноч, цемра, глухмень. Чуваць, як дзесь каля печы шалпочуцца ў шчылінах прусакі. Мерна і аднатонна падаюць каплі вады з акна і гулка шлёпаюцца аб сырую зямлю, бясплатная музыка на сон гаспадаром хаты. А Пракопавы думкі ідуць ды ідуць, нанізваючыся адна на другую, покі, нарэшце, незаметна для Пракопа адна з іх не запыніла на сябе яго ўвагі на адным з такіх яго начлегаў.

І сапраўды, гэта ня кепская думка? Пракоп прыціснана турбіць носам і пачынае разьвіваць яе далей.

Як запраўскі філёзаф, мяняючы сваю ранейшую сыстэму сьветапогляду, прапускае яе праз сіта строгаў крытыкі, так і Пракоп, лежачы на саломе, пачынае асуджаць цяпер мэтоды свайго вандроўніцтва. Усе гэтыя мэтоды няправільныя! Па-першае, ён часта заходзіў на хутары і наогул трымаўся больш тых элемэнтаў, што варожа настроены да колектывізацыі. Не гаворачы ўжо аб тым, што такія паводзіны яго небясьпечны, яны не даюць ніякіх вынікаў. Другая Пракопава памылка была ў тым, што ён шукаў сабе работы ў дробных гаспадарках, як-бы на сьвеце няма саўгасаў і колгасаў. І трэцяя, можна сказаць самая прыкрая яго памылка заключалася ў тым, што ён, проста сказаць, жабруе. Навошта-ж яму усе гэтыя прыкрасьці, калі можа ўзяць на сябе ролю дэлегата? Вось гэтая шчасьлівая думка, што запыніла на сябе Пракопаву увагу. Але як да яе прыступіцца? А вось як: Пракоп дужа зацікаўлен колектывізацыяй, як і ўся тая грамада, адкуль родам сам Пракоп. Але ў іх ёсьць некаторыя няпэўнасьці, няясьнасьці ў сувязі з пераходам у колгас. Ды вось Пракопу і даручана абрэвізаваць ўжо наладжаныя колгасы, азнаёміцца, прыглядзецца да іх, каб потым зрабіць належны даклад сваёй гра-

мадзе... Ну, чым-жа гэта кепска думка. Пракоп цалкам захапляецца ёю. Яна суліць яму прыбыльны выгад. Як дэлегата, яго будуць шанаваць, карміць, і жабрацтва яго адпадзе само сабою. На правах дэлегата ён можа прабыць у колгасе тыдзень, а можа і болей, гледзячы, як прымуць. А прыняць яго павінны добра. Пабудзе некаторы час і падасца ў другі, у трэці. А можа і сапраўды надарыцца яму дзе што добрае. Ня трэба толькі спаць у шапку, трэба адпаведны спрыт і рухавасьць. І калі на справу паглядзець справядліва, то тут і машэнства няма ніякага. Бо сапраўды-ж: ці ня мог-жа ён зусім шчыра азнаёміцца з колгаснаю справаю?

Захоплены гэтаю новаю ідэяю, Пракоп доўга ня можа заснуць. Грамчэй і весялей трубіць ён носам, больш лагодна прыслухоўваецца да шапатаньня прусакоў у шчылінах, да шлёпаньня капель з акна і ставіць гэта ў сувязь з адлігаю, што таксама яму на руку. Без вялікай злосьці чухае валасатую грудзіну, намацвае там нейкага інтэрвэнта і душыць яго заскарузлым пальцам.

А назаўтра раненька накіроўваецца на новую дарогу, а ў дарозе абмяркоўвае сваю дэлегацкую ролю.

IX

Колгас «Хваля рэволюцыі» заснаваўся ня так даўно. Гады тры таму назад вярнуўся з Чырвонай арміі ў свае Клінкі Максім Шахлевіч.

Клінкі была даволі вялікая вёска, але к часу Максімавага звароту з Чырвонай арміі яна значна зьменшылася: больш заможныя гаспадаркі выбраліся на пасёлкі, на хутары. Хоць у Клінкох трохі і папрастарнела, але ўсё-ж рэшта гаспадарак, цягнучы старое ярэмца земляробскай акасьцянеласьці, жыла бедна. Пабітая на вузкія шнуркі, параскіданыя па розных мясьцінах і разгароджаная межамі зямля скупа аплачвала працу на ёй. І зямля была ня роўная: жоўты пясок, камяністыя ўзгоркі, сінялес, і толькі мясцамі траплялiся кавалкі добрай зямлі. Лепшыя землі захапілі пасёлкаўцы і хутаране, а яшчэ лепшая зямля была пад панскім маёнткам, дзе заснаваўся цяпер саўгас «Чырвоны Шлях».

Беднасьць і малазямельле змушала клінкоўцаў шукаць заработку на стране або каля дому, калі яны траплялiся. Адны ішлі на чыгунку—а яна праходзіла тут непадалёку—рамонтнымі рабочымі, другія складалі кадры батракоў і служачых у заможнікаў-кулакоў. Максім Шахлевіч

з пятнаццаці гадоў служыў у батраках і толькі за год да ваеннай службы кінуў сваё батрацтва і цэлае лета хадзіў з сястрою і старшым братам капаць торф на сваім-ж балоце, заарэндаваным адным коопэрацыйным таварыствам. Гаспадарка была ў іх невялікая, і з ёю спраўляўся бацька.

Максім быў самы вясёлы і самы рухавы ня толькі ў сям'і, але і ва ўсёй вёсцы хлопец. Ні беднасьць, ні служба ў чужых людзей, ні цяжкая праца ня зьнімалі яго добрага гумару. Любіў ён і пасьпяваць, і пасьмяяцца і прыправіць жартамі сваю бойкую гутарку. За вясёлы характар і працавітасьць яго любілі і шанавалі сярод клінкоўскай беднаты. Ён скончыў пачатковую школу. Вольнаю часінаю любіў пачытаць газэту і кнігу. Наведваў сходы, уважліва слухаў даклады, асабліва прыежджых таварышоў. На ваеннай службе паступіў у комсамол і палітычна значна разьвіўся. З Чырвонай арміі ён лёгка мог знайсьці сабе службу ў горадзе. Але ў яго былі іншыя думкі.

— Не,—казаў ён,—на службу не хачу: пайду дамоў рабіць рэволюцыю ў Клінкох.

У Максіма быў ужо зложан шырокі плян арганізацыі колгасу ў Клінкох. Вярнуўшыся з арміі, ён зараз-жа і прыступіў да работы. Сваю ра-

боту ён пачаў з організацыі комсамольскай ячэйкі. Нельга сказаць, каб гэта работа давалася яму лёгка. З першых-жа дзён Максіму прыйшлося ваяваць з сялянскаю консэрватыўнасьцю, з неорганізаванасьцю і анархічнасьцю клінкоўскіх хлапцоў. Але патроху, па-малу ён ўцягнуў у работу найбольш жывых і актыўных з моладзі і сярод яе пачаў пропагандаваць ідэю залажыць у клінкох колгас, не чакаючы покі гэту работу пачнуць рабіць за іх другія. Сваімі сіламі адчынілі хату-чытальню, пачалі праводзіць сходы, рабіць даклады, выпускаць насьценную газэту, дзе асьвятлялася іх сялянскае жыцьцё, асуджаўся стары быт, прымітыўныя спосабы гаспадаркі і рэзка ставілі пытаньне аб эксплёатацыі кулакамі клінкоўскай беднаты. Ва ўсёй гэтай справе насьценгазэта адыграла вялікую ролю. Заварушыліся пасёлкаўцы і кулакі на хутарох. Першая і значная прабоіна ў закасьцянеласьці сялянскага жыцьця была зроблена. Кляса вая сьвядомасьць клінкоўскай беднаты была абуджана. Яна цясьней гуртавалася навокал ідэі колектывізацыі і рашуча рыхтавалася ў паход супроць мясцовых павукоў. Калі такім парадкам была праведена папярэдняя работа, комсамольская ячэйка склікала агульны сход сялян. На

сходзе пастаўлена пытаньне аб організацыі ў Клінкох колектыўнай гаспадаркі. Сход быў шумны і бурны. Сярод клінкоўскай беднаты знайшліся праціўнікі колектывізацыі. Але ўсё-ж такі пераважная большасьць клінкоўцаў пастанавіла перайсьці ў колгас.

Узрушаны і радасны Максім Шахлевіч пры гэтым сказаў:

— Т.! Пачатак зроблены. Дазвольце запэўніць вас, таварышы, што наша справа колектыўнай гаспадаркі ёсьць справа жыцьцёвая, правільная, а таму ёй належыць будучыня... Далоў усякія хістаньні! Сьмялей наперад!

На гэтым-жа сходзе было абрана і праўленьне колгасу і месца, дзе павінен быць колгасны штаб. Як асаблівасьць гэтай пастановы, трэба адзначыць, што для «штабу» быў адведзены пустыр у полі збоку ад Клінкоў. На гэтым пустыры ў тую-ж восень перавезьлі будынкі шасьці гаспадарак. Замест шасьці клунь, шасьці хат і столькі-ж усялякіх іншых будынкаў пабудавалі адну прасторную клуню, накрылі яе новаю страхою, як залатым плашчом сьвежай аржаной саломы. Выштукавалі адну абору, дзе можна было зьмясьціць ня менш, як трыццаць кароў і гэтулькі-ж цялят. Паставілі зухаваты сьвіронак,

сьвінарнік і выстраілі тры дамы для шасьці сем'яў, адвёўшы месца для колгаснай конюшны і для дзіцячай пляцоўкі. І ўсё гэта было зроблена сваімі сіламі, сваімі майстрамі.

На пустым месцы, у полі вырас цэлы пасёлак, першая аснова новай, цікавай і не для ўсіх яшчэ яснай формы маладога жыцьця. Гэты пасёлак вырас па ініцыятыве Клінкоўскай беднаты і складаў іх сапраўдную гордасьць. Сюды, як да вогнішча ў халодную цёмную ноч, накіроўваліся думкі, імкненьні і надзеі новых колгасьнікаў. Сюды-ж падымаліся і поўныя нянавісьці вочы хутаран і пасёлкаўцаў.

— Т.! аснова колгасу паложана,—казаў на адчыненьні пасёлку Максім:—а цяпер прыступім да справы.

Новая вясна чакае нас. У нас ёсьць час, каб сустрэць яе ў поўнай зброі, па-бальшавіцку. Нашу поўную перамогу забясьпечыць нам грамадзкая сьвядомасьць, дысцыплінаванасьць і наша актыўная праца на фронце соцыялістычнай гаспадаркі.

Новы колгас назвалі «Хваля рэволюцыі».

Сюды, у гэты колгас, і дыбаў цяпер наш Пракоп Дубяга, неразумны вандроўнік, дэлегат-самазванец.

X

Нясьмела і няўпэўнена ўваходзіў Пракоп у новы колгасны пасёлак «Хваля рэволюцыі».

Даволі было кінуць гаспадарскім вокам на двор, на колгасныя будынкі, каб адчуць, што справа тут пастаўлена на цьвёрды грунт, што чыясь моцная і разумная воля пракладае шырокую дарогу ў новы гаспадарскі дабрабыт.

Першае, што кінулася Пракопу ў вочы, быў узорны парадак і чыстата, на дварэ і каля будынкаў. А гэтых будынкаў, дзеравяных і мураваных, малых і вялікіх, крытых саломаю, гонтамі і чарапіцаю, было тут многа. Спрактыкаванае вока староньняга гледача заўважала, як шпарка рос гэты колгасны пасёлак, удасканальваючыся ў сваім будаўніцтве, з якога дбаласьцю, стараннасьцю і прадуманасьцю абмяркоўвалася кожная будыніна, кожная драбніца ў ёй. А гэтыя новыя мураванкі, вырасшыя за апошні год, сьведчылі аб поступу наперад колгасьнікаў, аб іх замілаваньні да новых форм жыцьця. Сьнег у тую зіму быў глыбокі, і ўжо па адных толькі сьцежках, пракіданых у сьнезе па розных кірунках прасторнага двара, па шырокіх пляцоўках, прачышчаных каля клуні і іншых бу-

дынкаў, па высокіх і роўных валах сьнегу можна было судзіць аб гэтым парадку.

Ураджаны і зьдзіўлены Пракоп запыніўся, ступіўшы на тэрыторыю пасёлка, бегла акінуў поглядам колгасны двор і будынкі, як-бы разважаючы, куды накіравацца і да каго тут зьвярнуцца.

Яго старамодная сялянская постаць у саматужнай шапцы з аўчыны ў доўгім памятым кажусе, зьбітая на адзін бок пасівелая і занядбалая, барада, пануры, загрубелы абветраны твар і глыбока запаўшыя вочы, у якіх адбіваўся смутак і непакой бяздомнага бадзягі, ніяк не стасаваліся з агульным тонам гэтага пасёлку і яго гаспадарамі, сям-там мільгаўшымі па белым фоне ў глыбі двара і каля будынкаў.

Пракопава дэлегацкая роля крыху замітусілася, адчуўшы трывогу і страх, і ўсё ніжэй і ніжэй стала апускацца на дно. Так бывае з непапсованымі ці, справядлівей, з мала напрактыкаванымі ў дробным ашуканстве натурамі, калі яны прабуюць зьвязаць надуманы фальш з праўдаю жыцьця. Але адступаць ужо было позна, і Пракоп трапліва рушыў да першай чалавечай постаці, што найбліжэй трапілася яму ў гэты час. Маладая зграбная жанчына ў чырво-

ным кажушку, шчыльна і купежна атуляўшым яе стройную фігуру—відаць, спэцыяльна на яе пашыты кажушок,—вышла з дзьвярэй хаты і жвава падалася па сьцежцы ў бок новай будыніны.

— Пастойце!—махнуў Пракоп кіем.

Маладая жанчына спынілася, кінуўшы на Пракопа крыху зьдзіўленыя і трохі строгія шэрыя вочы. Можа-б яны былі ласкавейшыя, каб яе зачапіў не Пракоп, а хто-небудзь малады і прыгожы.

— Будзьце ласкавы, мілая, скажэце, хто тут у вас начальства і дзе яго знайсьці?—пачціва зьвярнуўся да яе Пракоп.

— Начальства ў нас няма. А калі хочаце пабачыць старшыню колгасу, то ён напэўна ў канторы,—адказала маладая жанчына. Але, відаць, і самой ёй паказаўся сухім яе адказ, і яна ўжо лагодней дадала:

— Кантора унь там, у мураванцы... Хадзеце за мною, пакажу,—ужо зусім мякка загаварыла маладая жанчына.

«Ці добра зрабіў, што адразу запытаў пра начальства?» Думаў Пракоп, ідучы за маладою жанчынаю: «трэба было-б трохі разглядзецца і не пароць так гарачкі». Ён адчуў, што яго меркаваньні і пляны адносна яго дэлегацкай ролі ад-

разу-ж разыходзяцца з практыкаю. Але многа разважаць аб этым ня прышлося: яны спынілі́ся каля дзьвярэй конторы.

— А па якой-жа вы справе?—пацікавілася на ўсякі выпадак маладая жанчына.

— Ды вось хачу паглядзець ваш колгас... Ад грамады я...

Гэты адказ зусім задаволіў маладую жанчыну, а Пракоп адчуў некаторую палёгку, і ён нават асьмеліўся запытаць:

— А хто такі сам старшыня калгасу?

— А ён мой муж, калі хочаце ведаць, Максім Шахлевіч,—горда адказала маладая жанчына.

— Муж ваш!—зьдзівіўся Пракоп, зірнуў на маладую жанчыну і з дасьціпнасьцю спрытнага кавалера заўважыў:

— То добрую жонку мае старшыня вашага колгасу!

Жанчына ўсьміхнулася, а Пракоп зазначыў сам сабе, што справы ён не папсаваў, а такая разьвязнасьць дэлегацтву ня шкодзіць.

Прасторная і сьветлая контора, куды ўвайшоў Пракоп, была галоўным дзелавым штабам колгасу. Яна ня зусім яшчэ была скончана, і пабеленыя мураваныя сьцены выступалі тысячамі

цагляных рэбер. На сьценах віселі розныя плякаты і лёзунгі адпаведна патрэбам часу. На адной сьцяне віселі портрэты Карла Маркса і Леніна, а насупроць іх зьмяшчаліся Сталін і Варашылаў, Чарвякоў і Галадзед. Каля сьцяны пры ўваходзе стаяла самадзельная дзеравянная канапка, невялічкі кніжны шафік для конторскіх кніг і папак, дзе хавалася розная перапіска і запісы. Два сталы, пісьменны і звычайны, таксама самадзельнай работы колгасьніцкіх майстраў, ды некалькі крэсел і складалі ўсю мэблю і абстаноўку конторы. Сама-ж контора зьяўлялася часьцю мураванага сьвірна з прасторным ацамантованым падвалам. У гэтай будыніне хаваліся галоўныя колгасьніцкія продукты: зярно, бульба і гародніна.

За пісьменным сталом сядзеў малады хлопец з задзёрыстым віхрастым чубам, комсамолец Грышка Гаруй. Ён быў дзелаводам і бухгальтарам. З аднаго і другога боку стала былі— старшыня колгасу Максім Шахлевіч і яго намесьнік Кандрат Ваган. Правяралі конторскія кнігі. Справа гэта для іх новая.

— А ўсё-ж такі, брат Грышка, ня шкодзіць, я думаю, пабыць табе на бухгальтарскіх курсах. Колгас наш расьце, справа ўскладняецца,—заклю-

чыў рэвізію кніг старшыня колгасу і дадаў:

— Гаруй, не гаруй!

На гэтай вясёлай і жартлівай яго прыказцы зьявіўся на парозе конторы Пракоп.

XI

Усе трое паднялі вочы на Пракопа. У сваю чаргу Пракоп зірнуў на іх.

— Прабачайце, таварышы!—першы загаварыў Пракоп:—хто тут старшыня колгасу?

— Я!—азваўся Максім і вокам вайсковага чалавека зірнуў на Пракопа.

— А сам хто будзеш?—запытаўся і ён.

— Дубяга Пракоп, з вёскі Затоньне... Прышоў я да вас, таварышы, паглядзець, як будуеце вы колгас. У вас-жа, бачу, можна павучыцца.

— Ага!. ну, добра... Сядайце!—паказаў старшыня Пракопу на канапку.

Пракоп сеў, зьняў шапку і павесіў яе на зацісьнуты між кален кій. Гэтую прывычку набыў ён за часы свайго вандроўніцтва.

— А вы самі колгасьнік?

Пракоп трохі замяўся.

— Як вам сказаць? і колгасьнік і не колгасьнік... Мы толькі нядаўна пазапісваліся, а ра-

боты, сказаць, яшчэ няма ніякай. Людзі ў нас маласьвядомыя, а справа яна цёмная,—як будзе, што будзе. Адны кажуць так, другія гэтак. Дык трэба хоць паглядзець, як людзі ў колгасах жывуць, каб ведаць, як да чаго прыступіцца.

Гаварыў Пракоп, і няёмка было яму пад поглядамі незнаёмых людзей, перад якімі, праўду сказаць, ён разыгрываў комэдыю. А гэтыя людзі пазіралі на яго ўважна, і асабліва старшыня. І вочы ў яго вострыя і быстрыя, так, здаецца, і праніклі ў Пракопава нутро. Але твар яго добры, лоб шырокі, адкрыты, і ўсё аблічча яго хіліла да сябе. Пракоп пераводзіў свой зрок то на смуглы твар Вагана, то на ваяцкі Грышкаў чуб, то на адкрыты вясёлы твар старшыні.

— Ну, а самі-ж вы як глядзіце на колгас?— проста запытаў старшыня.

— Па-мойму, калі-б усе былі дружныя ды працавалі-б так на колгас, як працуе кожны сам на сябе, то чаму-ж? колгас—рэч добрая. Што адзін чалавек, а што грамада!

— А як вы організавалі свой колгас, самі ці вас хто з боку падпіхаў?—загуў басам Ваган.

— Да ўсё адно з другім злучылася. Маладыя дык тыя больш напіраюць. Вось і мой сын Мі-

кіта, падлётак, мае да колгасу вялікую ахвоту. Другі сын, Андрэй, у Чырвонай арміі, піша, каб ня слухалі кулакоў і няпрыменна ішлі ў колгас.

— А ваш сын ў Чырвонай арміі?—пацікавіўся старшыня.

— Служыць і такі ўжо заядлы колгасьнік, што сьвет гатоў перавярнуць, а колгас яму давай.

— Значыцца, маладзец ваш сын, дзядзька Пракоп,—адобрыў Грышка Гаруй.

— Ну, што-ж, таварышы, кончым конторскую работу. Паабедаем, накормім нашага госьця, няхай ён трохі адпачне... Вы-ж ня надта сьпяшаецеся?—зьвярнуўся старшыня да Пракопа.

«Вось залаты чалавек», падумаў Пракоп і далікатна сказаў:

— Вы аба мне ня турбуйцеся, таварыш. А сьпяшацца мне некуды так. Ды ў мяне і хлеб свой ёсьць,—Пракоп палажыў руку на пазуху.

— У парадку азнаямленьня з нашым колгасам вы павінны наведацца і ў нашу сталоўку. І месца для вас мы знойдзем.

Пракоп прагавіта глытаў сьліну і яшчэ раз падумаў: «Золата, а не чалавек».

Старшыня ўзяў Пракопа пад сваю апеку і павёў яго ў сталоўку.

Для сталоўкі была пастаўлена спэцыяльная хата, накрытая чарапіцаю, з двума прыгожымі ганкамі і прасторнымі верандамі і наогул мела выгляд даволі фарсістага дачнага будынку. На верандах сталаваліся летнім часам. Цяпер яны пуставалі, прыкрытыя фанэраю, каб не наносіла туды сьнегу. Сама сталоўка займала палавіну дому і двума ходамі злучалася з кухняю: праз адны дзьверы несьлі страву ў сталоўку, а праз другія выносілі парожную пасуду.

На сьценах сталоўкі віселі надпісы, напамінаўшыя аб гігіене: «мыйце рукі перад ядою», «ня пеце сырой вады», «выцірайце ногі» і інш. У карыдорчыку стаяў бляшаны ўмывальнік, а пры ім віселі ручнікі. Каля парогу ў сталоўцы была паслана мата з саломы выціраць ногі. Адным словам, гігіена мела тут сваю адпаведную матэрыяльную базу, каб гэтыя напісы не аставаліся пустымі напамінаньнямі.

Пасярэдзіне стаяў даўгі стол на казлох. За гэтым сталом магло разьмясьціцца чалавек дваццаць, а каля сьцен, па адзін і па другі бок, малыя сталы: тры з аднаго боку і тры з другога.

Такім чынам зараз у сталоўцы магло свабодна абедаць чалавек сорок, але было яшчэ шмат вольнага мейсца, каб пры патрэбе гэты лік можна было значна павялічыць.

Гордасьць і здавальненьне сьвяціліся на твары старшыні, калі ён паказаў Пракопу сваю колгасьніцкую сталоўку. Пракоп не знаходзіў адпаведных слоў выказаць сваё зьдзіўленьне.

— І гэта ўсё зрабілі вы самі, сваімі сіламі?— дзівіўся ён.

Старшыня весела пасьміхаўся, як-бы ведаючы ўсе Пракопавы мысьлі.

— Самі, дзядзька, самі. Трэба толькі ясным вокам убачыць новае жыцьцё ды ўсьвядоміць сабе ўсю надарэчнасьць старой дробнай гаспадаркі.

— А! брат ты мой!—ахаў Пракоп ды пачухваў патыліцу.

— Захочаш па-настаяшчаму—усё зробіш грамадою.

— Ну, як-жа вы ўсё-ж такі збудавалі гэты дом? Ды і не адзін гэты дом—у вас, бачу, шмат чаго пабудавана?

— Расказваць можна тут і доўга і коратка. Я раскажу вам кароценька. Наш колгас не малы:

у нас паўтары тысячы га зямлі, і народу ў нас ня мала: сем'яў каля двухсот. Чаму пашлі мы ў колгас? Таму, што зусім ясна ўсьведамілі перавагу колектыўнай гаспадаркі над гаспадаркай індывідуальнай. Стаўшы на гэты шлях, мы і пайшлі дружна, як адзін. Пачалі мы з гэтага пасёлку. Майце на ўвазе, што тры гады таму назад тут было пустое месца. Вось мы і надумаліся залажыць тут ядро, фортэцыю нашага колгасу, яго штаб. Кінуліся гуртам, перанесьлі сюды будынкі шасьці гаспадароў, перакроілі іх ды зрабілі адну добрую клуню, тры дамы і іншыя патрэбныя пры іх будынкі. Справа пашла. На сёнешні дзень мы тут маем сорак сем'яў. Навошта-ж кожнай сям'і, кожнай гаспадыні ў хаце траціць час, сілу на вазьню каля печы? Падумалі, меркавалі і зрабілі адну кухню на ўсіх... Мая жонка стаяла летась за сваю кухню, а паспробуй цяпер скажы ёй пра сваю кухню—яна табе чапялою ў нос суне.

Наш пасёлак зьяўляецца тым асяродкам, каля якога і накшталт якога будуць расьці новыя. У нас ужо ёсьць такая програма, шырокая програма. Усе нашы колгасьнікі бачаць, што мы—на правільным шляху і дружна бяруцца за работу. А гэта самае важнае. Ня думайце, што

ўсё гэта лёгка даецца. І самае трудная—арганізаваць рабочую сілу, паставіць кожнага на сваё месца. А мы гэтага дабіліся, мы гэта зрабілі.

XII

Застаўшыся адзін у пакойчыку для «гасьцей» і акінуўшы яго поглядам, Пракоп сам сабе падмігнуў, кіўнуў галавою.

— Вось табе і колга-а-с!—ціха і працягла сказаў ён сам сабе.

Гэты пакойчык зьмяшчаўся ў тым-жа доме, дзе жыў і старшыня колгасу, і адгароджваўся ад яго кватэры сьветлымі і даволі прасторнымі сенямі, а за глухою сьцяною жыла сям'я колгасьніка. Тры шырокія дзеравяныя тапчаны з саламянымі падушкамі і сянікамі, засланымі коўдрамі сялянскага выробу, служылі пасьцелью. Спэцыяльнае прызначэньне гэтага пакойчыка—даваць прыпынак чужым людзям, па той ці па іншай справе наведваўшым колгас.

У пакойчыку было цёпла, ціха, утульна. Пахла смалою сывежага дрэва. Гэтая каморка, або «станцыя», як называў яе Пракоп, паказалася яму верхам чалавечага добрабыту. Ён скінуў кажух, палажыў яго ў ногі на тапчан, і сам выцяг-

нуўся ва ўсю даўжыню свайго стомленага і аця-
жалелага пасьля ёмкага абеду цела. «Добра
жывуць, ядры іх качалку!»—пазайздросьціў ён
колгасьнікам і пагладзіў тугі, як барабан, жы-
вот. Даўно ўжо так не абедаў Пракоп і лепшым
доказам гэтага багатага абеду служылі засеў-
шыя ў зубах кавалачкі гавядзіны. Цяпер наш
дэлегат выкалупліваў іх адтуль пруткаю сало-
мінкаю і страляў імі аж у процілеглую сьцяну.
Такі-ж самы абед елі і ўсе колгасьнікі, так што
Пракопавы меркаваньні аб яго дэлегацкіх прывілеях адпадалі тут самі сабою. Гэты ёмкі абед наводзіў на Пракопа сон і спакой духа. У безьмяцежным разважаньні над проблемаю, што лепш, ці быць колгасьнікам ці дэлегатам усправе азнаямленьня з колгасам, ён і заснуў крэпкім сном.

Яшчэ адна прыемная неспадзяванка чакала Пракопа ў гэты дзень. Вечарам, пасьля здравецкага храпака, яму, як дэлегату, далікатна запрапанавалі паглядзець колгасьніцкую лазьню, а калі ў яго будзе ахвота, то і памыцца ў ёй. Пасланцом быў колгасьнік, Пракопаў сусед па кватэры, Мікола Гнак.

Лазьня таксама добры і дарагі пачастунак для госьця, асабліва такога, як Пракоп, і хоць

яна—установа і старасьвецкая, тым ня менеи аўторытэт яе высока стаіць і ў нашы дні. Сяроджа колгасынікаў лазыненскія дні лічыліся чуць ня сьвятам.

— Ну, і малайцы-ж вы: і лазыню сваю маеце!—з захапленьнем азваўся Пракоп.

— Як ня мець у колгасе лазьні? Папарышся ды памыешся—проста як-бы ты другі раз на сьвет народзішся. На цэлы год здароўя прыбавіцца,—адказаў Мікола.

— Даўно ўжо ў калгасе?

— Тры гады.

— Ну, і скажы-ж, браток: лепш вам у колгасе ці не?

Для Пракопа гэта было пякучае пытаньне.

Мікола ўскінуў на Пракопа вочы, усьміхнуўся.

— Дзіўны вы чалавек. Да што-ж тут і пытацца? Калі-б вы ведалі, як мы жылі раней і як сталі жыць цяпер, што мелі мы тады і што маем цяпер, то вам сьмешна было-б пытацца аб гэтым. Да вы-ж паглядзеце на нашы будынкі, на нашы кватэры да на нашы машыны. Гэта-ж нашы работнікі! А паглядзелі-б вы на наша поле вясною, летам... Скажу вам проста: цяпер толькі і жыць мы пачылі, цяпер толькі і сьвет нам адчыніўся.

У гэтых гутарках незаметна прайшоў час і ад легласьць да лазьні. Праўда, яна была тут і недалёка, крыху на вотшыбе за будынкамі пры лагчынцы, дзе прабівалася невялічкая крыніца-ручаёк. На гэтым ручайку выкапалі сажалку, аблажылі яе берагі каменьнямі, дно прачысьцілі і пабудавалі лазеньку, правёўшы трубы ў сажалку, адкуль і бралі ваду. Лазьня была прасторная і выгодная. Адна палавіна была адведзена для разьдзявальнай, а ў другой мыліся і парыліся. Тут ужо мітусілася з дваццаць колгасьніцкіх голых цел, пачырванелых ад пару і венікаў. Шум, жарты, вясёлыя выкрыкі поўнага задаваленьня поўнілі лазыню. Сярод гэтых галышоў Пракоп угледзіў ваяцкі чуб комсамольца Гаруя, якога спаткаў ён у конторы.

Пракоп разьдзеўся. Яму, як дэлегату, далі венік, пахучы, як май. З венікам пад пахаю і з нагавіцамі і кашуляю ў руцэ пашоў ён парыцца, мяркуючы, куды-б латвей прыстроіць бялізну, каб яе найлепш праняло параю, бо ў бялізьне за часы яго вандроўніцтва завялося ня мала насьціногіх яго эксплёататараў. Павесіўшы яе над дзьверамі печы, дзе давалі пару, ён палез на палаткі.

— От дзе рай, браткі мае! А-а-х, як добра!— вытукнуў і пакрэхтваў ад задавальненьня Пракоп, грэючыся на палатках і нямілосэрдна хвошчучы сябе мяккім венікам. Гразь і бруд споўзвалі і сплывалі з яго гадамі нямытага цела.

— Падай, падай пары!—крычалі аматары папарыцца.

Чырвоны, як рак, угнуўшы галаву, падаваўся Пракоп на ніз, бо такога гарачага пару, якога нагналі цяпер колгасьнікі, ён з няпрывычкі мыцца ў лазьні, ня мог перанесьці.

— Дайце вам плечы пашарую,—запрапанаваў свае паслугі Мікола Гнак.

Пракоп падставіў сьпіну, а Мікола з заядласьцю і спрытам запраўскага лазьніка шараваў яму сьпіну і сьцёгны.

— Ой, браток, і скуру з мне спусьціш!

— Нічога, нічога!—заспакойваў яго Мікола:— каб помнілі нашу лазьню.

— Ох, якая-ж гэта слаўнота!—Слоў не знаходзіў Пракоп, каб выказаць сваё адчуваньне і захапленьне лазьняю.

А калі ён выходзіў памыты з лазьні, то казаў:

— Праўду гаварыў ты, браток: усё роўна як

зноў ты на сьвет нарадзіўся: так лёгка, так добра,—ну, як-бы табе дзесяць гадоў скінулі!

Мікола Гнак запрасіў Пракопа да сябе на чай пасьля лазьні ды за адно каб і паглядзеў ужо і на яго кватэру.

XIII

Першае, што ўсюды кідалася Пракопу ў вочы пры аглядзе колгасу, было—чыстата і парадак. Гэты парадак і гэта чыстата заўважаліся і ў кватэры Міколы Гнака, куды зайшоў Пракоп пасьля лазьні. Зграбная, увіхная гаспадыня, з падстрыжанымі цёмна-русымі валасамі, адзетая як-бы трохі на гарадзкі лад, ветліва сустрэла мужа і госьця. І другое назіраньне, якое спасьцярог тут Пракоп, не магло не зьвярнуць на сябе яго ўвагі: і мужчыны і жанчыны, малыя і старыя колгасьнікі ў гэтым колгасе рабілі ўражаньне новай пароды людзей. Усе яны былі рухавыя, жывыя, гаворкія, ветлыя, вясёлыя і ў дадатак да ўсяго гэтага, выражаючыся прыба—гладкія, падкормленыя і нейк па-свойму адзетыя. Ня было той замкнёнасьці, той панурасьці і заклапочанасьці, што зазвычай характарызуе насяленьне старой вёскі.

Кватэра Міколы Гнака мела ў сабе тры асобныя каморы-пакойчыкі выгадна злучаныя між сабою дзьвярамі: прыгожая, якую-б можна назваць і кухняю, бо тут стаяла звычайная вялікая печ і меліся некаторыя адзнакі ранейшых сялянскіх хат; далей ішоў другі пакой, адгароджаны ад першага тоўстымі дошкамі, прасторны і сьветлы. Яго можна назваць і гасьцінаю і сталоваю і, нарэшце, трэці пакой, таксама адгароджаны дошкамі, служыў спальняю. У кухні-прыгожай падлога была цагляная, а ў сталовай і ў спальні — дзеравяная. Шырокія дарожкі-дыматканкі, паложаныя ў сталовай і ад сталовай у спальню, сьведчылі аб тым, як дбаюць тут аб чыстаце і акуратнасьці. Замест абразоў на сьценах вісела некалькі плякатаў і портрэтаў выдатных палітычных дзеячоў. Таксама ня было тут і традыцыйных сялянскіх лавак уздоўж сьцен. Іх замянялі канапа, простыя крэслы самадзельнага выробу і некалькі акуратных табурэтаў. Насупраць уваходу стаяў стол, накрыты белым абрусам, а на стале ўжо весела пашумліваў самаварчык, вядучы сваю няўпынную гутарку. На падлозе каля стала забаўляліся дзеці. Іх было двое: малы хлопчык Пятрусь, гадкоў тры, і старшая пяцігадовая дзяўчынка Насьця. На дзіцячым

табурэцiку ляжалi фiгуркi жывёлiн, выразаных з паперы Насьцяю. Цяпер яна вырэзвала коніка, а Пятрусь уважна глядзеў і паяўленьне новай жывёліны сустракаў радасным крыкам.

— Распранайцеся-ж ды сядайце за стол,— зьвярнулася гаспадыня да госьця, а сама расстаўляла шклянкі і сподкі, увіхаючыся каля стала.

Зьдзіўлены і моцна ўражаны Пракоп нясьмела сеў за стол у гэтай няпрывычнай для сябе абстаноўцы. Яму ніколі ў жыцьці не даводзілася піць чай з такою раскошаю, як тут. Ён недаўменна пазіраў на кватэру, на гаспадароў. З аднаго боку як-бы гэта і простыя сяляне, але-ж гэта кватэра—проста такі гарадзкая, панская! Ён стараўся зьвязаць у сваіх мысьлях штось знаёмае для яго ў сялянскім быце, што бачыў ён тут, з тым, што пракладала сабе новую дарогу. І ўсё гэта ніяк не ўкладалася ў яго галаве.

— Скажэце,—ня ўтрываў, нарэшце, ён:—цi ў вас усе так жывуць, як вы?

— А што?—Мікола прыкінуўся, што не зразумеў яго.

— Да проста мне ня верыцца, што я на ква-

тэры ў колгасьніка: жывеце вы, як паны! Выбачайце мяне.

— Як людзі, вы хачаце сказаць?—паправіў яго Мікола:—так, жывём лепш, як жылі да колгасу.

— Чыста ў вас, хораша. І няўжо-ж гэтак у вас штодзень? Ці можа гэта жонка ваша такая ўдалая гаспадыня?

— У нас парадак такі, адзін для ўсіх,—азвалася гаспадыня.

— І як дабіліся вы такога парадку?

— А вы чулі пра самакрытыку?—запытаў Пракопа гаспадар.

Ніякага рэальнага зьместу не ўкладаў Пракоп у гэта слова. Ён моўчкі глядзеў на Міколу, баючыся паказацца невукам і чакаючы паясьненьня.

— Усім нам добра вядома, у якім брудзе жылі мы вякамі. Мы яго нават і не заўважалі, лічучы, што для мужыка так і павінна быць. Цяпер-жа, калі ўсё старое, што заядала нас, мы выкінулі на сьметнік, перад намі паўстала пытаньне: няўжо-ж мы гэты спрадвечны бруд захаваем і надалей? Не: мы аб'явілі яму сьмяротны прыгавор. І не на словах, а і на справе. А калі хто адставаў або мала зварачаў на гэта ўвагі, таго ўжо нашы жанчыны, наш колгасьніцкі жаночы актыў,

бралі на прыцэл. Ну, каму-ж гэта хочацца папасьціся на язык і за што? за неахайнасьць? І навошта-ж яна, калі можна жыць па-чалавечы, калі гэта і для вока прыямней і для твайго-ж здароўя лепей?

— Праўда ваша,—пацьвердзіў Пракоп, з шумам дапіваючы другую шклянку чаю.—Мяне яшчэ вось што цікавіць: на якім палажэньні жывяце вы ў колгасе—ці як гаспадары ці як рабочыя?

— І тое і другое. Гаспадары—паскольку колгас зьяўляеца нашым, рабочыя—паскольку мы працуем на нашай агульнай гаспадарцы.

— Ну, а ці маюць колгасьнікі сваю, асабістую маемасьць, ну, скажам кароў, сьвіней?—дапытваўся Пракоп.

— Такога права ніхто з нас не пазбаўлен,—тлумачыў Мікола.—але вось цяпер сталася так, што гэтым правам ніхто ўжо ня хоча карыстацца. Чаму? да проста няма ніякага разрахунку! Нашто мне той лішні клопат хадзіць за кароваю, за сьвіньнямі, мець для іх і памяшканьне і корм, калі і малака і сьвініны, колькі мне трэба, дасьць наш-жа колгас? Яшчэ год таму назад сёй-той чапляўся за гэтыя рэшткі дробнай уласьніцкай

гаспадаркі, а потым пабачылі ўсю недарэчнасьць і непатрэбнасьць іх і кінулі.

— А скажэце, як у вас разьмяркована работа?

— А разьмяркована яна так, што на кожную работу ставяцца найболей адпаведныя колгасьнікі. Агульнае наша правіла такое: ніводзін працаздольны колгасьнік не павінен астацца без работы. Ёсьць колгасьнікі, што ходзяць пры машынах, другія даглядаюць скаціну, трэція—тыя ці іншыя майстры, чацьвертыя абслугоўваюць колгасьнікаў... Да ці мала работы ў такой гаспадарцы?

— А хто ставіць на работу?

— Самі. Выбіраем праўленьне сваё і яму даручаем распараджацца рабочымі рукамі, а ў некаторых выпадках склікаем агульныя сходы. Кожны з нас мае сваё цьвёрдае заданьне, і яго трэба зрабіць.

— І многа прыходзіцца працаваць?—дапытаўся Пракоп.

— Да працы то хапае. Але якімі-б ударнымі тэмпамі мы тут ні працавалі, усё-ж, трэба вам сказаць, працуем мы процантаў на трыццаць меней, чым працуе гаспадар на сваёй уласнай

дробнай гаспадарцы і процантаў на пяцьдзесят меней батрака, што працаваў раней у кулака.

— А куды вы дзеяце вольны час.

— Адпачываем, чытаем кнігі, газэты, слухаем даклады, лекцыі. Няпісьменныя вучацца стаць пісьменнымі. Хто мае хвоту і здольнасьці, ідзе то ў музычны, то ў тэатральны гурток...

— Цікава!—круціў галавою Пракоп, адчуваючы, як розныя думкі вартуюць яго старую галаву, каб насесьціся на яе, калі ён застаецца сам з сабою.

XIV

Ноч, працятая прыкім холадам, пазірала ў падвойныя вокны Пракопавай станцыі. Пасьля поўначы неба выясьнілася, засеялася рознакаляровымі трапухкімі агончыкамі-зорамі, дрыжучы і лагодна пераліваючыся мяккім вясёлкавым бляскам. Мільярды такіх-жа агоньчыкаў адсьвечваліся і ў сьняжынках белага покрыва абмярцьвелай зямлі, паныла і нярухома занямеўшай у маркотным зьзяньні месяца. А месяц ужо даўно зрушыў з палавіны свае дарогі і хіліўся да краю зямлі, абярнуўшы ў яе бок свае бліскучыя вострыя рожкі..

Гэты глыбокі спакой і тужліва зьмярцьвелае зьяньне месяца, зазіраўшага ў вокны Пракопавай станцыі, наводзілі на яго маркоту і сум. Ён востра адчуў сваю адзіноту, сваю адарванасьць ад людзей, сваё бадзяньне ў дарогах, сваё дармаедзтва. Уражаньні ўчарайшага дня выплывалі ў яго памяці жывымі зьвеньнямі сапраўдных праяў тутэйшага колгасьніцкага жыцьця і калі рэзкую граніцу паміж двома сьветамі сялянскага побыту. Тое, што бачыў Пракоп з першых-жа дзён свайго далёкага няпоўнага азнаямленьня з колгасам і з колгасьнікамі, яго моцна зьдзівіла. У глыбінях свае сьвядомасьці ён адчуваў, што калі-б у колгасе ён знайшоў непарадкі, разьбежнасьці з гаспадарскімі запатрабаваньнямі, то яму было-б лягчэй на сэрцы. А ўсё гэта выплывала з яго прадузятай варожасьці да колектывізацыі. Праўда, шмат чаго засталося для яго незразумелым. Для яго былі няясны тыя спружыны і ўся тая мэханіка, што прыводзіла ў рух жыцьцё ў гэтым колгасе. Ён ўспомніў свайго суседа па кватэры, Міколу Гнака і гутарку з ім учора. Няўжо гэта ўсё праўда? Няўжо людзі так перарабіліся ў колгасе, што асабістая ўласнасьць для іх ня мае значэньня, і яны так-жа дбаюць аб колек-

тыве, як некалі дбалі аб сваіх уласьніцкіх інтарэсах? Ці шчасьлівы яны тут і як мысьляць яны сваё шчасьце?

Такія пытаньні балюча і востра ўставалі ў Пракопавай галаве, і ён думаў над тым, як знайсьці тут праўдзівы адказ.

Яшчэ не разьвіднялася, але Пракоп, па прывычцы ўставаць рана, заснуць ужо ня мог, сьпяшацца ня было куды, і ён ляжаў, разважаючы аб праявах людзкога жыцьця. «Аднакжа колгасьнікі ня надта сьпяшаюцца ўставаць», крытычна заўважыў ён сам сабе, бо ўжо пачынала разьвідняцца, а на колгасьніцкім дварэ было яшчэ ціха. Не сьпяшаючыся, Пракоп адзеўся і ціха выйшаў на двор сустрэць новы дзень і аддаць падатак свайму старому звычаю— тупаць да дня на дварэ.

Бледна-яснае неба на ўсходзе сьвятлела, рашчышчаючы дарогу кароткаму дню. Насычанае крохкім, як шкло, марозным паветрам чульліва лавіла ранічныя гукі на скрыпучым сьнезе і далёка кідала іх у прасторы. Мернае і як-бы нясьмелае паскрыпваньне сьнегу пад нейчымі нагамі пачулася каля клуні, і чыясь постаць, постаць чалавека з ёмкім мяшком на плячох, выплыла з парадзелага змроку і пасунулася ўніз

на вузенькай сцежачцы, тулячыся ў задворках між колгасных будынкаў. Пракоп зацікавіўся, перамяніў позыцыю, каб яшчэ раз пабачыць гэту постаць і праверыць сваю здагадку, што гэта напэўна хто-небудзь з колгасьнікаў цішком панёс колгаснае дабро. Але гэта постаць зьнікла, а Пракоп толькі крутнуў сам сабе галавою, упэўнены ў праўдзівасьці свае здагадкі. Яшчэ прайшло некалькі хвілін цішыні, і колгас патроху пачаў абуджацца. Грукнулі дзьверы ў адным, у другім месцы, пачуліся людзкія галасы, і некалькі колгасьнікаў паказаліся на дварэ. Потым заскрыпелі вароты ў клуні і, трошкі счакаўшы, сярдзіта зашамкала сячкарня вострымі нажамі, перасякаючы салому на дробныя шматочкі.

— Дзень добры, таварышы!—сказаў Пракоп, спыніўшыся на парозе клуні.

Два колгасьнікі завіхаліся каля сячкарні. Адзін падаваў салому ў жолаб пад зубы і нажы, а другі круціў кола спэцыяльна прыстасаваным ашэсткам. Цэлыя струмені перасечанай саломы сыпаліся на ток. Даволі ёмкая кучка сечкі, як невялічкі стажок, стаяў на таку, як відаць загатаванай раней. Двое другіх колгасьнікаў насыпалі сечку ў цабэркі, насыпалі яе промежкаю, што тут-жа стаяла ў дзеравянай скрыні, наніз-

валі цабэркі на доўгую тоўстую палку і несьлі каровам.

— Добра ідзе работа ў вас!..—пахваліў сечкарэзку Пракоп.

— Наладзіліся,—азваўся круцільшчык.

— Добра, добра!—яшчэ раз пахваліў Пракоп і сам узяўся за ашэстак, каб папрабаваць, як лёгка ходзіць кола.

Абхапіўшы пальцамі ашэстак, Пракоп налёг, крутануў раз, другі. Першыя некалькі колаваротаў патрабавалі намаганьня мускулаў, а потым, калі кола разгайдалася, яно ўжо само далучыла сілу інэрцыі да сілы мускулаў рук і круцілася лёгка.

— Вось яно табе і тэхніка! — дагодліва азваўся Пракоп. Работа скончылася, і ён зьлёгку затрубіў носам, адвярнуўшыся, як чалавек далікатны, у бок ад сечкі.

— Ну, эта ўсё-ж такі саматужніцтва,—салідна заўважыў падаваўшы салому ў жолаб сячкарні, таксама прачысьціўшы нос яшчэ старым сялянскім спосабам.

— Мы мяркуем прыладзіць маторчык,— важна дадаў ён.

— О! гэта ўжо будзе... дасягненьне!—

Пракоп быў здаволены, што знайшоў такое трапнае слова.

У кароткай дзелавой гутарцы ён даведаўся аб разьмеркаваньні работы паміж колгасьнікамі ў колгасе і аб яго ўнутраным распарадку. Важнейшыя пытаньні колгасьніцкага жыцьця выраша-ліся агульным сходам колгасьнікаў. Гэта быў як-бы маленькі зьезд Саветаў. Кіруючым прынцыпам быў лёзунг: ніводзін працаздольны колгасьнік не павінен заставацца без работы. Работа-ж павінна разьмяркоўвацца так, каб кожны работнік найбольш падыходзіў да яе і найболей адпавядаў свайму прызначэньню. Таксама браўся тут пад ўвагу і прынцып добраахвотнасьці. Разьмеркаваньне работы і прызначэньне на яе работнікаў даручалася праўленьню колгасу.

— Ну, а калі-б усе захацелі сечку рэзаць?— хітра пад'ехаў Пракоп.

— А грамада што скажа?—адказаў Лапко, што падаваў салому.

— А самакрытыка на што?—уставіў слова і круцільшчык Макрыня:—ну, і грамадзкая дысцыпліна,—дадаў ён.

XV

Пракоп і яго новыя знаёмыя накіраваліся з клуні бліжэй да хлявоў. Па дарозе спыніліся кала спэцыяльнага будыначку па суседзтву з хлявамі. Раз ужо Пракоп хоча азнаёміцца з колгасам, то мінуць гэты будынак яму не выпадае. Так прынамсі казаў Лапко. Але ў даным выпадку ім кіравала пераважна гордасьць будаўніка і аўтара проекту гэтага будынку. Лапко ў колгасе—відная фігура, і ён у поўнай меры заслугоўвае таго, каб сказаць аб ім некалькі слоў.

Лапко быў вясковы муляр, але ня муляр-прафэсіянал, а муляр-мастак, бо ў сваёй творчасьці ён унікаў штампованых форм і спосабаў работы і стараўся даць што-небудзь новае, арытінальнае, як з боку рацыяналізацыі, так і з боку хараства. Калі яму здаралася быць у каго-небудзь на рабоце, злажыць там печ, склеп ці што, то перш чым прыступіць да работы, ён з усіх бакоў вымяркоўваў плян, кіруючыся асабліваснцямі месца, абстаноўкі, характарам гаспадароў, іх густам і г. д. Усе ведалі гэтую асабліваснць выдатнага муляра, любілі яго і шанавалі, асабліва дзеці і гаспадыні. Яны ўносілі

свае проекты, давалі дарады, а Лапко ўважна слухаў, рабіў свае папраўкі, даваў контрпроекты, і ўсё гэта абмяркоўвалася разам, і калі ўжо даходзілі да агульнай згоды, тады толькі прыступаў ён да работы. А дзецям зьверх праграмы ён вылепліваў з гліны хвацкія цацкі: сьвісьцёлкі, казельчыкаў, баранчыкаў, парасятак, сабак, а ў апошнія часы шэдэўрам яго мастацтва была вылеплена з гліны фігура пана Пілсудзкага з доўгімі вусамі і нагайкаю. Усе, хто паглядаў на гэтую фігуру, проста качаліся са сьмеху. Чым дасканалей выходзіла работа, тым меншую плату назначаў Лапко. Бывалі выпадкі, калі на гэтым грунце вынікалі самыя прыемнейшыя ў сьвеце спрэчкі. Проста яго ўпрашвалі набавіць цану, але Лапко не парушаў сваіх прынцыпаў.

— Добра яно вышла, ну і добра. Гэтым самым плата мне падвышаеца,—казаў у такіх разох Лапко.

Будынак, перад якім спыніліся колгасьнікі з Пракопам, быў комбінаваным будынкам новага тыпу, пабудаваны па проекту Лапко. І вельмі трудна аднесьці яго да якой-небудзь пэўнай катэгорыі будынкаў. Гэта быў разам і склеп, дзе хавалася розная агародніна для жывёлы—рэдзька, бручка, буракі, бульба,—і кухня для

гатаваньня стравы сьвіньням і цялятам. Разам з тым Лапко ўмудрыўся выштукаваць тут і цэлы пакой, кватэру для галоўнай сьвінаркі Таклюсі Гальшкі. Калі прыняць тут пад увагу некаторыя акалічнасьці, як, скажам, наяўнасьць таго факту, што Лапко быў яшчэ кавалерам, хоць яму падбіралася пад палавіну пятага дзесятка, і той факт, што Таклюся была бязьдзетная ўдава і таксама яшчэ жанчына-ягада, то стане зразумелым тое стараньне, з якім Лапко змайстраваў гэты будынак і пакойчык для Таклюсі.

Большая часьць Лапковага будынку, склеп, знаходзілася ў зямлі. Гэта была прасторная чатырохкантовая яма даўжынёю ў восем мэтраў і на чатыры мэтры шырыні. Сьцены склепу былі абложаны каменьнямі, моцна сцэмантаванымі, а дно вымашчана цэглаю. Акуратнае скляпеньне, як неба над зямлёю, зьвісала над ямаю. Зьверху скляпеньне было прысыпана зямлёю і абложана дзірванам, праўда, цяпер закрытым сьнегам. У вузейшай часьці, дзе скляпеньне падымалася над долам, была зроблена вузенькая, доўгенькая аконная рама ў чатыры шкельцы. Аконца было зроблена так, што яго можна было лёгка вымаць, а пры патрэбе апускаць у спэцыяльна зробленую шчыліну.

Калі трэба было складаць у склеп агародніну, то да акенца пад'яжджалэі хурманкі, акенца апускалася, ставіліся жалабы-латакі, і на гэтых жалабох скочвалася бульба і ўсякая гародніна ў свае адпаведныя сусекі. Каб папасьці ў склеп, то трэба было зайсьці ў кухню, адтуль вузенькім праходам, дзе, праўда, лёгка маглі разьміцца два чалавекі, спусьціцца па ступеньках уніз і адчыніць шчыльныя дзьверы, што аддзялялі склеп ад кухні.

— Гэта ўсё—штукарства яго,—паказаў Макрыля Пракопу на Лапка:—пабачце, як гэта ўсё спэцыяльна зроблена.

— Можна было-б зрабіць яшчэ лепей,—скромна заўважыў Лапко:—ды ня было так вельмі калі разгортвацца.

Усе трое ўвайшлі ў кухню.

Кухня была прасторная і даволі сьветлая з цагляным памостам. Чвэрць кухні займала нізкая ёмкая печ з двома ўмураванымі катламі—для награваньня вады і для варкі бульбы. Для адводу пары была зроблена выцяжная труба над шырокім бляшаным каптуром. Каля сьцяны стаяла вялізнае дзеравянае карыта з паднятым крыху адным канцом.

У спушчаным канцы карыта была зроблена дзірка, заткнутая спэцыяльным шпунтам на манер гарадзкіх ваннаў. У карыце прамывалася бульба. А брудная вада сама выліваласа праз дзірку ў дне карыта і сьцякала на двор: пад карытам ў падлозе Лапко зрабіў зьліў.

Пазіраў Пракоп на ўсе гэтыя дасканаласьці, ківаў галавою і дзівіўся.

— І людзі-ж у вас здольныя!

— Людзі, як людзі, ды ня было дзе і як праявіцца ім,—казаў задаволены Лапко, паказваючы Пракопу цікавыя рэчы і даючы тлумачэньні.

Але самым цікавым, прынамсі для Лапка, быў тут пакой для Таклюсі, бо яго афармленьне найболей займала майстра і ўзяло ад яго, можна сказаць, львіную долю творчага энтузіязму. Таклюся, завязаўшы ў кружок чырвоную хустку канцамі на патыліцу, жывая, хударлявая, секла ў цэбры бульбу. Яна зірнула на Пракопа, а потым на Лапка. Гэты погляд глыбокіх цёмных вачэй казаў Лапку, што яна зразумела яго і нічога ня мае супроць таго, каб паказаць дэлегату яе будуар, гаворачы моваю буржуазіі. Лапку-ж было трохі няёмка ўводзіць чужога чалавека ў Таклюсін пакой. Але спакуса паказаць сваё

майстэрства ўзяла верх над іншымі пачуццямі.

Таклюсін пакойчык быў зусім адгароджаны ад кухні. Адною сьцяною яго служыў выступ, куды Лапко прапусьціў душнік для награвальня пакою. Гэты выступ шчыльна ўпіраўся ў столь. Ёмкая дзеравяная пераборка адгароджвала пакойчык з другога боку кухні. Угары, пасярэдзіне пераборкі, было зроблена акенца. . У гэтай-жа пераборцы былі і дзьверы. Пакойчык быў сухі, цёплы, зусім прасторны для аднаго чалавека. Але затое-ж якіх толькі пячурак, ямак, закарвашачкаў не нарабіў тут Лапко. Усё гэта дзеля таго, каб чалавеку сапраўды выгодна было тут разьмясьціцца. І Таклюся ў поўнай меры была задаволена сваім пакойчыкам. А для Лапка гэта было самае галоўнае, бо хто-ж гэтак аб ёй паклапоціцца?

XVI

У кухні кіпела дружная работа. Дзьве Таклюсіны памочніцы раскладалі корм сьвіньням, абмешвалі—каму чыстаю ячнаю, аўсянаю або грэцкаю мукою, каму промешкаю, а каму і мякінаю—у залежнасьці ад сьвіных катэгорый, і борзьдзенька адносілі сваім выхаванцам. Выха-

ванцы-ж іх, а было іх тут за трыста штук, падымалі такі гармідар, усёроўна як-бы пад імі пачаўся «земляўздрыг», як называюць зямлятрасеньне ў газэце «Савецкая Беларусь». Двое колгасьнікаў, прыстаўленых за доглядам рагатай жывёлы, бралі са склепу буракі, каб падмацаваць дойных кароў. Сюды-ж схадзіліся дойкі, тут-жа парадкавалася малако і адпускалася поўная норма тым колгасьнікам, што паздавалі свае каровы ў колгас. Лапко прыглядаўся да работы; як гаспадар, кідаў тут сваё вока, аб сім-тым распытваўся, што трохі зьдзівіла Пракопа.

Пазіраў Пракоп на гэтую, як называў ён, фабрыку, непасрэдна наглядаючы колгасную работу і знаёмячыся з яе організацыяй. Так, ён даведаўся, што колгас вызначыў цэлую групу колгасьнікаў, брыгаду, па часьці абслугоўваньня жывёлы, а на чале гэтай брыгады стаяў ня хто іншы, як наш муляр Лапко. Такія-ж брыгады былі вылучаны і для іншых работ, з якімі меў дачыненьне колгас.

«А бадай што так і лепш», падумаў сам сабе Пракоп, і мімавольна на памяць яму ўсплылі словы яго Мікіты: «Тут ты робіш тысячы работ, а там будзеш рабіць адну». Пракоп незаметна ўздыхнуў, але спыніцца на гэтых думках цяпер

ня было калі: рабочая мітусьня, жывое жыццё разьбівалі яго думкі. У гэты-ж час сюды прышоў і старшыня колгасу Максім Шахлевіч.

Ніводнага дня не прапускаў старшыня, калі ён быў дома, каб не абыйсьці свой колгасны абход і асабіста не паглядзець, як ідзе справа. Ніколі ня мінаў ён у такіх разох гэтай кухні і хлявоў, каб сваім вокам паглядзець на жывёлу і асабліва на коняй. Сам ён служыў у кавалерыі, прывык хадзіць за канём і ўмеў хадзіць, і колгасныя коні карысталіся асабліваю ўвагаю старшыні колгасу. Быў у яго тут улюблёны жарабок са спэцыяльным прызначэньнем множыць конскую пароду. Сяды-тады, каб ня даць яму застаяцца, ён сядлаў яго і, як дасканалы кавалерыст, любіў віхрам пранесьціся на сваім «Ворану». Колгасьнікі пазіралі тады на старшыню з захапленьнем і гордасьцю.

— Хоць карціну пішы,—казалі яны.—Няхай толькі сунуцца паны: пакажуць нашы малайцы па чым хунт сушанага ліха!

Колгасьнікі любілі Шахлевіча, Шахлевіч любіў свой колгас. Галава яго была заўсёды поўна ўсякіх новых плянаў, проектаў, як паставіць лепей колгас,, як палегчыць працу чалавека і мець большы эфэкт, каб гэтым самым агітаваць

за колектывізацыю суседнія вёскі. Сваю адданасьць ідэі колектывізацыі ўмеў ён перадаць і сваім колгасьнікам. Ён пашыраў і паглыбляў колгасьніцкі актыў, уцягваючы яго ў прамадзкую работу.

— Добрый раніцы, таварышы!—сказаў ён, увайшоўшы ў кухню, а з дзядзькам Пракопам павітаўся за руку.

— Ну, як падабаецца наша гаспадарка?

— Маёнтак!—у прастаце душы сказаў Пракоп,

— Ня зусім ён маёнтак: у маёнтку пан сядзіць,—заўважыў старшыня.

— Розьніца тая, што панам тут ня пан, а колгасьнікі,—паправіўся Пракоп.

— Ну, гэта яшчэ туды-сюды,—згадзіўся старшыня.

— Лепшай гаспадаркі, як у панскім маёнтку, таварыш ня бачыў,—закінуў слова за Пракопа Лапко.

— А нашу жывёлу бачылі?

— Не, яшчэ ня былі там,—адказаў за Пракопа ізноў Лапко, а потым дзелавіта далажыў:— Ведаеш, брат старшыня, аб чым я ўсё думаю?

— Ну?

— Тут трэба было-б нешта прыдумаць з гэтаю вадою.

— А што?

— Да вось бачыш ты: ваду прыходзіцца цягаць у катлы саматугам: і цяжка, і гразь наносіцца, і часу забірае многа.

— Гэта ты праўду кажаш. І сам я аб гэтым думаў. Трубы трэба правесьці?

— Так, трубы.

— Памяркуй да прыкінь, як і што. Зложыш свой проект...

— Проект у мяне гатовы.

— Тым ляпей. Сёньня-ж разгледзім і рэзалюцыю наложым.

— Залаты ў вас чалавек Лапко—заўважыў Пракоп.

— Мы яму прэмію выдамо,—адазваўся старшыня.

— На што мне тая прэмія: добра будзе, вось табе і прэмія.

— Не, брат, ня дзе ты дзенешся: прэміруем!

Уся гэта гутарка адбылася па дарозе ад кухні ў хлявы.

Каля Пракопа, старшыні і Лапка сабралася цэлая грамада колгасьнікаў. Было відаць, што яны не саромеліся паказаць чужому чалавеку

сваю колгасную гаспадарку. Агляд пачалі з сьвіней.

Адбылася некаторая зьмена ў самым слове, якім абазначаліся сьвіньня хлявы. Сьвіны хлеў раней называўся сьвінушнікам, і ў гэтым слове гучэла некаторае адценьне зьнявагі, а брудную хату параўноўвалі з сьвінушнікам. І сама сьвіньня несправядліва была ў занядбаньні. Было нават такое недарэчнае запытаньне: якая самая няшчасная ў сьвеце істота? І на яго яшчэ больш недарэчны быў адказ: парася. Чаму?—У яго адна маці ды і тая—сьвіньня. Цяпер-жа сьвінушнікаў няма, а ёсьць сьвінарнікі—такі вынік паваротy тварам да сьвіньні. Сама сьвіньня падвышана ў сваёй соцыяльнай кваліфікацыі, і яе далікатна называюць «сьвінаматкаю». І зьнімаюць з яе фотографіі. Адпаведна з гэтаю пашанаю да асобы сьвіньні зьвернута ўвага і на яе памяшчэньне.

Хлеў, куды ўвайшлі колгасьнікі, быў прасторны, чысты, з вокнамі. Дзеравяная пакатая падлога, шырокі праход між загарадак, кармушкі, прыстасаваныя так, каб сьвіньні не залязалі туды з нагамі,—усё гэта сьведчыла аб тым, што сьвіньні былі ў найлепшым доглядзе. Сьвіней ня сёньня заўтра гатовых стаць сьвінаматкамі

пераводзілі ў аддзельныя загарадкі. У такіх-жа загарадках зьмяшчаліся і сьвіньні з парасятамі. Белыя, чыстыя, гладкія, аблепленыя харошанькім парасяткамі, яны сапраўды станавілі найцікавейшае відовішча!

— Вось гэта—сьвінагадоўля дык але!—у шчырым захапленьні казаў Пракоп.

І асабліва зварачаў увагу на сябе тут адзін кныр, сур'ёзны, важны, з даўшэразнымі, выгнутымі іклямі. Справядлівасьць вымагае зьмяніць і яго назву—кныр больш адпаведным імем—сьвінататка. За яго сур'ёзны ваяцкі выгляд і за гэтыя крывыя, загнутыя, як панскія вусы, іклы комсамолец Гаруй даў яму гучнае імя: «Пан Іклінскі», а варожа настроеныя да польскіх фашыстаў колгасьнікі называлі яго проста: «Пан Пілсудзкі».

XVII

Увесь гэты дзень, за выключэньнем перапынку на сьнеданьне і абед, а сьнедаў і абедаў Пракоп у той-жа сталоўцы, быў прызначан агляду колгаснай гаспадаркі. Аглядаючы гаспадарку, Пракоп забыў сваю самазваную ролю дэлегата і са ўсёю пільнасьцю і ўважлівасьцю знаёміўся

з новымі формамі колгаснай работы, набыткам, маёмасцю і наогул з пастаноўкаю справы ў колгасе. Калі раней была біта яго супроцькалгасьніцкая тэорыя, то ў яшчэ большай ступені біла яго цяпер колгасная практыка. І як ні стараўся Пракоп знайсьці тут якую-небудзь нядбайнасьць, упушчэньне, каб да чаго-небудзь прыдрацца, зачэпкі для гэтай прыдзіркі ён не знаходзіў. Нават той невядомы чалавек, якога бачыў Пракоп раніцаю з мяшком на плячох, колгасьнік, вёсшы колгаснае дабро, як меркаваў Пракоп, ня меў ніякай загі і не парушаў парадку ў цэлым.

Але-ж Пракоп мог і памыліцца. А калі-б гэта было і праўда, то гэта даводзіла-б толькі, што прыватная ўласнасьць падбівае чалавека на злачынства. Былі тут колгасьнікі, меўшыя сваіх кароў. Такі колгасьнік і можа незаконна тайком карыстацца грамадзкім дабром. Пракопу ізноў прыпомніліся словы Міміты: «Тут ты дрыжыш над сваім канём, каб яго ня ўкралі, а там хто яго будзе красьці?»

Такія думкі праплывалі ў Пракопавай галаве, калі ён аглядаў колгас, пастаўлены моцны на дзелавую ногу. Яму паказалі насенны фонд, ачышчаны машынаю, буйны і ядраны, важкі, як срэбра.

Апроч насеннага фонду, колгас меў у дастатковай меры хлеба ў зерні для свайго спажыванньня і для корму жывёлы. Пры гэтым Пракопу далі спраўку, што каля тысячы цэнтнэраў зерня было здана дзяржаве праз коопэрацыю, расказалі, які быў ураджай. Так, адзін гектар жыта ў сярэднім даваў пудоў семдзесят пяць, у той час калі ў індывідуальнай гаспадарцы ў лепшым выпадку зьбіралі пудоў сорак—пяцьдзесят. Зямля-ж тут ня дужа ўраджайная. Чымжа гэта тлумачыцца? Тым, што ў колгасе лепш ўраблялася зямля, у колгасе былі трактары, плугі навейшай сыстэмы. Колгасьнікі-плужане і колгасьнікі - трактарысты ўступалі ў соцспаборніцтва, пры гэтым не забывалася, што зямля трэба ўлагодзіць таксама і гноем. Калі гной натуральны, штучны і попел. Колгасная практыка давяла, якое значэньне мае попел для павышэньня ўраджайнасьці. Вось чаму на попел зьвернута ўвага ў колгасе.

Пракопа павялі пад шалашок, ізоляваны ад будынкаў. У гэтым шалашку стаялі тры дзеравяныя шчыльна зьбітыя з дошак скрыні спэцыяльна зробленыя для ссыпаньня попелу. Па сярэдзіне скрыні зьверху была зроблена дзірка з жалезным сітам для прасяваньня попелу. А каб

зручней было выбіраць яго з скрыні, унізе зрабілі другую дзірку, закрытую засовачкаю: падняў засаўку, і попел сам высыпаецца з скрынкі. І ўсё гэта прыдумалі і самі зрабілі майстры-колгасьнікі.

Для складу машын таксама быў зроблены спэцыяльны будынак. Гэта быў і гараж для трактароў і склад для розных сельскагаспадарчых машын. Тое-ж шанаваньне колгаснай маемасьці асабліва выяўлялася тут у дбаласьці да машын. Усе яны былі пастаўлены і зложаны так, каб не іржавелі і не псаваліся. А трактары, як нейкія высокакваліфікаваныя спэцы, займалі самае лепшае месца, прыкрытыя посьцілкамі, што яшчэ болей падкрэсьлівала іх вагу ў сельскай гаспадарцы. Пракоп многа чуў аб трактарох, але ніколі іх ня бачыў. Аднак-жа гэта не перашкаджала яму разносіць іх на ўсе застаўкі. І вось цяпер, калі ён стыкнуўся нос у нос з трактарам, то ён мімаволі адчуў перад ім некаторы страх, як-бы гэта была ня проста машына, а нейкая жывая істота, прышоўшая спэцыяльна для таго, каб зрабіць рэволюцыю ў гаспадарцы. Колгасьнікі навочна паказалі Пракопу, колькі баравён праводзіць трактар за раз, колькі ён можа ўзараць поля і як узараць і расказалі яшчэ, якую

наогул можна рабіць работу трактарам. Калі ён усутыч азнаёміўся з трактарам, то ў яго нават не павярнуўся язык, каб запытаць, ці выгодная гэта машына. Доўга тупаў Пракоп каля трактара, аглядаў яго з ўсіх бакоў, стукаў па ім кулаком і ня ведаў, як прыняць яго: як ворага ці як вернага саюзьніка. І ўсё-ж такі адыйшоў ён ад трактара з такім-жа пачуцьцём, з якім адыходзіць пераможны ад свайго пераможцы.

— Ну, што скажаце?—запытаў Пракопа Шахлевіч, калі агляд быў скончаны.

Пракоп трошкі памаўчаў, таўкануў пальцам нос, як-бы забараняючы яму затрубіць, паківаў галавою.

— А колькі ўсё гэта каштавала... вам?—Ён хацеў сказаць «дзяржаве», але не адважыўся сказаць так. У Пракопе сядзеў усё яшчэ стары Пракоп, асьцярожны, падазроны, недаверлівы. Але, каб зьмякчыць крыху сваё запытаньне, ён зараз-жа дадаў:

— У такі колгас, як ваш, я пайшоў-бы сьмела.

— Мы нікому не закрываем дарог у наш колгас, разумеецца, толькі не кулаку ці іншай сволачы—адказаў старшыня:—але паколькі ў вас вараджаецца свой колгас, то вы павінны быць там. Новым коласам лягчэй будзе стаць на ногі:

у іх будзе ўжо практыка колгасаў, арганізаваных раней. А таго, колькі колгас каштуе дзяржаве, вы не павінны баяцца: сьмею вас запэўніць, што наш колгас на сёнешні дзень нічога ня вінен дзяржаве.

— Падведзены балянс якраз гаворыць за тое, што наш колгас дае дзяржаве прыбытак,—заўважыў комсамолец Гаруй.

Яно і правільна,—гаварыў далей старшыня,—фабрыка, колгас, школа, навуковыя ўстановы, войска—усё гэта адзін суцэльны арганізм пралетарскай дзяржавы, як ногі, рукі, жывот, галава ёсьць непадзельныя часьці чалавека.

— Такіх-бы людзей нам, як вы тут,—паківаў галавою Пракоп.

— Людзі ўсюды ёсьць. Адно толькі трэба: жывое жаданьне, цьвёрдая пераконанасьць у пераваз колектыўнай формы гаспадаркі над старой, распыленай, дробнай. А рэшта ўсё... дадасца.

І старшыня энэргічна махнуў рукою.

XVIII

Мінаўся другі дзень Пракопавага прабываньня ў колгасе «Хваля рэволюцыі». Шмат новага, цікавага для сябе, для свайго разважаньня пабачыў

ён тут, але далёка ня ўсё яшчэ было ім агледжана, каб мець болей закончаны малюнак таго, як і чым жывуць колгасьнікі, што яны робяць дома, скончыўшы колгасьніцкую работу. Да гэтага часу ён меў дачыненьне пераважна з адміністрацыяй колгасу, з людзьмі афіцыяльнымі. Тым-жа часам некаторыя пытаньні яго, узьнікшыя ў ім раніцою, калі ён ляжаў яшчэ ў пасьцелі, асталіся для яго ня зусім ясныя. Вось чаму ў яго радзілася думка распытаць людзей збоку, паслухаць, што яны гавораць аб гэтым колгасе, як глядзяць на яго. Але яму зноў успомніўся Мікіта і яго перасьцярогі—ня надта слухаць такіх людзей, як Чыкілевіч, кулакоў: яны наогул ворагі колгасу. Але чаму-ж не паслухаць, што гавораць і ворагі? Пракопа-ж таксама лічуць ворагам колгасу? А хіба ён вораг? Пракоп трохі падумаў. Не—ён проста хоча ведаць праўду! Ды нарэшце-ж можна слухаць усялякія гутаркі, але трэба мець і свой розум.

Бліжэйшаю сядзібаю, дзе можна было пагаварыць аб колгасе з пастароньнімі людзьмі, быў пасёлак Высокі Дол. Тут жылі тыя заможнікі, што выселіліся з Клімкоў. Праўда, значная частка іх зямлі была прырэзана да колгасу, і цяпер яны трохі заняпалі. Некаторыя з іх за сваё

шкодніцтва—яны востра агітавалі супроць калектывізацыі—былі высланы адгэтуль. Рэшта прысьмірэла, пападжымала хвасты і сядзела ціха, спотайку сыкаючы на колгас і то азіраючыся і прыслухоўваючыся, каб ня чула няпэўнае вуха. Яны нічога ня мелі цяпер супроць таго, каб іх прынялі ў колгас і нават заявы падавалі. Але колгас адмовіў ім наадрэз. Кулацкая заўзятасьць іх зьвяла, і жылі яны ў трывозе, чакаючы з дня на дзень свае страшнае часіны: суцэльнай колектывізацыі.

У пасялкоўца Цімоха Бабуры здарылася бяда ў хаце: у печы правалілася чарано. А людзі кажуць так: раскідаецца печ зімою—тое самае, што рассыпаецца жонка ў жніва. Бабура на скорую руку залажыў дзірку зьверху печы куском іржавай бляхі і прымазаў глінаю, каб хоць дым не валіў на хату, а сам тайком пабег да Ляпка.

Лапко і Бабура—старыя дружакі. Бабура таксама батрацкага роду. Рэволюцыя паставіла яго на ногі. Яму далі зямлі. Ён завёў гаспадарку. Абжыўся трохі, моцна трымаючыся за зямлю. А потым пацягнуўся за заможнікамі і выбраўся з Клінкоў на Высокі Дол і яго батрацкая прырода перарабілася ў кулацкую. Лапко шчыра шкадаваў яго, асабліва цяпер, калі дарога ў кол-

гас была ўжо яму зачынена. Хоць яны і апынуліся на розных бакох барыкад і паміж імі стаяла клясавая рознасьць, яны і цяпер, хоць і рэдка, сустракаліся, як прыяцелі. Гэтую прыязнь Лапка да Бабуры жывіла яшчэ адна акалічнасьць. Таклюся Галынка была сястра Цімохава. І апроч усяго Лапко наогул быў чалавек лагодны, адзывлівы на чужое гора.

Аб сваім жаданьні пабываць на пасёлку паведаміў Пракоп Лапка, як чалавека, якому можна даверыцца. Лапко памеркаваў, падумаў. Сказаць праўду, ён трохі пабойваўся адкрыта хадзіць на пасёлак, але ён абяцаў Цімоху сёньня вечарам зайсьці да яго. Баяўся-ж Лапко самакрытыкі: што гэта за сувязь колгасьніка, да яшчэ брыгадзіра, з кулацкім пасёлкам? Пракоп-жа мог паслужыць яму ў некаторай ступені шчытом ад самакрытыкі.

— А чаго-ж вы хочаце пайсьці туды?—запытаўся Лапко.

— Да проста так—хачу паглядзець і на неколгасьнікаў,—ухільліва адказаў Пракоп.

— Ну, то калі хочаце, пойдзем разам,—запрапанаваў свае паслугі Лапко:—толькі-ж пойдзем, як сьцямнее, каб ня надта бачылі тут... Ну, ведаеце, мала там што...

Яны зразумелі адзін аднаго і больш аб гэтым нічога не гаварылі, а вечарам, як добра зьмерклася, Лапко захваціў у мяшочак сваю мулярскую лапатку і малаток і ціхенька рушылі на пасёлак.

Праз паўгадзіны яны былі на пасёлку. Цімохава сядзіба стаяла на горцы каля кудзеркі, невялічкага кучаравага сасоньніку. Непадалёку сямтам сьвяціліся агеньчыкі ў вокнах другіх пасялкоўцаў. Кудлаты сабака сустрэў іх злосным брэхам. Сам гаспадар вышаў ім на спатканьне і вельмі ветла паздароўкаўся з Лапком. Вайшлі ў цёмныя сенечкі. Цімох шырока расчыніў дзьверы ў хату.

— Заходзьце-ж, калі ласка.

— А гэта наш колгасны госьць,—адрэкомэндаваў Лапко Пракопа, калі яны ўсе трое ўвайшлі ў хату.

Цімохава хата была моцная, ёмкая, пабудаваная з тоўстага сасновага дрэва, гладка спушчанага пад склют, смалістага, здоровага. Адным вам хата была гаспадарская, разьлічаная на доўгі век. Трэцюю часьць яе займала кухня, адгароджаная ад чыстай палавіны тоўстымі дошкамі. У кухні і была тая печ, у якой завалілася чарано. На шчасьце, гэтую печ рабіў не Лапко, а нейкі

другі муляр. Побач з кухоннаю печчу стаяла ляжанка, дзе ўжо трэці дзень гатавала страву гаспадыня, хоць для такой ролі ляжанка і ня была дастасавана.

Цімох павёў гасьцей у чыстую палавіну, дзе іх сустрэла гаспадыня і дачка Анэта, дзяўчына гадоў васемнаццаці. Анэта была адна дачка ў бацькоў. Сыноў-жа было чатыры. Самаму маншаму з іх было дзесяць гадоў.

— Ты, Анэтка, будзеш колгасьніца!—сказаў многазначна, хоць з адценьнем жартлівасьці, Лапко. Анэта трохі замяшалася і пачырванела: яна дагадалася, што дзядзька Лапко пранік у яе сардэчную тайну. Справа ў тым, што Анэта моцна кранула комсамольскае сэрца з колгасу «Хваля рэволюцыі», сэрца комсамольца з чубам, бухгальтара Гаруя. Сваё каханьне Гаруй утойваў ад колгасьнікў і ад сваіх таварышоў, бо яно магло зьвярнуць на дарогу правага апортунізму. Анэтка, як і ўсякі забаронены плод, яшчэ больш распальвала Гаруева сэрца. А была яна дзяўчына, як кажуць, грэху вартая.

— Ня прымуць мяне ў колгас у ваш, да я і сама не пайшла-б туды адна.

Лапко толькі хітра падмігнуў ёй і стаў адзя-

вацца ў мулярскую спэцадзежду, каб ня зводзіць дарма часу. Гліна і цэгла была ўжо загадзя прыгатавана і Лапко зараз-жа зачыркаў сваім малатком і мулярскаю лапаткаю.

XX

Цімох Бабура быў хітры чалавек і тонкі палітык. Бяда толькі ў тым, што ён зрабіў гэту прыкрую памылку, выселіўшыся з Клімкоў разам з заможнікам на гэты Высокі Дол. І чаго панесла яго нялёгкая з гэтай компаніяй, яго, меўшага пачэснае званьне батрака ў мінулым, а потым маламоцнага серадняка? Але-ж слова з песьні ня выкінеш. На Высокім Доле ён пусьціў моцныя карэньні, меўшыя ўжо адзнакі кулацкага карэньня. Яшчэ два гады таму назад у яго быў парабак. Было ў яго тады чатыры каровы і пара коняй ды авец штук восем і шасьцёра сьвіней. І як на грэх, гаспадарка яму ручыла. Але гэта каяньне прышло пазьней, калі ў паветры запахла рэволюцыяй сельскай гаспадаркі, калі была выкрыта да канца соцыяльная існасьць кулацтва і азначаны яго лёсы. Вось гэты страх ліквідацыі кулацтва і прымусіў Цімоха перамяніць тактыку. Патрошку ён стаў згортвацца, як бульбяное

лісьце перад заходам сонца, і ў той-жа час, ацаніўшы палітычную сітуацыю, ён зрабіўся энтузіястам і з энтузіязмам выпаўняў усякія разьвёрсткі, налогі і абкладаньні Яму трэба было зьвярнуць на сябе ўвагу, як на чалавека, цалкам адданага савецкай ўладзе, і давесьці, што кулацкасьць яго—проста непаразуменьне адно, што ён быў і ёсьць батрак па сваёй прыродзе. Калі арганізоўваўся колгас «Хваля рэволюцыі», а ў кулакоў пачалі забіраць машыны, Цімох сам павёз туды жнярку, праклінаючы колгас і жадаючы яму тысячу разоў праваліцца скрозь зямлю.

— Таварышы, браткі! Вось вам мой падарунак. Разжывайцеся з мае лёгкае рукі. Маё сэрца цалкам ляжыць у вашым колгасе. Але між намі, таварышы,—прорва: я—пасяльковец,—маю такое няшчасьце,—вы, браткі, маеце права не паверыць маёй шчырасьці. Але той, хто чытае ў людзкім сэрцы, сказаў-бы вам праўду пра мяне.

Прамова яго была гарачая, сам прамоўца расчуліўся і сьляза вось-вось гатова была скаціцца з яго вострых і хітрых вачэй. Гэта прамова кранула некаторых колгасьнікаў. Старшыня-ж колгасу толькі пасьміхнуўся, але пахваліў Цімохаву грамадзкую сьвядомасьць і падзякаваў за пада-

рупак. Ды Цімох закінуў зерне сумнення і ў мысьлі старшыні, як-бы ў пакараньне за тую ўсьмешку недавер'я з боку Максіма Шахлевіча, што не схавалася ад вострых Цімохавых вачэй. Пад вялікім сакрэтам і шэпатам вялікай таямніцы сказаў ён Максіму ставіць на ноч варту ў колгасе: пасялкоўцы замышляюць супроць яго ліхія замахі. Праўда гэта была ці не, асталося невядомым, але варта была пастаўлена, і аб гэтым стала вядома па пасёлку.

Так была наладжана сувязь з колгасам, і гэтай сувязі ён стараўся ня губляць, наадварот, ён яшчэ болей замацоўваў яе, заваёўваючы давер'е к сабе з боку асобных колгасьнікаў. Вялікім козырам была цяпер у Цімохавых руках яго Анэтка. Асьцярожны і прадбачлівы бацька ня спускаў яе з свайго вока. Яму гарліва памагала ў гэтым і маці. Уся бацькаўская энэргія іх была накіравана на тое, каб ніякага пераходу дзявочых граніц ня было да таго часу, пакі яны не запішуцца законным парадкам, не выпускаць з рук комсамольца-колгасьніка. Анэтка павінна памятаць, што на яе ўскладаецца важная місія—быць аховаю сям'і і гэтага хутарку. А гэты хутарок быў так дораг Цімоху, асабліва цяпер, калі становішча яго, як кулака, няпэўнае, нявыразнае, цёмнае і страшнае.

На чорны выпадак Цімох стараўся працерабіць сабе дарогу ў коглас.

Лапко залез у печ і ўзяўся за работу. Цесна было і непаваротна. Прыслуживала і памагала яму Анэтка, спрытная, гнуткая дзяўчына. Падавала гліну, цэглу.

— Цесна там вам, дзядзька, і непаваротна!— шчыра спачувала яна муляру, устрасаючы стрыжанымі цёмнымі валасамі, адкідаючы іх са лба. Алег, яе меншы брат, стаяў і назіраў.

— Нічога,—Анэтка, нічога,—як шэршань у дупле, бубніў у печы Лапко:—мы яе сейміга да ладу давядзём.

— Ты, брат, ня вельмі ўжо старайся там: залажы трохі з большага, абы да вясны дастаяла,— сказаў Цімох, ведаючы, што Лапко ўсё роўна зробіць акуратна.

— Дзьве пяцігодкі прастаіць,—азваўся з печы Лапко, закладаючы цэглу.

Покі Лапко завіхаўся ў печы, Пракоп і гаспадар сядзелі ў сьвятліцы і гутарылі. Гаспадыня тымчасам клала ў ляжанку сухія, тонкія паленцы, а бразгат скаварады сьведчыў аб тым, што будзе пачастунак.

— Дык вы, значыцца, колгас глядзелі?

Уступная перад гэтым гутаркa была прысьвечана Пракопавай асобе: адкуль ён і хто?

Да вось цікава паглядзець, як будуецца колгас і як тут жывуць людзі.

— О, колгас пастаўлены за разьлюлі маліну!—энтузіязіста выгукнуў Цімох:—цяпер і сьляпыя бачаць, што колгас ёсьць вышэйшая форма гаспадаркі. Іначай і быць ня можа.

Пракоп трохі панурыўся.

— Нічога ня скажаш супроць: гаспадарка іх—дзівіцца трэба. А ўсё-ж такі скажу вам... ну, тут як-бы нешта людзі згубілі.

Вострымі вачыма мацнуў Цімох Пракопа. Відаць, на балючае месца наступіў яму госьць. Але ён не паддаўся першаму парыву. Зарагатаў і сказаў сур'ёзна:

— Яны нічога ня згубілі, мілы чалавек! А калі што і згубілі, дык гэта сваю галечу. Бедныя былі ў нас людзі, па зарабатках цягаліся, служылі за няшчасныя рублі, за скарынку хлеба. І сам я быў такі і вельмі шкадую, што не астаўся такім: і я быў-бы ў гэтым колгасе.

А ў затоеных мысьлях сваіх Цімох гаварыў: «І праўда, што яны нічога ня згубілі. З аднаго батрацкага стану перайшлі ў другі, у лепшы. Але як былі батракі, дык батракамі і засталіся.

А мяне ў колгас па добрай волі ці па вярбоўцы не зацягнулі-б».

Пракопу-ж уголас казаў далей:

— Губляе ў колгасе заможнік, кулак...

— Ну, а вам цяпер ня можна ў колгас?— пацікавіўся Пракоп.

Цімох нявыразна махнуў рукою.

— Яно-б можа, калі-б то ў часе зрабіў захады, і папаў-бы. А цяпер... трудна. Заможнік, бачыце, кулак. А які кулак? Што парабка некалі трымаў? Дык і сам-жа я парабкам быў. Адно другім пакрываецца. Уся мая бяда ў тым, што выселіўся на гэты пасёлак... Ды каб-жа чалавек ведаў, дзе ён паваліцца, дык там саломкі падаслаў-бы... Мяркуеш, як лепей, ды не заўсёды яно на дабро выходзіць.

— Вось вы тут блізка жывеце, і вам лепей відаць: ці здаволены яны жыццём у колгасе?— рубам паставіў пытаньне Пракоп.

— А чаго ім, скажэце, больш трэба? Жывуць у цёплых, чыстых кватэрах. Працуюць у два, у тры разы меней за тых, хто вядзе сваю гаспадарку. Ядуць на поўны пуп, чыста ходзяць, клопатаў ня маюць, кожны ведае адно якое-небудзь дзела. Дзеці іх у догляд зе—маюць свой дзіцячы сад. Вечары ладзяць, прыстаўленые,

музыку ды яшчэ і ў лазьні могуць мыцца. Ну, чым-жа ня жыцьцё?

— Але ўсё-ж яны там... ну, як вам сказаць? сабою і сваім часам ня могуць распараджацца, як хочуць.

Пракоп успомніў, з якою перасьцярогаю ішоў з ім сюды Лапко, ды аб гэтым не сказаў нічога.

У затоеных сваіх мыслях Цімох гаварыў:

«У тым-та і бяда, што ў колгасе такім гаспадаром, як на сваім хутары, ты ня будзеш і сваім адумам нічога зрабіць ня здолееш. І працаю, здабыткам яе, па-свойму не пакруціш».

Пракопу-ж ён праконана тлумачыў:

— Ну, гэта байкі адны! Дзе можна знайсьці такога вольнага чалавека, як вы думаеце? На сваёй гаспадарцы ты вольны? Да ты сам сабе тысячу раз тут нявольнік. Нявольнік свае зямлі, свае працы, свае скаціны, сваіх абавязкаў перад дзяцьмі, перад людзьмі. Дрыжыш за кожную дробязь, за кожную няўдачу... Калі добра паглядзець, дык няхай яно калом пойдзе. А ў колгасе адбарабаніў сваё, і ты вольны казак.

А ў заключэньне сваіх слоў. Цімох у мыслях дадаў:

— «Чорт-жа цябе ведае, што ты за чалавек і як лепш з табою гаварыць!»

— Як відаць, усё, што робіцца на сьвеце, ідзе к лепшаму,—глыбокадумна заўважыў Пракоп, дзівячыся, чаму такога чалавека, як Цімох Бабура, ня прымаюць у колгас.

Лапко паправіў печ, акуратна замазаў яе зьверху і калі ўжо ўся работа была скончана, жартам напалохаў Анэтку, намерыўшыся замазанымі глінаю рукамі ўзяць яе за шчокі.

— Ой, дзядзька!—са сьмехам і піскам адскачыла яна ад Лапка, а потым палівала яму ваду на рукі. А гаспадыня накрывала стол.

XX

Перш чым сесьці за стол, Цімох вышаў на двор і пазачыняў акяніцы. З двара завярнуў у варывеньку, дзе хаваўся розны гаспадарскі скарб. Тут-жа стаяў і шкафік, а ў шафіку пра запас вадзілася гарэлка. Таксама ў варывеньцы віселі цяпер і абрацы, бо дзяржаць іх у хаце было нязручна. У мінуты рэлігійнага настрою Цімох заходзіў сюды памаліцца богу, памятаючы словы яго сына: Ты, калі молішся богу, вайдзі ў клець тваю і зачыні за сабою дзьверы: няхай малітва твая будзе патайною. Дужа трапна казаў колісь сын божы! У цемнаце над-

няў Цімох вочы ўгору, дзе віселі абразы, уздыхнуў, памаліўся кароткa, але горача: «Захавай божа, мне хутар». А потым намацаў кручок на шафіку, адчыніў, пашоргаў рукою па бутэльках і выцягнуў важкую пляшку літраў на паўтары, сунуў за пазуху і накіраваўся ў хату.

Пах скварак і кілбасы так спакусьліва разьліваўся па хаце, што кожны, хто быў тут, мусіў актыўнейшым чынам адгукнуцца на гэта сваім носам. А Пракопаў нос вывеў такія трэлі, якіх ня выводзіў яшчэ ні разу.

Круглая, агромная, у меру глыбокая патэльня, на палавіну занятая цёмна-ружовым распушчаным салам, дзе плавалі скваркі, як скрыгі ў разводзьдзе, і нярухома ляжала скручаная ў дзьве столкі кілбаса, якою можна было-б падпераздць самага тоўстага чалавека, заняла цэнтральнае месца на стале. Анэтка прынесла міску квашанай капусты, Цімох паставіў бутлю. Госьці гарэлі ад нецярпеньня, але сядзелі паважна, нічым ня выказваючы свайго прагавітага жаданьня кінуцца ў наступленьне на гэтым фронце.

Першым выпіў Цімох, гаспадыня, яшчэ малажавая, чорнабровая, у меру тоўстая, і ў меру высокая жанчына, уступіла яму сваё права. Першая чарка была выпіта за Лапка, за яго работу.

здольнасьці, за брыгадзірства і за добрае сэрца.

— Каруцей, каруцей,—сароміўся трохі Лапко:—кілбаса стыне!

Сваю чарку ён перадаў гаспадыні. Гаспадыня з далікатнасьці зноў адмаўлялася, але Лапко катэгарычна заявіў, што ён выпʼе толькі пасьля гаспадыні, мотывуючы гэта тым, што ён хоча ведаць яе мысьлі. А калі потым ён выпіў і сам, то ад здавальненьня моцна крэкнуў: гарэлка, наліўка на вішні, была дужа добрая, і жартліва сказаў Цімоху:

— Ты павінен жыць тут, пакі я не памру ў колгасе!

— То дай божа Лапку жыць у колгасе сто гадоў!—умеў сказаць да рэчы і Пракоп.

— Дай божа!—пацьвердзілі Цімох, гаспадыня і Анэта.

На некаторы час гутарка прыціхла, заступіўшы месца чаўканьню сківіц. Адна толькі гаспадыня разрывалася на часьці, частуючы гасьцей.

Госьці церабілі кілбасу з капустаю. А кілбаса была сакоўная, крохкая і калі адкусіш кусок, то яе кавалачкі выпіраліся самі з свае няволі, расквечваліся, як бутон ружы. Пракоп са смакам пытляваў кілбасу, зацярушваючы бараду ка-

пустаю, а малы Алег заўважыў, як калыхалася на сьцяне цень ад яго барады, і моўчкі сам сабе пасьміхаўся, пазіраючы то на Пракопаву бараду, то на яе рухлівую цень на сьцяне.

— Ну, кілбаса-ж у цябе, Алена: проста сама ў роце растае!—у захапленьні хваліў Лапко кілбасу, а тым самым і гаспадыню.

— Гэта мы з Анэткаю рабілі,—перадала здаволеная маці частку пахвалы дачцэ.

— З Анэткаю?—Лапко паглядзеў на дзяўчыну, паківаў галавою.

— Не, нічога ня будзе: забяру, мусібыць, я цябе ў колгас, Анэтка!

Анэтка выпіўшы чарку наліўкі, сядзела з паружавелымі шчокамі, жывая, вясёлая, шчабятлівая. Сьвежасьць і моладасьць прабівалася ў кожным яе руху, у кожным слове, у сьмеху і ў іскрыстым блеску чорных вачэй.

— Няма мне дарогі ў ваш колгас!—нібыта з засмучэньнем адказала Анэтка.

— Нойдзем!—рашуча заявіў Лапко:—я сам запішуся ў комсамольцы, а цябе вазьму... Эх!.. Ну, і чаму я не комсамолец?.. А кілбасы смачныя!

— От такіх кілбас няма там ў колгасе,—тонкую шпільку пусьціў Цімох.

— Няма!—тужліва згадзіўся Лапко, а потым дадаў:—ну, калі-б хто ўжо захацеў, то нарабіў-бы сабе трохі кілбас. Не кажу такіх смачных, а наогул.

— Ды там-жа ў вас і распараджэньне ёсьць—злупліваць скуры з сьвіней,—гнуў сваё Цімох.

— Ёсьць!

Лапко высока падняў галаву.

— А ты ведаеш,—сказаў ён:—што пяцьсот сьвіных скур даюць колгасу адзін трактар?

— Трактар? за пяцьсот сьвіных скур?—зьдзівіўся Цімох.

— Так, адзін трактар!—з відам пераможцы пацьвердзіў Лапко.

Не ўцярпеў тут і Пракоп.

— А! вось табе і сьвіная скура! Дык колькі-ж мы сваёю вёскаю за свой век трактароў наелі! Божа, твая воля, што робіцца на сьвеце!

Пракоп апусьціў галаву і задумаўся. Ён нават ня чуў, што сказаў Цімох на яго заўвагу. А Цімох сказаў:

— А калі прыняць пад увагу, што мы елі і мяса і сала разам з скураю, то мы праелі ня толькі трактары, а і цэлыя трактарныя заводы разам з трактарамі.

— Ты гаворыш праўду, хоць гаворыш, як клясавы вораг. І не гавары ты гэтак, каб я не ўзлаваўся. Шчасьце тваё, што я выпіўшы!.. Эх... Дзе мая злосьць, каб яе агонь спаліў?!

Лапко пакруціў галавою.

— Ануча я, а не чалавек!

— О, каб гэтыя былі ўсе людзі, як дзядзька!—са спачуваньнем сказала яму Анэтка.

— Не, Анэтка: не хвалі ты мяне, няма ў мяне клясавай нянавісьці да Цімоха. Ад гэтага я і пакутую на сьвеце.

Гарэлка зашаламіла галовы. Пракоп даўно ўжо ня піў гарэлкі, і хмель наймацней стукнуў яму ў галаву. Наўперад яму стала так добра, добра, як, здаецца, ніколі яшчэ ў жыцьці. І людзі і ўсё на сьвеце паказалася яму такім добрым і мілым. Цэлыя кавалкі жыцьця, зьявы, малюнкі праходзілі перад яго вачамі. Ён моцна соп носам, аддаючыся сузіраньню свайго жыцьця. Стараўся слухаць, што гавораць каля яго, сам устаўляў сваё слова, але мысьлі яго былі дзесь далёка. А потым зрабілася яму журботна. Проста хацелася плакаць і расказаць людзям пра сваё жыцьцё, пра сваё гора і самадурства, і калі Лапко каза, што пакутуе на сьвеце, Пракопа прарвала. Ён чмыхнуў носам так, што спалохаў

Алега і непаслухмяным языком пачаў.

— Лапко, таварыш Лапко! Адзін ты спадабаўся мне ў колгасе, як... ну, ня ведаю хто... Пакутуеш? А я не пакутую?—голас Пракопаў абарваўся.

— Вы-ж думаеце я—дэлегат? Які я ў чорт дэлегат? Дармаед я, брадзяга!.. Сам сябе выгнаў з свае хаты, з свае гаспадаркі. На сваю старую, на свайго Мікітку насварыўся, кіем на іх махаў, бо яны ў колгас цягнулі мяне, а я не хацеў, збаяўся колгасу. І вось я ім сказаў: ідзеце ў колгас без мяне, а сам я ў сьвет пацягнуся, работы і праўды шукаць... Цягаюся, ня мілы сам сабе.

Дзе-ж мне дзецца?

Пракоп закрыў далонямі вочы і заплакаў, упёршы замяшаньне ў вясёлую бяседу.

— Ды аб чым-жа тут нудзіцца і гараваць?— запытаў Лапко: вот галава! Вярніся дамоў ды ў колгас валяй!

— Вярнуся, браток!—весялей загаманіў Пракоп:—успомню, што ў колгасе ёсьць такія людзі, як ты, і мне будзе весела, і ахвота знойдзецца ў колгасе працаваць.

Пракоп абняў Лапка, і сталі яны цалавацца.

А гаспадыня сказала:

— Ну, вось і добра! Павесялеў чалавек і добра.

— Будзем стараццца брыгадзірам цябе зрабіць у колгасе.—Паддаваў Пракопу ахвоты Лапко.

Як добрыя прыяцелі варочаліся яны з хутара.

XXI

Роўналежна і адначасна адбываліся падзеі і ў Затоньні; адкуль і зачалася ўся гэтая гісторыя.

Нельга сказаць каб Пракопаў учынак паспрыяў колгаснаму руху ў Затоньні. Калі назаўтра даведаліся затонцы аб тым, што Пракоп сышоў з дому нямаведама куды, абы толькі ня быць у колгасе, што найболей хісткія людзі, што пазапісваліся ў колгас, захісталіся яшчэ мацней. Большая палавіна іх заходзіла ў аўдавеўшую цяпер Пракопаву хату, каб даведацца з першых крыніц аб падробнасьцях і мотывах яго прочак. Яны спачувалі Пракопу, дзівіліся той упартасьці, якую выявіў ён у сваім нежаданьні ісьці ў колгас, і для большасьці з іх Пракопава постаць вырысоўвалася як постаць героя і колгаснага мучальніка. Дзе-ж гэта відана, каб пражыўшы

ўсё жыццё на зямлі чалавек, не шалагой, а чалавек сталы, працавік, руплівы гаспадар, раптам кінуў свой дом, сваю сям'ю, увесь набытак і павалокся ў сьвет? Такога здарэньня ніхто не памятае! І людзі моцна задумаліся над гэтым.

Многа было гутарак аб Пракопу. Разважаючы аб ім і дзелячыся гэтаю нязвычайнаю навіною, часамі і пасьміхаліся людзі, але гэта ня быў вясёлы, жартлівы сьмех—гэта быў сьмех жалю, няпэўнасьці і сумненьня. Трэсьлі галовамі, пацішкалі плячыма, і няпрыемнае ўнутранае пачуцьцё халадком павявала на сэрца. Ва ўсякім разе знак гэта ня добры: ня ўсыпелі яшчэ і прыступіць да афармленьня колгасу, а ўжо чалавек выбыў з грамады, заявіўшы гэтым свой протэст. І невядома, куды ён пашоў і што ён замысьліў. Некаторыя, найбольш уражлівыя затонцы ўпотайку прыглядаліся, ці не ляжыць дзе Пракопаў труп. Словам настрой быў панылы. Нават той «энтузіязм», з якім група затонцаў на чале з Марынічым і Нічыпаруком, першым падпісаўшым сваю лёгкаю рукою пратакол аб пераходзе ў колектыўную гаспадарку, ужо гатова была рынуцца на заможнікаў кулакоў, нават гэты энтузіязм апаў, разьвеяўся, як дымок, выпушчаны ў паветра з Марынічавай піпкі.

Чыкілевіч раней за ўсіх адчуў подыхі небяспекі. Але Чыкілевіч быў чалавек прадбачлівы. Хоць у яго і былі некаторыя надзеі, што колектывізацыя не адбудзецца або пойдзе нейк іншым шляхам, ён тым ня менеў на ўсякі выпадак прымаў свае меры. Яшчэ з восені выкапаў ён патайны папрабок у сваёй клуні і ў гэтым папрабку хаваў кубел сала, дзьве кадушачкі крупы і іншы свой скарб. Быў у яго добры япрук, і ён закалоў яго нядаўна. Каб людзі ня ведалі аб гэтым, Чыкелевіч не смаліў яго звычайным спосабам, саломаю: агонь і дым прыцягнулі-б людзкую ўвагу. Каб унікнуць гэтага, Чыкілевіч асмаліў япрука ў пограбе жароўняю, для чаго напаліў добрых бярозавых вуглёў. Вынікі гэтай опэрацыі пераканалі Чыкілевіча ў тым, што новы спосаб ніколечкі ня горшы за стары, а пры сучасных умовах проста даскапалы. Разам з гэтым ён зьніжаў і якасьць свае жывёлы: выменьваў яе на горшую, бяручы добрыя прыдаткі, рабіў з ёю розныя комбінацыі, але рабіў ціха, гладка незаметна. Гаспадарскія-ж машыны прыводзіў у такі стан, каб у колгасе яны баставалі, але калі-б яны засталіся ў яго, то працавалі-б належным парадкам пасьля некаторых рамонтаў, з якімі-б лёгка справіўся іх

сапраўдны гаспадар, гэта значыць ён, Чыкілеві. Ціхае шкодніцтва кіравала яго мысьлямі і паступкамі.

Хоць сам Чыкілевіч на сходзе і ня быў, але там былі яго вушы: кожны разумны чалавек павінен мець некалькі пар вушэй. Ён таксама доўга ня спаў у гэту ноч, разважаў над тым, у якой меры закране яго колектывізацыя, што возьмуць у яго ў першую чаргу, што потым і што нарэшце станецца з ім самым. Ня было ніякага сумненьня: яго раскулачаць, раскулачаць зараз-жа. Тэорэтычнае разважаньне асноўвалася на вядомых Чыкілевічу выпадках. Бясьсільны перашкодзіць такому «гвалту», ён увесь тросься ад злосьці і думаў, як папомсьціцца за гэту няпраўду і несправядлівасьць на сьвеце. У гарачай галаве яго мітусіліся самыя страшныя пляны, чым меней ажыцьцёўныя, тым больш фантастычныя. Ён думаў аб розных бяздонных правалах зямлі, дзе колгасы асталююцца, аб заразе, якою-б можна было спустошыць усю скаціну ў колгасе, аб пошысьці для тых трутняў, што пагоняцца на яго дабро, аб забойствах, падпалах і іншых жахлівых рэчах.

Раніцою даведаўся ён, што яго ўжо зьбіраюцца раскулачваць. Яго вушы ў Затоньні мелі і

свае языкі. У хваляванні, у трывозе чакаў ён няўлікнёнага налёту на сваю гаспадарку. Прайшло некалькі вострых мінут напуражанага чакання. Але яму становіцца вядома і аб тым, што Пракоп сышоў з дому і чаму сышоў. Яму расказалі, якое замяшанне выклікаў Пракопаў учынак паміж новаяўленых колгасьнікаў.

— «Дай табе божа здароўя, Пракопе!»

Лягчэй уздыхнуў Чыкілевіч і чуць не заплакаў ад радасьці, гаруючы па Пракопу: калі Пракоп і ня зусім выратаваў яго, то час раскулачваньня ўсё-ж быў адтэрмінован. Сядзець аднаму на хутары стала не ўцярпеж. У яго зьявілася думка выкарыстаць гэты выпадак. Апранае бравярку, насоўвае лісіную шапку, напускае на сябе від засмучонага чалавека, ідзе на вуліцу, дзе густа снуюць натрывожаныя затонцы.

У невялікай групцы сялян стаіць і Марыніч, як ні ў чым ня бывала, і глыбокадумна пыхкае пікаю. Вострым і калючым поглядам акінуў яго Чыкілевыч. Марыніч не заўважвае гэтага погляду і сам даволі прыязна глядзіць на Чыкілевіча. «Сволач ты, сволач!» каротка атэстуе ў мысьлях Чыкілевіч Марыніча, а ў голас гаворыць лагодна:

Дзень добры, мужчыны!

Некалькі хвілін Чыкілевіч стаіць моўчкі, слухае што людзі гавораць. А гаворка ўсё каля Пракопа верціцца. Нарэшце, улучыўшы зручны момант, выступае Чыкілевіч.

— Дзівак, скажу я вам!

Чыкілевіч тут чалавек свежы, яго слухаюць уважна.

— Проста сказаць—несьвядомы чалавек, колгасу збаяўся! Гаварыў з ім учора. Упёрся—не хачу ў колгас! Я і так і гэтак, а ён—хоць ты яму грудзі пары, з месца ня зрушыш. «Ось», кажа, «новую паншчыну робяць, у няволю заганяюць людзей». І пашаў, і пашоў. «Які-ж ты, кажа, гаспадар у колгасе? Дзе ты прыложыш тут свой розум, свой адум? А на сваёй гаспадарцы, кажа, які ты ні быў гаспадар, але гаспадар, сам сабе галава, сам сабе загадчык і камандзір. Хачу раблю, хачу адпачываю. А ў колгасе я што? Парабак—ня парабак, батрак—не батрак, а волі свае ня маю». Ну што ты скажаш такому цёмнаму чалавеку?

Чыкілевіч уваходзіць у Пракопаву ролю і пад Пракопавым сьцягам б'е па колгасу.

XXII

Мікіта падняўся з пасцелі раней, як звычайна. Першы раз у жыцьці апанаваў хлопца гаспадарскі клопат. А клопату нарабіў яму бацька ня мала. Тое-ж адчуваньне нявыразнасьці і няпэўнасьці Пракопавага лёсу цяжкім гнётам ляжала на Мікітавым сэрцы. Нахмураны і задумлёны выйшаў Мікіта з хаты.

З чаго-ж тут пачаць?

Першым дзелам пашоў у клуню—трэба накарміць жывёлу. Гаспадарскім вокам зірнуў на сена, на салому, на запасы корму, пастаяў разважліва, залажыўшы адну руку за пазуху кажушка.

Корму павінна хваціць, калі яго расходваць экономна, сам сабе падумаў Мікіта і тут-жа стаў прыкідаць у розуме, як чалавек сталы, на чым можна зрабіць экономію, як больш рацыянальна ўжываць корм. Бацька больш налягаў на трасянку. Шмат корму траціцася дарма, ішло проста пад ногі, у гной. Мікіта тут-жа рашыў абмежаваць дачу трасянкі, перайсьці больш на сечку, на паранку. Калі Мікіта запыніў свае мысьлі на паранцы, ён прышоў да вываду, што паранка—гэта і ёсьць той сваяасаблівы від сілосу, аб якім так многа цяпер гавораць. Загатаваць сапраўд-

нага сілосу бацька і ня думаў, хоць пастараўшыся і мог-бы зрабіць невялікі запас. Ну, але што ты зробіш, калі чалавек акасьцянеў у сваім разьвіцьці і ў поглядах на жыцьцё, на гаспадарку?

Гэтыя меркаваньні засланілі сабою на некаторы час мысьлі аб колектывізацыі і адсунулі на задні плян і самога бацьку.

У Мікіце пачала абуджацца патроху ўласьніцная натура, гадаваная на працяту такога доўгага часу. У яго борзда складаўся плян гаспадарскіх работ на бліжэйшы час, але гэты дзень яшчэ прыдзецца ахвяраваць заведзенаму бацькам парадку, прасьцей сказаць—натрэсьці трасянкі.

Наскуб сена, асакі з лугу, дадаў шапкі са дзьве мурагу, каб хоць на першы раз ня крыўдавала скаціна на новага гаспадара, палажыў трохі грэцкай, трохі аўсянай і трохі ячнай саломы, усё гэта старанна ператрос вілкамі і тады ўжо панёс карове і цялушцы, пільна сочучы, каб не цярушыўся корм.

Корм быў загатаваны добра, карова і цялушка адразу кінуліся есьці, што вельмі ўсьцешыла Мікіту, і ён адчуў вялікую прыязьнь да жывёлы, пагладзіў карову і цялушку. Можа-б ён і даўжэй

палашчыў іх, але рахманы конь лагодна загагокаў яму, напамінаючы аб тым, што ён таксама чаго-небудзь ды варты ў гаспадарцы. Мікіта вярнуўся ў клуню—трэба-ж даць і каню. Конь такая жывёла, што без яды астаецца ня любіць. Каню Мікіта прынёс аднаго мурагу, прычым заўважыў у голас:

— Пачакай, брат: я можа чаго і лепшага прыстараюся табе.

Словам гаспадарскі інстынкт абудзіўся ў Мікіце ва ўвесь рост.

Падаваўшы скаціне і зачыніўшы хлеў, ён зноў пашоў у клуню. На таку каля пярыла стаяла саматужная сячкарня—бервяно-казлы на чатырох ножках з двума парамі ўбітых наўскасяк сьпіц накшталт зайцавых вушэй, каб трымалася салома. На гэтай саматужнай прыладзе сечку рэзалі сярпом, для чаго да яго ручкі прывязвалася вяроўка ў дзьве столкі. Паміж гэтых столак прадзявалася нага, як той асноўны рычаг, што прыводзіў серп у рух. Рэзаць такім спосабам сечку было і цяжка і марудна. Тым ня менеі малады гаспадар так захапіўся работаю, што калі прышла маці клікаць Мікіту сьнедаць, у яго была ўжо нарэзана даволі ёмкая куча сечкі.

— Запрацаваўся сынок,—з ласкаю ў голасе заўважыла Таццяна і заплакала.

У той час, калі Мікіта рэзаў сечку, Чыкелевіч стаяў з мужчынамі на вуліцы і дзяліўся з імі сваімі ўспамінамі аб Пракопе, прыпісваючы яму такія погляды на колгас, якія таму і ў голаву ня прыходзілі. Праўда, у аснове ўсёй гэтай лухты хітрага Чыкілевіча была доля праўды, але Чыкілевіч дыплёматычна абышоў моўчкі, што ўсе такія мысьлі ён сам увёў Пракопу ў вушы, як уводзіў ён цяпер іх сваім слухачом.

Таццяна ўжо дачулася аб гэтай гутарцы. Людзі, інформаваўшыя Таццяну, не абышліся без таго, каб не дадаць сяго-таго і ад сябе. У выніку Пракопава постаць выступіла ў нязвычайна вялікіх памерах ворага колгасу.

Пануры і хмурны, ссунуўшы бровы, сядзеў Мікіта за сталом і слухаў, што расказвала маці, аб усіх гэтых прыкрых рэчах. Крыўда брала хлопца за бацьку, злосьць на Чыкілевіча, як галоўнага звадыяша і баламута. Усё-б гэта было яшчэ паўліха, калі-б яно не адбівалася на грамадзкай справе.

Але горш за ўсё, што сярод падпісаўшых учора пратакол аб ўступленьні ў колгас пачалося зноў хістаньне, зноў пашлі гутаркі аб выпіс-

ваньні з колгасу. Мікіта адчуваў тут, што і на ім ёсьць нейкая доля віны. Трэба нешта зрабіць і яму. Ён толькі што хацеў падзяліцца з маткаю сваімі думкамі, адукнуцца на ўсе этыя падзеі, але не пасьпеў: у хату зусім нечакана заходзіць сам Чыкілевіч!

Калі-б у хату забег воўк, то маці і сын напэўна зьдзівіліся-б менеі.

Чыкілевіч зайшоў асьцярожна, ступаючы мякка і з такою выразаю на твары, як-бы ў хаце быў нябожчык.

— Выбачайце!—ліслівa загаварыў няпрошаны госьць:—проста ня мог стрымацца, каб не зайсьці да вас.

Мікіта яшчэ больш панура апусьціў вочы.

Таціяна занямела на месцы і толькі ўжо трошкі апамятаўшыся сказала:

— Сядайце!

— Пастаю: я не надоўга.

Момант тупога маўчаньня.

— Ну, і што надумаўся зрабіць чалавек!— голас Чыкілевіча быў повен жалю—мне так і паказалася ўчора, што ў чалавека нешта ёсьць на мысьлях. Як роднага ўгаварваў яго ісьці ў колгас. Не! упёрся, не хачу... І куды ён пашоў?

Тут Мікіта ня мог стрымацца. Закалаціўся ад злосьці, вочы іскрамі бліснулі. Але ўзяў сябе ў рукі.

— Пашоў па сьвеце пахадзіць, каб разьвеяць кулацкія ўплывы,—сказаў ён, як дарослы чалавек.

Чыкілевіч кіўнуў галавою, але ўжо загаварыў да Таціяны:

— І што вы думаеце рабіць?

Мікіта, хоць пытаньне ставілася не яму, перабіў матку і сам, як гаспадар у хаце, адказаў:

— Вось зараз іду ў праўленьне колгасу і падам заяву, каб нас прынялі ў колгас.

Гэта думка прышла Мікіце ў голаву раптоўна, цяпер.

Чыкілевіч шырока расчыніў вочы.

— І гэта будзе згодна з бацькаваю воляю?— і з усьмешкаю паглядзеў на Мікіту.

— Вон з хаты!

Мікіта ўвесь пачырванеў, усхапіўся з месца, згарнуў кулакі.

— Пабойся ты, смаркач, бога, пад абразамі сядзіш!—узлаваўся абражаны Чыкілевіч.

Тады Мікіта схапіў са сьцяны «бога», Мікалая Мірылікійскага, і шпурнуў ім у ненавіснага Чыкілевіча. Абраз шумам гваснуўся аб зямлю

каляк ог Чыкілевіча і навёў на яго настаячую паніку.

— Шалёны!—крыкнуў ён і кінуўся вон з хаты.

XXIII

Варочаючыся з хутара, Лапко і Пракоп падтрымлівалі адзін аднаго. Хоць дарога была і невялікая, але часу адабрала яна даволі многа. Па-першае, дужа сыпяшацца ім ня было куды, і яны ішлі павольна, па-другое, ногі іх трохі зьвязвала Бабурава гарэлка, па трэцяе, у іх вялася самая жывая гутарка, хоць кожны з іх захапляўся пераважна сваімі мысьлямі і пачуцьцямі, па-чацьвертае, дарога была вузкая, а наабапал дарогі ляжала шмат сьнегу, прыяцелі-ж нашы ніяк не хацелі разлучыцца, ішлі плячо ў плячо, хоць амаль не на кожным кроку то той, то другі правальваўся ў сьнег.

— Слаўныя людзі!—сказаў Пракоп і затрубіў носам.

— Людзі! што такое людзі?—запытаў Лапко і сам адказаў.

— Гліна! З гліны добры майстар зробіць усё, што хочаш... усё!

Тут яны стукнуліся плячукамі, і іх ногі, у аднаго левая, у другога правая, праваліліся ў сьнег. Покі яны іх даставалі, Лапковы мысьлі эблуталіся ў галаве, але сувязі з агульнаю тэмаю, на якую ўзяўся ён разважаць, ня гублялі, а толькі пашлі па іншай лініі.

— Я—колгасьнік і... муляр і яшчэ—брыгадзір?.. Ды які я брыгадзір?—раптам перабіў самога сябе Лапко:—які я брыгадзір, як, добра ты казаў, які ты дэлегат?

— Ну, брыгадзір з цябе першы сорт! А я дэлегат ліпавы.

— Ну, няхай так,—згадзіўся Лапко:—але куды я хадзіў? Чаго хадзіў? Ось дзе яна сама-крытыка!

— А я? чаго я цягаюся па сьвеце?—жаласьліва азваўся Пракоп:—дома ёсьць гаспадарка: конь, карова цялушка-трацячка, ды якая ўдалая цялушачка! Ну, як родная дачка! Прыдзеш у хлеў, яна табе і шыйку выцягне, здаецца так і гаворыць: «Пачухай мяне!». І кінуў усё, павалокся немаведама куды і чаго. Хто-ж будзе даглядаць іх?

Пракоп рэзка мяняе тон, з журботнага пераходзіць на вясёлы.

— Мікіта мой... о, шэльма! колгасьнік, якіх і сьвет не радзіў... Граматны хлопец!.. Ну, раз вы хочаце ў колгас—ідзеце сабе! Мая Таціяна праўду казала: не замінай жыць, хто хоча жыць па-новаму—разумная баба!.. І я на іх трос кіем! Ну, жывеце сабе, як хочаце, а я пагляджу: Пракопа ты таксама ня возьмеш за тры капейкі. Ось якая мая самакрытыка!—скончыў ён перанятым ад Лапка дасканалым словам, сэнсу якога не разумеў.

Лапко цярпліва маўчаў, пакі ня выгаварыўся Пракоп.

— Самакрытыка—штука вострая,—заўважыў ён, адгукваючыся больш на ўласныя мысьлі: запытаюць: а чаго ты хадзіў туды? Да каго ты хадзіў? Хто ты і хто ён?.. Ты—чалавек, ён—чалавек, ты хочаш жыць і ён хоча жыць. Але ты колгасьнік, ты муляр ды яшчэ брыгадзір! Гэтага ня трэба забываць. А ён хоць і чалавек, але воўк, бо ў свой хутар глядзіць. Можа ня поўны воўк, але процантаў пяцьдзесят ваўчэчыны ў ім ёсьць. І ты да яго ходзіш? Хаджу!—журботна прызнаўся Лапко.

— А чаму ты ходзіш? Ну?—Прыяцелі былі, дружылі,—на свае-ж уласныя пытаньні адказваў Лапко, знаходзячы сабе апраўданьне.

— Брэшаш, Лапко!—рашуча накінуўся ён на сябе самога:—ты сьлізьняк натура твая... сказаў-бы, Пракоп, ды шаную цябе!

Яны зноў моцна стукнуліся плячукамі і на гэты раз абодва паваліліся ў сьнег.—Пракоп на адзін бок дарогі, Лапко—на другі. Рухавейшы Лапко першым устаў на ногі і вылез са сьнегу, а Пракоп яшчэ церабіўся.

— Ну, як ты там, таварыш дэлегат?—запытаў дабрадушна і жартліва Лапко.

— Ось падымаюся і я. Але, ведаеш, лёг-бы ды і ляжаў-бы ўжо так...

— Бачыш ты, як спадабаў колгас: на колгаснай зямлі хочаш ляжаць!

— Добры колгас! Зрабіць-бы нам такі!.. Эх, Мікітка ты мой і Андрэйка і Таціяна мая і цялушачка-трацячка!—лірычна выгукваў Пракоп, упёршыся локцем у сьнег, як-бы забыўшыся, што трэба ўставаць.

— Ну, уставай, браце! пойдзем памалу,— цягнуў яго за руку Лапко.

— Пойдзем!—цьвёрда сказаў Пракоп і падняўся на ногі:—трэба ісьці, трэба! Дарога вялікая, нагамі маімі нямераная... Дзе мой дом? дзе мой прыпынак?

— Кінь ты!—махнуў рукою Лапко:—мой, мой! От у тым-та і бяда, што ўсё мой ды мой! А мой дзе дом? Усюды, дзе ёсьць людзі... Не-е-е! стой! стой! Злавіў, брат, я цябе Лапко!—раптам схамянуўся муляр і тут-жа стаў выкрываць сваю памылку:—хутары твой дом? Кулакі твае людзі?.. Думай, што гаворыш, Лапко!—пастрашыў ён сябе самога.

— Дом твой—колгас, саўгас, фабрыка, завод, калі ты стаіш на правільнай лініі,—строга зазначыў Лапко і дадаў:

— Іначай сказаць—наш дом там, дзе будуецца соцыялізм.

— А вось ты скажы: Бабура кулак ці не?—пацікавіўся Пракоп.

Лапко пачухаў патыліцу.

— Як табе сказаць? Няма ў мяне на яго цьвёрдага погляду. Адно гаворыць ва мне, што ён—кулак, а другое кажа як-бы і ня кулак.

— Выходзіць, што ён кулак двох з палавінаю пальцаў,—пусьціўся ў жарты Пракоп:—а няхай ты скісьні!

— Не жартуй і ня сьмейся, Пракоп,—азваўся Лапко:—адно я табе скажу: не хацеў-бы я, каб нашы ведалі, што я да яго хадзіў, печ папраўляў. Колгасны брыгадзір—і кулаку печ правіць! Дык

ты, брат, пра гэту печ маўчы! Калі часамі што якое, дык ты кажы—і я буду так гаварыць,—што ты прасіў мяне правесьці на пасёлак. Чаго? ну, ці мала там якая магла быць патрэба? Ты—дэлегат...

— А ты ўжо, калі ласка, пра маё дэлегацтва таксама маўчы, бо які-ж я дэлегат?—Яно калі па справядлівасьці рассудзіць, то чаму-ж я не дэлегат? Сам ад сябе дэлегат! Ат і ўсё!

— Верна!—згадзіўся Лапко:—дэлегат, ну, і дэлегат! Так і запішам. Але пра печ—маўчок! Натура мая, ведаеш... сказаў-бы, ды шаную цябе.

— Ну, што ты ўсё натуру сваю ганіш? Скажу і я табе тое, што і Анэтка казала: каб такія людзі былі, як ты, то лёгка было-б жыць на сьвеце.

— Не, не!—запротэставаў Лапко: не кажы мне гэтага! Трэба быць цьвёрдым. А я—кісель. Хто ні папросіць—не магу адмовіць! Ну, але калі-небудзь і я ўзлуюся! Тады, брат, сьцеражыся!—пагрозіў Лапко.

Падыходзілі да колгасу. Яны трохі працьверазелі. Час быў даволі позны. Толькі ў вокнах Максіма Шахлевіча сьвяціўся агонь.

— От дзе чалавек! галава! Цьвёрды, справядлівы і ўсё па закону... Адміністратар!—хваліў Лапко свайго старшыню.

Выйшлі ў двор. Лапко правёў Пракопа на яго станцыю.

Запыніліся на ганку.

— Дык пра печ маўчок!—ціха сказаў Лапко.

— І пра маё дэлегацтва ні-ні!

На гэтым яны і разышліся.

XXIV

У гэты дзень Максім Шахлевіч быў дужа заняты. Апроч звычайнай штодзеннай работы ў колгасе, а работы заўсёды было даволі, асабліва для такога руплівага старшыні, як Максім, яму прышлося ўдзяліць шмат часу комісіі па абсьледваньні быту ў колгасе. Хоць комісія прышла да найлепшых вывадаў аб становішчы колгасьнікаў, і колгас «Хваля рэволюцыі» быў прызнаны, як узор для другіх колгасаў, тым ня менеў старшыня быў моцна заклапочаны.

Я мушу зрабіць тут адну заўвагу.

Нядаўна я дведаўся з газэты, што ёсьць яшчэ адзін колгас з тым-жа імем, якое носіць і колгас, аб якім ідзе тут гутарка. Каб ня было ніякага непаразуменьня, лічу патрэбным заявіць, што мой колгас «Хваля рэволюцыі»—ня той, што я вычытаў у газэце. Калі і той, газэтны калгас, па-

стаўлен так-жа добра, як і гэты, то я буду дужа ўсьцешаны. А калі ён трохі пакульгвае, то я выклікаю яго на соцспаборніцтва з маім колгасам. «Маім», само сабою, разумець трэба ўмоўна.

Выпадак, навёўшы на Максіма такую заклапочанасьць, на першы погляд можа паказацца малазначным: старшыні стала вядома, што Лапко потайкам даваў сяды-тады сяму-таму колгасны корм тым колгасьнікам, што мелі свае каровы. У колгасе-ж быў заведзены такі парадак, што колгасьнік, меўшы сваю карову, павінен сам прыстарацца і корму для яе. Вялікай бяды ў тым, што колгасьнік прыкорміць колгасным кормам сваю карову, яшчэ ня было-б, калі-б усё гэта рабілася з дазволу, адкрыта і законна. Пры такіх-жа абставінах паступак Лапко ёсьць злачыннасьць, заслугоўвае ганьбеньня і не павінен быць пакрытым. Але аб пакрыцьці тут гаварыць ня прыходзіцца: па-першае, замазваньне розных недахопаў супярэчыла прынцыпам самакрытыкі, бо самакрытыка—тая здаровая глеба, на якой гадуецца і выхоўваецца новы чалавек, і па-другое, гэты выпадак стаў вядомы ў колгасе. Аб ім, між іншым, і ў насьценгазэце «Колгасная Праўда» якую нядаўна выпусьцілі і ўжо вывесілі для чы-

таньня, быў зьмешчан артыкульчык пад загалоўкам «Добрачынна сць ці крадзёж?» Колгасная грамадзкасьць чутка сачыла за ўсякімі праявамі непарадкаў у колгасным жыцьці.

Старшыні было прыкра, што ў колгасе маюць месца такія выпадкі, і самае важнае тое, што вінаватым аказаўся Лапко, відная ў колгасе фігура. Што тут Лапком кіравала не злачынства, а пакладзістасьць і мяккасьць яго натуры, для старшыні было ясна, але факт трэба браць такім, як ён ёсьць.

У праўленьні колгасу была ўжо гутарка аб Лапковым учынку. Ставілася пытаньне, як адгукацца на праступак Лапка. Член праўленьня, намесьнік старшыні, т. Ваган, стаяў за тое, каб ня выносіць учынак Лапка на шырокую колгасную грамадзкасьць, а зрабіць яму ад імя праўленьня і партыйнай ячэйкі вымову, строгую вымову з папярэджаньнем. За гэтую меру кары стаялі яшчэ тры члены праўленьня: Марына Палеха, Мікола Гнох і комсамолец Гаруй. Але старшыня самым катэгарычным чынам выступіў супроць.—Вы, таварышы, не даацэньваеце факту,— абурана заявіў ён:—такая мера спагнаньня ёсьць ня што іншае, як замазваньне праступку, зводзячы яго на мёртвае канцылярскае

ўсчуцьцё. Ня трэба забываць, што ў нас ёсьць сотні колгасьнікаў, а сярод іх ёсьць такія, што сваімі карэньнямі стаяць у мінулым, не пазбыўшыся старых замашак. І справа тут ходзіць не аб адным Лапку, але і аб асобах, дачынёных да гэтай справы. Я цьвёрда стаю і буду стаяць на тым, каб яе вырашаць не ў праўленьні, а на агульным сходзе колгасьнікаў.

У якасьці аргуманту быў прыведзен і Пракоп, чалавек пастароньні, які зьяўляецца сьведкаю прыкрай падзеі ў іх колгасе. Дык ня інтарэсамі Лапко тут трэба кіравацца, а інтарэсамі колгаснага колектыву і ня толькі іхняга, а і наогул.

Процію довадаў старшыні трудна было штонебудзь сказаць, ня рызыкуючы зьбіцца з правільнай лініі. З ім згадзіліся ўсе і пастанавілі склікаць сход колгасьнікаў. Сход быў назначан на заўтрашні вечар.

Правёўшы Пракопа, Лапко памаленьку сунуўся колгасным дваром, бяручы кірунак на свой знамяніты будынак. Яму проста было прыемна прайсьціся каля яго лішні раз. Абагнуў яго з левага боку. Гучней заскрыпеў пад нагамі сьнег і павольней рабіўся Лапкоў крок, калі праходзіў ён каля акон кухні, дзе мела кватэру Таклюся.

І гэты выяўна падкрэсьлены скрып сьнегу пад нагамі Лапка, і замаруджаны крок яго, і кашаль, што вырваўся з грудзей, калі Лапко параўноўваўся з вокнамі кухні,—усё гэта сьведчыла аб тым, што не адно толькі жаданьне лішні раз палюбавацца творам сваіх рук і галавы прывяло сюды майстра—былі і іншыя прычыны прайсьціся тут і нават запыніцца на кароткі час: Лапку здалося, што ў праразі цёмнага акна якбы нешта мільгнулася і чыйся няясны абрыс прыпаў да шыбы, на дзьве траціны заложанай марозам Лёгкі стук у шыбу сыгналізаваў Лапку, што ён апазнаны. Лапко азірнуўся па бакох і падаўся бліжэй да дзьвярэй. Трошкі пастаяў тут. Дзьверы зараз-жа адчыніліся, і Лапко ўвайшоў у кухню.

— Ня сьпіш яшчэ?—

— Не, ня спала... Нічога ня чуў?

Пытаньне было пастаўлена ў такім тоне, што прымусіла Лапка здрыгануцца.

— Не, ня чуў. А што?

Таклюся момант маўчала.

— Прыкрая справа, Пятрусь!

Два комплексы прадстаўленьняў у кароткі міг пранесьліся ў яго галаве: ці ня здарылася чаго

з скаціна? ці ня стала ўжо вядома, што ён быў на хутары?

— Ну?—у Лапковым голасе была трывога, і ён чакаў, што ўсплыве тут на верх: хлеў ці хутар?

— У насьценгазэце пра цябе напісалі, што ты—шкоднік: разбазарваеш колгасны корм.

У Лапка адлягло ад сэрца.

— Як разбазарваю?

— А даеш таму, каму ня маеш права даваць.

— Ну, гэта глупства,—стаў трохі храбрыцца Лапко.

— А хіба ты нікому не даваў?

Па голасу заметна было, што Таклюся хацела пачуць ад Лапко адно толькі—не!

Лапко-ж мусіў прызнацца, што корм ён даваў. Ну, але-ж які гэта праступак, што ён дасьць калі-ні-калі мяшок сечкі ды прысыпле з прыгаршчы аўса?

— Ты, Пятрусь, як малое дзіця,—сказала ў засмучэньні Таклюся і нават уздыхнула.

— Каб я карысьць меў якую-небудзь з гэтага, ну, то іншая справа,—стаяў на сваім Лапко.

— Ну, але-ж даваў-жа ты потайкам?

— Да ня ўжо-ж тут бюрократызм разводзіць з-за жмені сечкі?— яшчэ храбрэй заўважыў ён.

— А хто ведае, што ты даваў і колькі даваў? Ты мяркуеш так, а людзі глядзяць іначай. Шахлевіч страшна абурыўся (Лапка пачаў забіраць страх), хацелі абмежавацца вымоваю, а ён паставіў гэта на агульны сход колгасьнікаў. Заўтра вечарам сход будзе.

Лапко раздумліва чухаў патыліцу.

— Натура мая паганая! Хоць-бы не даведаліся яшчэ, што на хутары быў, печ Цімоху правіў... Не, годзі: больш мяне ня ўпросіш, хоць разарвіся!—цьвёрда заключыў Лапко.

XXV

І на гэты раз абудзіўся Пракоп рана. Ён прыпамінаў падзеі ўчарашняга вечара, пачастунак у Бабуры, разважаньні яго аб колгасе. «Хітры бэстыя, і нешта мае на ўме», падумаў сам сабе Пракоп: «Цьвярозы гаворыць за колгас, але калі-б ён зьеў тое, што думае пра колгас, то да вечара не дажыў-бы! Выпіўшы, пачаў трохі перагаворвацца. Адна толькі праўда яго, што ў колгасе траціць кулак». Нарэшце ўспомніў Пракоп і аб тым, што ён за лішняю чаркаю прызнаўся ў сваім фальшывым дэлегацтве. Ня варта было гаварыць гэтага: карысьці нікому ня будзе,

а сабе пашкодзіць можа. Пракопу стала сорамна. І яму прыкра была гэта выдуманая роля дэлегата сярод сумленных і чэсных работнікаў. Але ён заспакоіў сябе на тым, што век тут векаваць ня будзе, і час падумаць яму, што рабіць далей. Ясна адно: трэба ісьці, але куды?

Гэта «куды» ўстала цяпер перад Пракопам са ўсёй вострасьцю і ў поўнай велічы. Як-бы загадзя вырашаючы адказ на балючае запытаньне, перад ім ясна-ясна ўстала яго вёска, сям'я, гаспадарка, пакінутая ім на раскрыжаваньні старых і новых дарог сялянскага жыцьця. Што-ж робіцца цяпер там? Колектывізацыя не палохала яго ўжо так, як раней. Ён думаў аб тым, як-бы гэта было добра, калі-б і там завесьці такі-ж колгас, як і тут.

Ня спыніўшыся ні на якой цывёрдай мысьлі, Пракоп адзеўся і пасунуўся на двор. Надвор'е было ціхае. Хоць неба было яснае, але мароз адпаў. Адчувалася прадвесьне. Пракопа мацней пацягнула да дому. Ён стаў тварам у той бок, дзе, як здавалася яму, была яго вёска, і стаяў, аглядаючы прасторы. Перад ім паказалася постаць чалавека. Пракоп зірнуў і пазнаў Лапка. Рушыў яму насустрач.

— Здароў Лапко!—ветла паздароўкаўся ён.

— Здароў!.. Куды так углядаўся?

— А думаю ў дарогу рушыць.

— Што-ж так сьпяшаешся? пажыві яшчэ ў нас.

Пракоп зірнуў на Лапка. І выгляд яго і голас, як паказалася Пракопу, былі не такія, як звычайна. У яго закралася падазрэньне, ці не даведаліся тут, што яны былі на хутары, чаго так баяўся Лапко.

— Ну, што чуваць?—запытаў Пракоп.

— Заўсёды на сьвеце што-небудзь чуваць,— крыху здалёку зайшоў Лапко і потым ужо бліжэй падступіў да справы.

— Нічога ня чуў?

— Не!

Пракоп ў сваю чаргу з трывогай зірнуў на Лапка і са страхам чакаў навіны. Лапко, ня ўтойваючы нічога, увёў Пракопа ў курс справы. Для Пракопа цяпер зусім стала ясна, што ён не памыліўся, разважаючы аб постаці чалавека з мяшком. Але калі ўчора ён хацеў знайсьці якую-небудзь пляму ў жыцьці колгасу, то цяпер ён шчыра хацеў, каб гэтых плям тут ня было. Перад ім разгортвалася новая старонка ў кнізе колгаснага жыцьця, ставячы яго перад магчымасьцямі шырэй і глыбей убачыць гэта жыцьцё.

Яму толькі дужа было шкода, што гэтую старонку разгортвае сабою Лапко, якому ён спачуваў ад усяго сэрца. Хацелася дапамагчы яму выблутацца з гэтай прыкрай справы, параіць, як сябе трымаць на сходзе, што казаць. Але Пракопавы парады засноўваліся на хітрасцях зайца, што заблутвае свае сьляды—старая тактыка старой юстыцыі. Для Лапка яна не падыходзіла.

Сход пачаўся роўна а восьмай гадзіне ўвечары. Прасторны клюб рэдка калі бачыў такі поўны збор колгасьнікаў. Уся колгасная грамадзкасьць была прадстаўлена багата: старыя, маладыя, людзі сярэдніх лет, жанчыны, падлеткі мужчынскага і жаночага роду запаўнялі і лаўкі і праходы.

Лапко, няпрыдатны герой сёнешняга дня, заняў месца бліжэй да сцэны. Сядзець у сярэдзіне ці ззаду і бачыць увесь час, як на цябе паглядаюць, было проста нязручна і няпрыемна. Яшчэ больш укрытае меса заняла Таклюся. Было заметна, што справу Лапка яна прыняла блізка да сэрца і хвалявалася ня менш за яго, бо Лапко быў спакойны, нівічым ня выказваў свайго хваляваньня, можа толькі бровы яго трохі ніжэй спусьціліся над вачамі. Пракоп сеў

ззаду, непадалёку ад Лапка. Ён хацеў быць поруч з ім, але некаторыя меркаванні не дазвалялі зрабіць гэтага.

Над узвышкам, дзе зьмяшчалася сцэна, а цяпер стаяў стол для прэзыдыуму, гарэла вялікая лямпа, і там было даволі сьветла, увесь-жа клюб затапляўся ў слаба асьветленай цемнаце.

Лапко сядзеў нярухліва, павярнуўшы голаву ў бок сцэны, дзе вось-вось павінен зьявіцца старшыня і адкрыць сход. Лапковы вочы запыніліся на портрэце Леніна. Гэты портрэт выступаў цяпер у новым для Лапка асьвятленьні. Ён зьвярнуў увагу на гэты мудры, удумлівы, крыху прыжмураны погляд, трохі насьмешлівых, але строгіх вачэй, пазіраўшых паўзьверх галоў многамільённых мас, правадыром якіх ён зьяўляецца, і азіраўшых тое, чаго ня ведаюць і можа яшчэ няясна прадстаўляюць яны.

Але на сцэне паказаўся старшыня. Шум галасоў, поўніўшых клюбу, адразу стаў радзець і зараз-жа сьціх, толькі некалькі хвілін глуха тухкалі ногі, пакі не паселі ўсе ці не занялі найболей выгодных для сябе позыцый.

Для парадку і ўжо па сходаўскай традыцыі старшыня пазваніў. Заля замерла.

— Агульны сход колгасьнікаў абвяшчаю адкрытым,—урачыста і гучна зазьвінелі словы старшыні:—членаў праўленьня прашу заняць месца ў прэзыдыуме.

Непарушная цішыня стаяла ў залі клюбу. Праўленьне было ў поўным зборы.

— Таварышы! сёняшні сход—сход, так сказаць, непрадбачаны, выпадковы. Праўленьне колгасу пастанавіла склікаць вас з поваду вядомага вам артыкулу ў нашай «Колгаснай праўдзе»... Ці трэба зачытаць яго?—запытаў старшыня.

— Ведаем, чыталі!—загуў сход.

— А калі хто ня ведае, дык даведаецца з далейшага,—пачуўся адзінокі голас.

— Я коратка афармлю, таварышы, сэнс гэтага артыкулу,—казаў старшыня далей:—у нашым колгасе, як пішацца ў артыкуле, выяўляецца нездаровая зьява, на якую мы не павінны і ня маем права заплюшчваць вочы. Дык вось мы і павінны абсудзіць гэтае пытаньне і зрабіць усё ад нас залежнае, каб такія і ўсякія іншыя нездаровыя зьявы ня мелі больш месца ў колгасе.

— А хто пісаў гэты артыкул?—запытаў хтось з колгасьнікаў.

— Калі выявіцца тут, што напісанае ў артыкуле—ня праўда, тады я скажу, хто пісаў,—быў адказ старшыні.

— Другіх пытаньняў ня будзе?

— Не!

— Дык хто, таварышы, хоча ўзяць слова па сутнасьці артыкулу?

Пастаноўка пытаньня была ня зусім ясная. Ні Лапко, ні яго хаўрусьнікі тут не ўпаміналіся. Проста як-бы трохі было няёмка называць імя ўсім вядомага Лапка. У гэтым быў грэшан і сам старшыня. Але так было толькі спачатку.

XXVI

Пасьля кароткай і няпрыемнай у такіх разох замінкі і паўторнага запытаньня старшыні, хто хоча выказацца, падняўся Сымон Таркевіч.

Таркевіч рабіў ураджаньне сярдзітага чалавека. Бровы яго пераважна былі нахмураны, меў звычай бубніць і прыгавараць: «Ці гэта парадак?» А калі ён зьбіраўся гаварыць большменш доўга, то шоргаў правым пальцам па два разы па адным і па другім боку свайго носа, ўцягваючы ў сабе паветра. Так зрабіў ён і цяпер, «намянціў нос», як казалі пра яго людзі.

— Як тут выказваць?—сярдзіта запытаў Таркевіч:—трэба наўперад ведаць, што гэта за сход: ці гэта чыстка, ці суд? А то ня ведаю, як прыступіць... Ці гэта парадак?

— Мне здаецца, што пытаньне стаіць даволі ясна,—адказаў старшыня:—сход павінен сказаць сваё слова і вынесьці пастанаўленьне аб учынку т. Лапка і тых таварышоў-колгасьнікаў, што былі з ім у згаворы—Мулейкі і Ступіка. Ці мелі яны права рабіць вось так, як значыцца тут,—старшыня паказаў насьценгазэту, што ляжала тут-жа на стале,—ці не?

Тады слова ўзяў колгасьнік Мікіта Ганчар.

— Таварышы! мы добра ведаем т. Лапка. Гэта—наш лепшы колгасьнік, чалавек без усялякіх хітрыкаў, сумленна працуе на колгас. Ён-жа, можна сказаць, сваімі рукамі пабудаваў склеп і кухню... Дзе вы знойдзеце такога чалавека? Дык што аб ім казаць? Які праступак ён зрабіў? Што выдаў некалькі мяшкоў сечкі? І каму? сваім-жа колгасьнікам. Але я запытаюся: колгасная, абагуленая скаціна, якую даглядае Лапко, пацярпела ад гэтага ці не? У якой меры гэтыя некалькі мяшкоў няшчаснай сечкі адбіліся на запасах колгаснага корму? Вось, т. т., што трэба ўлічваць, калі мы гаворым

сёньня аб Лапку. Што-ж на чалавека накідвацца адразу...

— Тав. Ганчар! ніхто не накідваецца на т. Лапка,—заўважыў старшыня.

— Да мы і ня ведаем, колькі выдана гэтай сечкі: можа мяшок, можа два. Няхай сабе дзесяць, ну, дык што-ж! Прадаваў ён яе? грошы браў за гэта?.. Скажы, Лапко, дзе ты там сядзіш? многа ты наскладаў за гэтую сечку грошай?

— Старшыня зноў зрабіў увагу прамоўцу.

— І ніякага тут згавору ня было,—адвакатаваў далей Ганчар:—папрасіў чалавек сечкі карове, ну ён і даў. Мы павінны тут сказаць, каб такіх выдач больш ня было, і іх ня будзе. Вот і ўсё!

З вялікім задавальненьнем, з асалодаю, можна сказаць, слухаў Пракоп гэту прамову. Калі прамоўца кончыў, ён быў ужо шырока разгарнуў рукі, каб адпаведна гэтай шырыні пляснуць далонямі. Але ў залі ня было падтрыманьня, і яго рукі, ня пляснуўшы, зноў зашыліся ў рукавы кажуха. Зірнуўшы на прэзыдыум, Пракоп запыніўся на старшыні: ясна было відаць, што прамова Ганчара нядобрае зрабіла на яго ўражаньне.

— Хто яшчэ, т. т., хоча выказацца?..

— Няхай скажа сам Лапко,—пачуўся голас ззаду.

— Тады, т. т., дазвольце мне,—узяў слова сам старшыня.

— Гэта праўда, т. т., Лапко мае вялікія заслугі перад колгасам, як і шмат хто з іншых таварышоў-колгасьнікаў, і ніхто гэтых заслуг ад яго не адбірае. Але, т. т., ня ў гэтым справа. Пытаньне трэба ставіць так: ёсьць парушэньне парадку ў колгасе ці не? Ёсьць!—падкрэсьліў старшыня:—факт праверэны. Але гэтага мала: колгас, т. т., не багадзельня і не скарбонка, адкуль дабратою таго ці іншага таварыша, у даным выпадку т. Лапка, будуць браць колгаснае, аграмаджанае дабро для задавальненьня ўласьніцкіх патрэб. А гэта, т. т., чым пахне? Спрыяе гэта колгаснаму росту? Падымае яно аўторытэт колгасу? Служыць гэта на карысьць самай ідэі колектывізацыі, ажыцьцяўленьне якой паставіла партыя і савецкая ўлада? Тав. Ганчар пытаў, ці многа наскладаў т. Лапко прошай за сечку. Я лічу ганебным такое пытаньне ў вуснах колгасьніка! Я ўпэўнены, як і большасьць з вас, калі ня ўсе вы, што не карысьць кіравала тут т. Лапком,—сход шумна далучыўся

да думкі старшыні,—але давайце разьбяром і дабрату т. Лапко.

Лапко заварушыўся за выступам сьцяны: у гэты час ён, як можа ніколі, праклінаў сваю дабрату.

А старшыня бяз жалю аналізаваў яе.

Т. Мулейка і Ступік маюць па карове. Добра: колгасны парадак дазваляе гэта. У іх, аказалася, бракуе корму. Яны ідуць да т. Лапка, просяць, Лапко цішком дае ім, у Лапка добрае сэрца. Таварыш Лапко! зьвярнуся і я да цябе: ці думаў ты, даючы ім корм, над тым, чаму ў іх корму раптам ня стала? Ці запытаўся ты ў іх аб гэтым? Можа-б яны табе сказалі, што свой корм яны тайком прадавалі? Як-жа ты мяркуеш: чаму служыла твая дабрата, таварыш Лапко? Вось, т. т., у чым сэнс і значэньне гэтага факту, і мы павінны кваліфікаваць яго, як зьяву нездаровую і ня толькі гэтак расцэньваць, а і ў ніякім разе не дапускаць яго, бо гэта ёсьць пачатак развалу колгасу, гэта—ігра ў руку кулаку! Гвалтам нікога мы ня трымаем у колгасе.

Апошнія словы былі адрасаваны Мулейку і Ступіку. Лапко, Таклюся і Пракоп, Мулейка і Ступік і шмат хто з колгасьнікаў слухалі гэту

прамову з апушчанымі галовамі, а на гэта ў кожнага былі асабістыя прычыны.

Сваім выступленьнем старшыня даў моцную зарадку сходу. Чулася непераможная праўда і сіла яго логікі. Яго прамова мела бясспрэчны ўплыў на выступленьне іншых прамоўцаў, хоць усе яны імкнуліся знайсьці нешта сярэдняе паміж двума першымі прамовамі.

Але самую горкую пілюлю паднёс Лапку, а разам з ім і Пракопу, той-жа сярдзіты Таркевіч.

Ён з асабліваю энэргіяй паторгаў свой нос, так што ўсе зьвярнулі на гэта ўвагу і з некаторым страхам за Лапка чакалі прамовы.

— Зусім правільна т. т.,—спакойна пачаў Таркевіч, а гэта азначала, што ў яго прыпасены нейкі моцны аргумант-даўбешка,—падышоў да пытаньня наш старшыня. Мы цяпер бачым, куды можа павесьці чалавека дабрата—старшыня давёў гэта ясна. Ці-ж гэта парадак? І старшыня, т. т., не памыліўся... Па дабраце сваёй наш брыгадзір, прыкладны колгасьнік з вялікімі заслугамі перад колгасам, таксама хадзіў і на хутар да кулака Бабуры, што нам некалі жнярку падараваў, ведаючы, што яе ўсё роўна забяруць ад яго. І хадзіў наш т. Лап-

ко не далей, як ўчора. І што-ж вы думаеце ён там рабіў? Правіў печ кулаку! Чарано, бачыце, правалілася. Хто-ж яму, бачыце, паможа?—з едкім сьмехам запытаў Таркевіч і сам адказаў: Ну, вядома: наш добры т. Лапко! Ці-ж гэта парадак? Такую дабрату вытручваць трэба. Я пашоў-бы печ кулаку правіць? Да няхай яго шэсьць разоў халера задушыць!—сярдзіта кончыў Таркевіч.

Да пералічаных ужо апушчаных галоў далучылася цяпер і чубатая галава комсамольца Гаруя.

Страшныя мінуты перажываў у часе гэтай прамовы і наш «дэлегат». З аднаго боку страшна было за сваё дэлегацтва, з другога—трэба было заступіцца за Лапка. Яму раптам як-бы нешта стрэліла ў голаву.

— Дазвольце мне слова!

У гэты момант Пракоп ня помніў нічога, у вачох завіўся туман, але ён узяў сябе ў рукі.

— Таварышы! Як у тут ёсьць чалавек пастароньні, то... можа мне і ня трэба ўмешвацца... Агледзіў я ваш колгас. Скажу—дай божа ўсім добрым людзям такі колгас...

Мысьлі яго блуталіся, але ён учапіўся за

слова «добрым», успомніў, што за дабрату крыюць Лапка.

— Гэта мая віна, т. т., што т. Лапко хадзіў на хутар, Прызнаюся вам, т. т., што я хацеў пачуць, як людзі збоку гавораць пра ваш колгас. Мне хацелася ведаць усё: і ваш моцны бок, і слабы. І я павінен сказаць вам, што калі ў колгасе парадак, лад, такі, як у вас, што калі колгас моцна стаіць на нагах, як у вас ён стаіць, то ніякі кулак не зганьбіць яго. Дык гэта я, таварышы, папрасіў, падбіў Лапка схадзіць са мною, бо я-ж тут дарог ня ведаю. Я пайду дамоў, буду расказваць пра ваш колгас, буду гаварыць усім, каб ішлі ў колгас. І нашы колгасьнікі прыдуць вучыцца ў вас. І каб засталася добрая памяць аб вашым колгасе, я прашу вас, таварышы, ня ставіць у віну таварышу Лапку, што ён хадзіў на хутар. Няхай гэта віна ляжа на мяне.

Ніколі ў жыцьці не гаварыў Пракоп такой доўгай прамовы. Ногі яго дрыжалі, у грудзях было горача, і пот выступіў у яго на лбе. Затое-ж яму папляскалі—ці то, як чужому чалавеку, ці за добрыя словы аб колгасе, ці то за гарачую абарону Лапка, і Пракоп адчуў, як высока ўзьняўся яго ўласны дух.

Апошняе слова сказаў сам Лапко, і яму

прышлося выйсьці з свайго кутка на трыбуну. Лалко быў зусім спакойны, і прамова яго была нядоўгая.

— Усё гэта, таварышы, праўда, у чым тут абвінавачвалі мяне, і я шчыра дзякую таварышам за праўдзівыя словы. Натура мая,—тут Лапкоў голас загучэў злосьцю:—паршывая натура! Але я зламлю яе!.. Праўда і тое, што гаварыў наш госьць, т. Пракоп, але ня ўсю сказаў ён праўду, я і без яго зьбіраўся на хутар. Толькі тут нашы дарогі супалі, і я нават меркаваў прыкрыцца т. Пракопам, бо я ведаў, што колгасьнік не павінен вадзіць компаніі з пасялкоўцамі. Дык я, таварышы, прызнаюся ў сваёй віне, і мне будзе лягчэй на сэрцы, калі вы так ці іначай пакараеце мяне за гэта!

Пастанавілі—зрабіць Лапко вымову, а Мулейку і Ступіку здаць сваіх кароў у колгас, калі самі яны хочуць астацца ў колгасе.

Вечарам, калі скончыўся сход, а Лапко і Таклюся асталіся ўдваіх, дык вось што сказала яму Таклюся, пагаварыўшы наперад аб сходзе:

— А чаму-б, Пятрусь, нам не запісацца?

Пытаньне гэта дужа кранула Лапка.

— Ты мяне шкадуеш, Таклюся? Твае словы—дарагія для мяне словы—запішамся.

XXVII

Мяккая, утульная і лагодная сінеча-смуга тонкаю покрыўкаю засьцілала лясы, што цёмнымі рысамі значыліся па краёх далёкага кругу сьнежнага прастору. А над гэтым прасторам разгортвалася бяздоньне яснага прадвясеньняга неба. Адчувалася воля і радасьць, поўная і шырокая, як і гэтыя прасторы неба і зямлі, атуленыя цішынёю і сонцам.

Пракоп ішоў памалу, разважліва аглядаў сюды туды дарогу перад сабою, а часамі прыпыняўся на кароткі час, пазіраў назад, адкуль ён нядаўна рушыў у дарогу. Колгас «Хваля рэволюцыі» ўжо чуць-чуць значыўся на белым полі цёмнымі кропкамі сваіх будынкаў. Постаці колгасьнікаў, іх справа, якую робяць яны, інтарэсы, якімі яны жывуць,— усё гэта зьлівалася ў адзін суцэльны комплекс уражаньняў, пакінуўшых глыбокі адбітак у Пракопавай душы, і навявала на яго лёгкую журботу з прычыны разьвітаньня з гэтым колгасам.

Прайшоўшы яшчэ з вярсту, Пракоп ізноў спыніўся. Дарога падышла да самага лесу, пралёгшы прыгожым завіткам па правым яго баку. Каля самае дарогі стаяў густы зялёны хвойнік, а

трошкі далей старыя стромкія хвоі, узносячы над ім курчавыя верхавіны, так весела песьціліся на сонцы, і такі быў тут прывабны зацішак, што Пракоп ня мог не паддацца жаданьню прысесьці на гладка сыпіванным пні і трошкі пагрэцца на першым цяпле яшчэ ўсё-ж такі зімняга сонца. На ўгрэве каля шурпатых камлёў разложыстых хвоек і пад хвойкамі раставаў сьнег, і мясцамі сям-там выбіваліся з-пад сьнегу жоўтыя плямы пясчанай зямлі, мёртвыя цыбуры пабітых марозам красак і засохлыя вусікі леташняй травы.

Даўно не адчуваў Пракоп такой лёгкасьці, такога спакою душы, як цяпер. Было так лёгка, як-бы з яго плеч зваліўся нейкі цяжар, і ён памаладзеў на цэлых дзесяць гадоў. Ці то гэты першы дзень цяпла, прадвесьнік вясны і абуджэньня жыцьця, ціш і шырыня вольных прастораў спрыялі такой лёгкасьці і спакою сэрца, ці яшчэ іншыя прычыны, Пракоп ня ведаў. Яму проста было лёгка і добра, і ён некалькі разоў казаў сабе: «Годзі цягацца, лавіць ветра ў полі, шукаць немаведама чаго». Усе падзеі апошняга часу, увесь клопат і згрызоты яго, дабравольнае вырачэньне свайго дому, бадзяньне ў дарогах і гэты сьлізкі і няпэўны шлях дробнага ашукан-

ства, на які стаў ён, і неакрэсьленасьць яго ролі,—усё гэта ўставала перад ім, як прыкры сон, як нейкая цяжкая хвароба, ад якой ён стаў ачуньваць. І калі ў Пракопа і былі яшчэ хістаньні, то ўчарашні вечар, сход, дзе разьбіралася справа Лапка, быў паваротным пунктам ў Пракопавым жыцьці, прымусіўшы паглядзець на яго другімі вачамі. І што асабліва ўрэзалася ў памяць Пракопу, дык гэта Лапко і яго праўдзівае прызнаньне, і той прысуд, які вынесен быў яму сходам колгасьнікаў. Над гэтым сходам Пракоп многа думаў. Спачатку ўсё гэта паказалася яму дзіўным, але калі ён узважаў усё аргуманты за і проціў і ўспомніў пры гэтым, якую ролю адыграў у яго бадзяньні Чыкілевіч, то ён мусіў прызнаць праўду і глыбокі сэнс такіх сходаў у формаваньні новага чалавека ў новых формах яго быту.

З іншымі мысьлямі, з іншым настроем вароча ўся Пракоп у Затоньне. Ён там раскажа, як жывуць людзі ў добрых колгасах. Ён растлумачыць і прычыну свайго зьнікненьня, нават прызнаецца, што ён выдаваў сябе за дэлегата: свайго дэлегацтва Пракоп ня судзіў строга, бо яно вывела яго на правільную дарогу.

А што-ж рабілася далей у Затоньні?

Пасьля таго, як Чыкілевіч выскачыў, як апараны з Пракопавай хаты, а каля парогу ляжаў разьбіты абраз, сьвяты Мікалай Мірлікійскі, паміж Таццянаю і Мікітам была такая гутарка.

— Што ты нарабіў, сынок?

Мікіта быў сур'ёзны і, злосьць яго яшчэ не астыла, але ўсё-ж такі ён меў выгляд чалавека, адзяржаўшага вялікую перамогу.

— А што-ж ён мне пагражае богам ды яшчэ смаркачом называе!.. Бацьку зьвёў, а цяпер прыходзіць спачуваць і адгаварваць ад колгасу!.. Сволач кулацкая!

— Ну, як-жа ты абразом кідаешся? што людзі скажуць?—страх і трывога чулася ў Таццяніным голасе, і яна нагнулася над абразом. Шкло пабілася на друзачкі. Абраз ляжаў тварам да зямлі.

— Чорт яго бяры! Калі ён падымецца сам, то я тады скажу, што ён сьвяты,—заўважыў Мікіта.

— Не даруе ён табе гэтага—помсьціцца будзе.

— Хто будзе помсьціцца?

— Чыкелевіч!

— А я думаў—сьвяты Мікалай... Няхай

помсьціцца. Пагледзім яшчэ, што з гэтага выйдзе,—задаёрыста адказаў Мікіта.

Ну, зусім ён быў мужчына!

Маці падабрала друзы шкла.

Куды-ж цяпер падзець сьвятога Мікалая? Вешаць яго ізноў на сьцяну бяз шкла і пасьля таго, як ён быў здорава ашальмован, было нейк проста нязручна. Нават сьвятым, што яшчэ віселі на сьцяне, наўрад цы было-б цікава аставацца з ім у адной компанії.

Тацяне было трохі прыкра ад Мікітавага ўчынку. У глыбіне яе душы туліўся страх, што гэты ўчынак можа наклікаць якое-небудзь няшчасьце, яшчэ горшае за тое, што ўжо налучыла іх. І яна дала сабе абяцаньне, што калі вернецца Пракоп, то яна няпрыменна зашкліць сьвятога Мікалая і павесіць яго на старое месца. Яна ціхенька вынесла абраз у камору і перш, чым схаваць яго, у мысьлях папрасіла прабачэньня ў сьвятога Мікалая і пацалавала яго ў худашчавы твар.

Мікіту-ж мала цікавіў цяпер сьвяты Мікалай. Мысьлі яго былі заняты зусім іншым. А калі маці вярнулася з каморы, то ён сказаў:

— Трэба нам падаць заяву аб уступленьні ў колгас.

Таццяна пасьля ўсіх гэтых падзей зусім бязудзельна прыняла гэтыя словы.

— Як сабе хочаш,—даволі спакойна адазвалася яна і ўздыхнула.

Мікіта маўчаў, а маці дадала:

— Можа-б трохі счакаць. Паглядзім, як і што будуць рабіць людзі.

Тады Мікіта самым катэгарычным чынам запярэчыў мацеры:

— Чакаць тут якраз і ня можна. Пакі мы будзем чакаць, гэты кулачэчына будзе весьці сваю работу, выкарыстае бацьку на ўсе сто процантаў. А потым нас будуць вінаваціць, што мы—прычына развалу колгасу. Калі бацька зрабіў памылку, то мы павінны яе выправіць. Ды бацька-ж і не пярэчыў нам уступаць у колгас.

Калі Мікіта ішоў у праўленьне колгасу, учора толькі абранае і яшчэ ня прыступаўшае да работы і таксама зьбянтэжанае, ён сустрэў на вуліцы Чыкілевіч, хоць і паказаў від, што не заўважыў яго. Чыкілевіч правёў Мікіту злосным вокам... «У, шчанюк!»—працадзіў ён скрозь зубы.

Мікіта доўга блутаўся па затонскіх хатах,

пакі не знайшоў старшыню праўленьня, Лукаша Гулака. Гулак—чалавек сярэдніх лет, маламоцны серадняк. У яго хаце таўклося ўжо чалавек з дзесяць затонцаў і Марыніч у тым ліку. Гулак быў узрушаны і меў выгляд сярдзітага чалавека. Відаць, угневілі яго. Усё са зьдзіўленьнем паглядзелі на Мікіту. А Мікіта адразу прыступіў да справы:

— Запішэце мяне і маю матку ў колгас!

Гулак грозна зірнуў на мужчын, а потым на Мікіту, і тады яго твар праясьніўся. Ён зноў павярнуў сваю галаву ў бок мужчын і сказаў:

— Ну? Яшчэ чарніла ня высахла, а вы ўжо прышлі выпісвацца. Вот вам прыклад, дуракі вы!

— А чаго-ж яго бацька зьбег?

А Мікіта сказаў:

— Бацька, выходзячы з дому, сказаў нам, каб мы запісваліся. А калі вы паслухалі Чыкілевіча, то гэта ваша справа. Але чакайце— найдзем мы ўправу на Чыкілевіча!

— Малайчына, яй-богу малайчына!

І Гулак па-прыяцельску пахлопаў Мікіту па плячы.

XXVIII

Падаўшы заяву аб уступленьні ў колгас—заява была падана ад яго і ад Таццянінага імя,—Мікіта пачуў, што ён выпаўніў вялікі грамадзкі абавязак, і яму стала адразу лягчэй. Па-першае, ён гэтым падтрымаў старшыню колгасу: старшыня быў зьбіты з нагі і знаходзіўся, можна сказаць, на грані адчаяньня з прычыны паводзін колгасьнікаў, прышоўшых выпісваць з колгасу. Члены-ж праўленьня пахаваліся, пакінуўшы ваяваць аднаго старшыню. Па-другое, сваёю заяваю Мікіта ў значнай ступені паспрыяў заспакаеньню таго разброду, што пачаўся паміж затонцамі ў сувязі са зьнікненьнем Пракопа і хітрымі Чыкілевічавымі падходамі, накіраванымі на разбурэньне колгасу.

За кароткі час Мікіта, як бачым, дабіўся значных перамог. Адны толькі яго перамогі над Чыкілевіч чаго варты! Калі Мікіта ўспамінаў, як вытурыў ён гэтага васпана з хаты, то гордасьць яго прымала вялікія разьмеры. І толькі адна акалічнасьць засмучала Мікіту і зацямняла радасьць яго перамог: што стала з бацькам? Куды ён пашоў і на што наважыўся? Гэтая пытаньні заставаліся цёмнымі і неразгаданымі і

значна зьніжалі яго настрой. Яны, Таццяна і Мікіта, ня раз абмяркоўвалі гэту праяву з Пракопам і нарэшце па сталым разважаньні прышлі да думкі, што Пракоп ва ўсякім разе ня зробіць аднаго — на самагубства ня пойдзе: аб гэтым сьведчылі ўсе яго паводзіны. Яго зборы ў дарогу і тыя рэчы, што захапіў ён з сабою, і тыя словы, што сказаў ён, пакідаючы дом.

Такая думка іх трохі заспакоіла.

— Напішы ты, сынок, Андрэю,—успомніла пра сына-чырвонаармейца Таццяна:—трэба даць знаць яму,—як ён паглядзіць на гэта? Усё-ж такі ён старэйшы. А можа яго і з войску пусьцілі-б, хоць на кароткі час,—раздумліва казала далей маці:—што-ж мы тут будзем рабіць самі?

Ноткі журботы чуліся ў яе голасе.

Так: маці гаворыць праўду—Андрэю напісаць трэба! Мікіта проста выпусьціў гэта з памяці. А вось наконт таго, што яны будуць самі рабіць, дык Мікіта меў свой погляд: работы ён не баяўся і ведаў, што ўтрэба рабіць—у яго было тут сваё меркаваньне. Дайце толькі яму разгарнуцца.

Пісьмо Андрэю Мікіта пастараўся напісаць як наймудрэй, каб не скасавацца перад братам, не ўраніць свае гордасьці ў яго вачах. Але ён

трохі перастараўся, што і адбілася на яго пісьме. Трохі вінавата была і сямігодка, мала адводзіўшая месца і ўвагі, каб навучыць сваіх вучняў пісаць.

Мікіта пісаў:

«Дарагі наш брат Андрэй, а таксама і сын!

Піша табе Мікіта і маці твая Таццяна. У першых строках пісьма мы жывы і здаровы, чаго і табе жадаем. У нас нічога новага няма, за выключэньнем, што вот пачалася колектывізацыя. Але ня ўсё яшчэ ў нас добра. Каторыя беднякі і серадняки, як ёсьць несьвядомыя, мала разьбіраюца ў энтузіязьме соцыялістычнай рэконструкцыі, а больш слухаюць таго, як сыпяваюць кулацкія падпявалы і іх прыхвасьні і трубадуры. І яшчэ паведамляем, дарагі наш брат Андрэй чырвонаармеец, стой цьвёрда на варце савецкіх граніц супроць інтэрвэнцыі ўсіх колераў, а з сваімі кулакамі мы тут расправімся самі. Затым наш дарагі айцец Пракоп, падвучаны вядомым табе Рыгорам Чыкілевічам, не захацеў колектывізаваццца ў соцыялізьме сельскай гаспадаркі. Сваёю

несьвядомасьцю пашоў з дому, невядома ў якім напрамку, пакінуўшы жану Таццяну, тваю родную маць, і сына, мяне, Мікіту і ён цяпер тут глаўны хадзяін дома. І яшчэ паведамляю цябе, дарагі наш брат чырвонаармеец Андрэй, што ёсьць у мяне ў актыўнай форме клясавая нянавісьць да кулака Чыкілевіча. Ён тут самы першы падбухторшчык і звадыяш нашага дарагога айца Пракопа Іванавіча, як стаўшы кулацкім рупарам і не пашоўшы ў колектыўную гаспадарку. І гэтая зараза заходзіў да нас, паставіўшы сябе контр - рэволюцыйную мэту не дапусьціць мяне ў колектывізацыю. А калі я крыкнуў «вон з хаты!», дык ён хацеў зацісьнуць самакрытыку, страшыў богам і абразамі. Тады я схапіў сьвятога Мікалая і шпурнуў у яго абразом. Чыкілевіч перапалохаўся панікаю апортуністычнага страху і, як апараны, кінуўся наўцёкі, зламаўшы шалёнае супраціўленьне капіталістычнага элемэнту вёскі.

І вось табе навіна: я пашоў і падаў заяву, каб прынялі нас, т. е. мяне і нашу маць Таццяну ў колгас. Старшыня колгасу Лукаш Гулак астаўся вельмі задаволены і

хваліў мяне перад другімі, што прышлі выпісваццца з колгасу, дзякуючы скрыўленьню лініі, якую трэба выраўняць бальшавіцкім тэмпам. Але няма ў нас добрага організатара, каб пакіраваць работаю і замацаваць дасягненьне на фронце рэконструкцыі. Сваімі-ж рэсурсамі трудна што зрабіць, калі ўсё глядзяць, хто куды, бяручы стаўку на самацёк. А тут трэба павесьці наступленьне на шырокім разгорнутым фронце, а ў першую чаргу—склікаць сход беднаты і намеціць праграму. Дарагі наш брат чырвонаармеец Андрэй! Напішы мне, што рабіць далей, як ты ёсьць сьвядомы і актыўны чырвонаармеец, і дай дырэктывы... Яшчэ раз паведамляем цябе, што мы жывы і здаровы. Маці нізка кланяецца табе, і шле сваё таварыскае прывітаньне».

Мікіта прачытаў пісьмо матцы. Таціяна слухала, і сьлёзы цяклі па яе ўпалых шчоках. І трудна сказаць, чым выклікаліся гэтыя сьлёзы: ці то стылем пісьма, персыпаным такімі звонкімі і мудрымі словамі, ці то Мікітаваю здольнасьцю пісаць так хораша і складна, ці тымі ўсімі падзеямі, што ў злучэньні сваім і па-

служылі тэмаю для гэтага пісьма. Многа розных пачуццяў і думак ускалыхнулася ў Таццяніным сэрцы і ў галаве, але яна не магла належным чынам іх выказаць, і яны проста выліваліся ў яе сьлёзах.

— Добра,—расчулена сказала маці, але ў тоне, якім было выказана гэтае адабраньне, чулася ня поўная шчырасьць.

— Ці добра ты, сынок, зрабіў, што кідаўся абразом?—нясьмела выказала яна сваё затоенае сумненьне.

Мікіта трохі ўгневаўся, але крыўдзіць матку ён не хацеў.

— Можа-б і лепш было, каб я шпурнуў у яго паленам,—сурова азваўся Мікіта.

Таццяна ўздыхнула.

Яна хацела яшчэ запытаць, што гэта за слова «трубадур», але ёй здавалася, што яно і так даволі выразнае і гаворыць само за сябе, складаючыся з двух слоў: труба і дурыць. Так разумеў яго і сам Мікіта—слова гучнае, і яно якраз было тут на месцы. І яшчэ хацелася Таццяне зрабіць адну заўвагу: мала было ў пісьме паклонаў, а таварыскае прывітаньне замяніць матчыным благаславеньнем. Але яна не сказала нічога.

XXIX

Чыкілевіч быў больш, чым пакрыўджан і абражан. Калі да таго моманту, як Мікіта кінуў у яго Мікалаем Мірлікійскім, ён, перажыўшы страх, адчуваў сябе ў добрым гумары і ў потайку гатоў быў сыпяваць хаўтурную песню затонскай колектывізацыі, то цяпер ад гэтага гумару не заставалася і почўту, бо справа павярнулася так, што хаўтурную песню скарэй за ўсё прыходзілася сыпяваць па хутарской гаспадарцы і па самым Чыкілевічу. Пракоп зрабіў вялікую кулацкую справу, адпіхаючыся ад колгасу, зынікшы з Затоньня, але ня менеў зьдзівіў народ і Мікіта, цягнучыся да колгасу і падаўшы сваю заяву. Стан, у якім апыніліся цяпер затонцы, можна параўняць хіба з тою зьявай, што была-б у выніку сустрэчы двух процілеглых вятроў аднакавай сілы—ўраўнаважаны зацішак.

Звычайна-ж зацішкі цягнуцца ня доўга, а тым болей зацішак у жывым людзкім жыцьці. Розныя сілы па свойму выяўляюць сваю дзейнасьць, ці затарможваючы ці падпіхаючы няспынную плян жыцьця.

— Ну, гэта-ж вы падумайце: ці было калі на сьвеце тое, што робіцца цяпер?—казаў Чыкіле-

віч на вуліцы дзядом і старым жанчынам:—прышоў да чалавека ў хату, пагаварыць, паспагадаць, а ён, Мікіта, Пракопаў шчанюк, гоніць мяне з хаты!

— Мікіта? Пракопаў Мікіта?!—узбурыўся дзед Піліп з заамшавелаю бародкаю.

— Цяперашнія падлеткі—чорт ведае што,—выказала спачуваньне Чыкілевічу і бабка Цынклета:—няма ў іх ні бога, нікога. Што та я!.. Тфу!

— Бога!—падхапіў з горкаю ўсьмешкаю Чыкілевіч. Тут ён якраз падышоў да самага кульмінацыйнага пункту ў сваім паведамленьні, каб выкарыстаць яго належным парадкам і ўтаптаць у гразь свайго заклятага ворага, а разам з гэтым і тую справу, з-за якой і загарэўся сьвет. Але Чыкілевіч вядзе сваю лінію тонка: хіба яму ходзіць справа аб яго ўласных інтарэсах, аб яго асабістай абразе? не—яму балюча зносіць гэтую нячуваную зьнявагу сьвятых угоднікаў божых!

— Калі я напомніў гэтаму выродку, няшчаснаму блазну,—казаў ён далей тонам узрушанага чалавека:—пабойся ты, хлопча, бога,—пад абразамі сядзіш ты!—то што-ж ён зрабіў? Сарваў са сьцяны абраз, Мікалая сьвятога, і кінуў у мяне абразом!

— Абразом?! сьвятым Мікалаем?!—яшчэ больш абурыўся дзед Піліп, а бабкі гаротна паківалі галовамі.

— Ну, дзе-ж будзе тое дабро на сьвеце, мае вы мілыя?—пытала бабка Цынклета:—галаву адкруціць яму і то мала!

— Захацеў ты ў колгас, ну, ідзі сабе, ніхто цябе не дзяржыць, бацька даў табе поўную волю, з дому сышоў, каб не замінаць табе, можа дзе рукі налажыў на сябе, але на што-ж ты шпурляешся абразамі?—у парыве горлівасьці аб богу разьліваўся Чыкілевіч:—перад імі тысячы гадоў маліліся людзі, у іх шукалі сабе спакою і ўцехі. Ды хоць-бы ты пашанаваў свайго бацьку—ён-жа таксама маліўся сьвятым божым угоднікам перад тым, як ісьці ў сьвет, зрокшыся свайго набытку.

Жаласьліва гаварыў Чыкілевіч. Бабка Дарота і бабка Палуся высмаркалі насы і абцерлі вочы.

— І будзе табе дабро ў колгасе, калі ты, недаверак, зьняважыўшы сталага чалавека і падняўшы руку на сьзягога Мікалая, пашоў запісвацца ў колгас, ад якога зьбег твой бацька?—граміў Мікіту дзед Піліп:—дык дзе-ж яно будзе тое дабро, калі такія саплякі пачынаюць езьдзіць па карку і верхаводзіць? Смаркачы яшчэ

з носу цякуць, а зьбіраюцца сьвет перайначыць... Божа ты мой, божа! от дачакаліся!—горасна зыгукваў дзед Піліп.

Не адставалі ад яго і бабкі, кожная на свой лад выказвала абурэньне з поваду блюзьнерства Пракопавага Мікіты.

— А маці яму патурае, выгадавала вучонага!—накінулася на Таціяну бабка Цьшклета. Цьшклету за яе баявы вораў называлі ў Затоньні чаркесам.

— Зьняла-б хвартух ды высьвенцала-б харашэнька паскамі, паказала-б яму і абраз, і колгас!

— Да дай ты, галубка, сьвет!—заступілася за Таціяну бабка Палуся:—што яна з ім зробіць калі ім дана такая воля? А вучаць іх чаму?

— Гэта праўда,—згадзіўся дзед Піліп:—прыходзілі-ж да нас летась дзеці, што добрая кабета з дзесятак у прыпол іх набрала-б, вучыць нас, як трэба жыць на сьвеце. Вот і навучылі!

Ад Мікіты перайшлі да агульных пытаньняў моралі і політыкі, а потым і да самага балючага надзённага пытаньня, да колгасу. Схадзіўся патроху народ, спыняўся, слухаў прамовы дзеда Піліпа, і бабак. Потым самі памалу ўцягваліся ў гутарку, падаючы наўперад рэплікі, і больш

распальвалі супроцькалгасны настрой дзеда Піліпа і бабак.

Дзеда Піліпа абходзіла балюча пытаньне адносна лёсу старых у калгасе. Куды ты іх там прыткнеш? Тут яшчэ, пакі носяць цябе ногі, ты сяк-так тупаеш, шворышся каля дому, знойдзеш сабе сякую-такую работу, хоць лапаць спляцеш ды прыбярэш каля току, а там што ты будзеш робіць?

— Палежваць будзеш сабе,—заўважыў Марыніч, пыхкаючы піпкаю. Сказаў ён проста так сабе, абы сказаць што-небудзь.

— Да будзеш ляжаць, пакі з голаду ног ня выпрастаеш, бо хто там цябе карміць будзе?— горка азваўся дзед Піліп.

Амяльлян Нічыпарук, першым падпісаўшы пратакол, знаходзіў зусім лішнім і несваячасовым пытаньне аб тым, што будуць рабіць у калгасе старыя. Яму проста хацелася падражніць дзеда Піліпа і бабак, а таму ён сказаў:

— Пойдуць у дзела і старыя ў калгасе, і з іх якая-небудзь карысьць будзе: каторыя сыцейшыя—на мыла пойдуць, а сухарлявыя, такія як ты, перапаляцца на попел, і засеюць на табе лубін або кукурузу для сілосу.

Злосна зірнуў дзед Піліп на Амяльляна, аднём загарэліся старыя вочы. Але чорт яго бяры— лепш не паказацца, што Амяльлянавы словы, выклікаўшыя сьмет, дайшлі да дзедавага сэрца, і ён са спакоем настаяшчага філёзафа азваўся:

— З мяне ўжо і так сыплецца попел, а калі ён табе патрэбен, то хадзі за мной і падбірай, падставіўшы прыгаршчы.

Калі гутарка перайшла на колгас у тоне, які быў дан Чыкілевічам, то сам ён ціхенька адышоў у зад, схаваўся за сьпіны, паслухаў, як рэгент, ці добра сыпявае хор, і калі праканаўся, што «хор» ня губляе тону, то памаленьку падаўся на сваю сядзібу. На што яму быць пры такіх гутарках? Потым чапляцца толькі будуць, скажуць, што гэта ён падбухторвае народ. Яго справа—старана.

XXX

Некалькі дзён шумелі і кіпяцілісь затонцы.

Амяльлян Нічыпарук, першым падпісаўшы пратакол, стараўся не пападацца людзям на вочы, а гэта сьведчыла аб тым, што, ў Затоньні пачалася рэакцыя супроць колгасу. Тыя затонцы, што не запісаліся на сходзе ў колгас, цяпер

вышай пападымалі галавы і даволі зьняважліва пазіралі на адступнікаў, на тых, што павыпісваліся з колгасу, і яны, адступнікі, трымаліся нэўтральна. А рэшта, хоць іх было цяпер і меней, не здаваліся, але колгаснага жару і ў іх ня было, і яны хадзілі, як патручаныя прусакі, ня ведаючы, да якога берагу прыстаць.

Затое-ж козырам хадзіў дзед Піліп, трасучы сваёю заімшавелаю бародкаю. І ня мінаў ён здарэньня падкалоць Амяльляна Нічыпарука, першым падпісаўшага пратакол. Дзед Піліп ніяк ня мог забыць таго, што казаў Амяльлян пра старых. Сустрэўшы Кандрата, дзед кожны раз з самаю сур'ёзнаю мінаю запытае:

— Дык гэта ты, Амяльлян, першым надпісаў пратакол?

І раптам уся сур'ёзнасьць сходзіць з дзедавага твару, і ён заліваецца сьмехам. Сьмяецца так, што вочкі яго плачуць, а бародка трапечацца, як на верацяне кудзеля, з якой праха вытрасае кастрыцу.

— Лёгкая, брат, твая рука, Амяльлян, першы падпісаўшы пратакол!

Так і называў дзед Піліп Амяльляна: лёгкая рука, першы падпісаўшы пратакол.

Амяльлян часамі змоўчыць, часамі напомніць дзеду, што ўсё-ж такі на ім пасеюць лубін, а часамі заўважыць:

— Ты яшчэ пачакай сьмяяцца: не пераскочыўшы, не кажы гоп!

Праўду казаў Мікіта, калі пісаў Андрэю, што няма тут чалавека, каб пакіраваць работаю і ўзяць організацыю колгасу ў цьвёрдыя рукі. Праўленьне колгасу вяло сябе горш, чым пасыўна, цішком агітуючы супраць колгасу. Старшыня праўленьня, Лукаш Гулак, паторкаўся трохі, пакіпяціўся і таксама астыў і выпусьціў лейцы з рук.

— Ці мне больш трэба, як усім? Ня хочаце, ну, і чорт вас бяры!—усердаваўся ўрэшце ён і плюнуў.

З тых нямногіх асоб, што засталіся вернымі колгасу. Мікіта найболей балюча прымаў да сэрца яго развал і гэтыя няўдачы. Уся Мікітава бяда ў тым, што ён яшчэ не дарослы чалавек, і яго тут мала слухаюць—ня мае ён аўторытэту сярод гэтых закасьцянелых людзей. І трэба прызнацца—Мікалай Мірлікійскі выставіў Мікіту таксама з нядобрага боку і што называецца падмачыў яго рэпутацыю сталага хлопца ў вачах затсянскіх консэрватараў. І гэта ўжо другі вы-

падак, калі Мікалай Мірлікійскі становіцца яму ўпоперак дарогі. Адным словам, калі на справу паглядзець сур'ёзна і цьвяроза, то Чыкілевіч у саюзе з Мікалаем Мірлікійскім выяўна бралі верх над Мікітам. З злорадным сьмехам сачыў яго вораг Рыгор Чыкілевіч за яго марнымі патугамі паправіць колгасную справу. А стараўся Мікіта ня мала, ён заходзіў да кожнага члена праўленьня, каб узяліся за справу. Але на яго глядзелі зьняважліва:

— От няхай вернецца твой бацька і сам стараецца, а ты што за гаспадар?—казалі яму члены праўленьня.

Ён угаворваў старшыню праявіць актыўнасьць, напамінаў яму, што не дарма-ж яго абралі за старшыню: старшыньства яго да чаго-небудзь ды абавязвае-ж. Як гэта ён патурае кулацкай агітацыі? Чаму-б ня склікаць сход колгасьнікаў ды не пагаварыць аб справе?

Старшыня чуў праўду ў Мікітавых словах і злаваўся.

— Ну, што я зраблю, калі тыя, хто мяне абіраў, ўцякаюць, як чэрці ад крыжу? Пакінулі мяне аднаго... Дык чорт іх бяры!

Прабаваў Мікіта падыйсьці і да колгасьнікаў, што яшчэ не павыпісваліся з колгасу, каб праз

іх націскаць на старшыню і на праўленьне. Адзін толькі Амяльлян Нічыпарук, перстым падпісаўшы пратакол, горача падтрымліваў Мікіту. Яму хацелася, па-першае, апраўдаць сваю славу чалавека з лёгкаю рукою, а па-другое, мелася на ўвазе насаліць дзеду Піліпу за яго насьмешкі. Але за імі ня было тут ніякай рэальнай сілы, і посьпеху яны ня мелі. К гэтаму-ж часу супроць Мікіты паўстала яшчэ адна варожая сіла: група найболей рэакцыйных жанок на чале з бабкаю Цыпклетаю. Бабка Цыпклетка, настроеная Чыкілевічам, помсьцілася за Мікалая Мірлікійскага ды і колгасу яна ніяк не хацела.

— Супакойся ты, хлопец!—сказала раз Мікіце Цыпклета на вуліцы, чуючы за сабою падтрыманыне жанок:—захадзіўся ты нешта з гэтым колгасам. Соваеш нос, куды табе ня трэба. Суслу яшчэ ссаў-бы. Мікіта быў хлопец гарачы. Злосьць узяла яго.

— Заткніся, рэдзька параная!

Ён бліснуў вачыма і пашоў сваёю дарогаю

— А каб табе заткнула ды не адпусьціла!— кляла яго ўсьлед Цыпклета. Мікіта павесялеў, бо чуў што дапёк старой Цыпклеце. Абярнуўся і сказаў, каб яшчэ больш дапячы ёй:

— Ня гневайся, бабка. А колгас будзе. Абагулім твае каровы, авечкі, сьвіньню з парасяткамі.

Цынклета аж затрэслася ад злосьці. Але Мікіта ўжо ня чуў, што гаварыла яна і чым пагражалі яму жанкі, упамянуўшы пры гэтым неадменную прыладу індывідуальнай гаспадаркі— серп: Мікіта ішоў далей, пацяшаўся над злосьцю жанок і думаў сваю думку.

Гэтая думка была ў Мікіты і раней, але ён з розных прычын ня мог спыніцца на ёй належным парадкам, каб прадумаць яе да канца і спыніцца на пэўных вывадах. Яна проста мільгнула ў яго галаве мімалётнай бліскаўкаю і на некаторы час зьнікла. А цяпер яна зьявілася зноў: усе падзеі апошніх дзён злажыліся так, што яна натуральным парадкам зноў зьявілася ў Мікітавай галаве.

Перад Мікітавымі вачамі пранеслася цэлая чарада малюнкаў і вобразаў, зьвязаных з тым знамянітым сходам, дзе выступаў т. Брыль. Ён, т. Брыль, і займаў цяпер цэнтральнае месца ў Мікітавых думках. Мікіта прыпамінаў захапіўшую яго прамову і паважную пастаць прамоўцы. І Мікіта так мала ведае аб ім—рабочы з заводу, вот і ўсё, што мог сказаць ён аб ім. Цяпер, калі

ён праканаўся, што сваімі «рэсурсам», як пісаў ён Андрэю, трудна тут пасунуць наперад колгасную справу, можа памагчы т. Брыль. Але дзе яго знайсьці?

Абмеркаваўшы з усіх бакоў гэтае пытаньне, Мікіта прышоў да цьвёрдага заключэньня знайсьці т. Брыля, расказаць яму ўсё. Ня можа быць, каб такі чалавек не паслухаў яго і не дапамог той справе, якую фактычна зрабіў тут ён.

XXXI

Мікола Тур, старшыня Крутагорскага сельсавету, меўся паехаць у вёску Загацьцё. Астаўвалася яна адна яшчэ не колектывізаванай. З прычыны таго, што т. Брыль, адзін з дваццаціпяцітысячнікаў, гэтымі днямі павінен быў выехаць у другі раён, то старшыня гнаў колектывізацыю занадта шпаркім тэмпам, каб як найбольш выкарыстаць у гэтай справе цэнную дапамогу т. Брыля. Пісьменьнік Базыль Базылец, абцяжараны рознымі матэрыяламі, уражаньнямі і назіраньнямі, падаўся назад у сваё котлішча, каб ператравіць гэту пісьменьніцкую справу. Т. Брыль меў свой погляд на такі шпаркі тэмп колектывізацыі, і ён выказаў яго старшыні,

— Ці не занадта гонішся ты, т. Тур, за процантам колектывізацыі? Баюся я, каб яна ў цябе не рассыпалася. Трэба болей удзяліць увагі на афармленьне і на замацаваньне ўжо арганізаваных колектываў і мець там сваё вока.

— Нічога, нічога, браце Брыль!—заспакойваў яго старшыня:—дапамажы, браце, правесьці нам работу ў асноўным, а ўжо дэталі адшліфуем мы самі.

— Глядзі!—круціў галавою Брыль. Але сказаць на гэта што-небудзь больш конкрэтна ён ня мог, бо справа яшчэ не праверылася практыкаю.

Старшыня зрабіў ужо ўсе распараджэньні свайму намесьніку, падпісаў найболей пільныя паперы. Зьбіраліся ехаць. У той момант, калі старшыня браў свой пузаты портфэль, дзьверы ў канцылярыю сельсавету адчыніліся, і на парозе паказаўся Мікіта, пачырванеўшы ад холаду і борздай хады.

Спыніўся, быстра акінуў вачамі старшыню і ёмкую фігуру Брыля. Напружаная заклапочанасьць зьбегла з Мікітавага твару, а замест яе засьвяцілася лягоднейшая ўсьмешка. Ён дужа быў рад, што ўбачыў Брыля. Такая зьмена на хлапецкім твары кінулася ў вочы старшыні.

— Што скажаш?

Відаць было, што старшыня сьпяшаецца.

— Ёсьць справа і вельмі важная,—сказаў Мікіта і імкліва падаўся наперад.

— Якая такая важная справа?—трохі занепакоіўся старшыня і тут-жа патарапіў Мікіту:

— Хутчэй, бо мы едзем на колектывізацыю. Колектывізацыя была баявым лёзунгам у старшыні сельсавету і гэтым лёзунгам ён думаў уняць трохі Мікіту.

— Па справе колектывізацыі прышоў і я да вас.

Старшыня зірнуў на Брыля, і гэты погляд як-бы пытаў:

— Слухаць яго ці не?

Але Мікіта так выразьліва зірнуў на Брыля, што той адразу стаў на яго бок.

— Ну, раскажы, дружа: паслухаем!

— Развальваецца наш колгас, таварыш!—

Мікіта адразу ўзяў з высокага тону: ён баяўся, што старшыня паедзе і не даслухае ўсяго. Дык трэба, што-б там ні было, задзяржаць іх і вылажыць усе свае згрызоты, трывогі і няўдачы.

— Гэта дзе?—цень заклапочанасьці лёг цяпер на твар старшыні. Ён палажыў на стол пузаты

портфэль. Брыль кіўнуў старшыні галавою і бяз слоў сказаў:

— Ну што?

— У Загонькі, дзядзечка!

Свайго чалавека Мікіта палічыў лепшым называць дзядзечкам.

— Як так развальваецца?

— Выпісваюцца ўсе, а праўленьне ня робіць нічога.

— А чаму выпісваюцца?

Мікіта апусьціў вочы, на момант замяўся.

— Бацька мой напісаваў тут трохі!

Мікіта рашуча стаў на шлях самакрытыкі.

— Гэта хто такі?

— Дубяга Пракоп.

— Цікава!.. І што-ж ён зрабіў?—запытаўся Брыль.

— У тую ноч, як вы рабілі ў нас колектывізацыю, ён сышоў з дому—не хацеў колгасу.

— Куды ён пашоў?

— Хто яго ведае. Сабраўся і пашоў. Цяпер, кажа, ідзеце сабе ў колгас: я вам замінаць ня буду.

Мікіта хацеў трохі і выгарадзіць бацьку, але ён гаварыў праўду.

— Дык пры чым-жа тут бацька твой?—недаўмеваў старшыня.

— Гэта вельмі ўсіх зьдзівіла, што ён кінуў усё, адцураўся хаты, абы толькі ня быць у колгасе. Пашлі усялякія гутаркі, сталі перадумваць... Ну, адным словам, пачалася опортуністычная паніка, рэакцыя.

— Ты—сьвядомы хлопец,—пахваліў Мікіту Брыль:—комсамолец?

— Не,—турботна адказаў Мікіта, утупіўшы вочы.

— Табе трэба было ўзяць у рукі бацьку, перавыхаваць яго ідэолёгію,—заўважыў Брыль.

— Пробаваў, але ён ня слухаў мяне... Можа-б гэтае здарэньне з бацькам і ня мела-б яшчэ такіх паганых вынікаў, бо я зараз-жа, на заўтра, падаў заяву, каб мяне і матку прынялі ў колгас, але знайшліся ў нас людзі, што павялі шалёную агітацыю супроць колгасу і выкарысталі здарэньне з бацькам больш, як на сто процантаў.

Мікіта падробна расказаў пра ўсе затонскія падзеі, не пашкадаваў фарб, каб абмаляваць Чыкілевіча і ўсе яго махінацыі і яго падступства і двусэнсныя гутаркі пра колгас. Нарэшце апісаў і сваю стычку з ім, як ён выгнаў яго з хаты.

Не ўтаіў нават, як ён шпурнуў у яго Мікалаем Мірлікійскім і навёў гэтым паніку на яго.

Калі Мікіта дайшоў у сваім апавяданьні да Мікалая Мірлікійскага, то Брыль, акінуўшы Мікіту вясёлым поглядам, зарагатаў доўгім, шчырым, раскацістым сьмехам.

— Ну, старшыня, як рэагаваць на гэта?

Пытаньне т. Брыля мело ў сабе як-бы трохі характар экзамэну для старшыні.

Старшыня замест таго, каб адказаць на запытаньне, сам запытаў Мікіту:

— А чаму ты не заявіў у сельсавет, што твой бацька сышоў з дому?

Ну, што сказаць яму на гэта?

Але Мікіту выручыў Брыль.

— Дык вось-жа ён табе і заяўляе і заяўляе больш, чым ты пытаеш. Ды і шукаць-жа ты яго і ня пойдзеш. Справа ня ў гэтым. Чалавек ці прыстроіцца дзе-небудзь на работу ці вернецца дамоў.

Але вот колгас твой раскідаецца! вось над чым трэба падумаць.

— Ехаць трэба туды!—сярдзіта сказаў старшыня.

— О! гэта праўда.

Брыль вярнуўся да свайго погляду на арганізацыю колгасу і цяпер, з фактамі ў руках, давёў старшыні, што наўперад трэба падвесьці цьвёрды грунт пад колгас, даць яму цьвёрдае кіраўніцтва, забясьпечыць адпаведнымі арганізацыямі і толькі тады можна лічыць колгас арганізаваным.

— Адкладай, брат, паездку ў Загацьце.

— Трэба не дапусьціць развалу гэтага колгасу—у Затоньне трэба ехаць.

— І вы, таварыш, прыяжджайце,—зьвярнуўся Мікіта да Брыля.

— Пайду!—весела сказаў Брыль:—мне-ж цяпер проста цікава паглядзець на кулака, якога ты біў Мікалаем Мірлікійскім.

І ён весела зарагатаў ізноў.

XXXII

Трыумфальна ехаў Мікіта па Затонскай вуліцы на пары коняй. І сядзеў ён паміж старшынёю сельсавету і т. Брылём. І людзі бачылі яго ў такой паважнай кампаніі і віталіся. Хоць гэта вітаньне і не адносілася да Мікіты, але-ж вітаньне—ня чарка гарэлкі, што ёю ты можаш абдзя-

ліць каго ў кампаніі: віталіся з старшынёю і Брылем,—віталіся з Мікітай.

Дзед Піліп, бабка Цынклета і ўся іхняя хэўра, і іх правадыр Чыкілевіч спачатку ня ведалі, што значыць усё гэта: Мікіта нікому не гаварыў, што надумаўся ён рабіць, але ўсё-ж такі яны дрогнулі, як варожая армія, зачуўшы на полі бою моцныя рэзэрвы свайго праціўніка. І дзед Піліп, сустрэўшы Амяльляна Нічыпарука, на гэты раз не запытаўся пра яго лёгкую руку, якою той першы падпісаў пратакол. Заткне-ж сам Амяльлян, пачуўшы за сабою падкрапленьне, кіўнуў дзеду галавою і запытаў:

— Дык што ты, дзед, будзеш у колгасе рабіць?

— Для працавітага чалавека ўсюды работа знойдзецца. А вось ты, як быў лодырам, дык лодырам і застанешся,—сярдзіта падцяў яго дзед.

— Ня злуйся, дзед, а лепш запішыся ў колгас.

— Як трэба будзе, дык запішуся. Ты першым, а я апошнім.

Кольгасьнікі, ганебна здрадзіўшыя колгасу, таксама раптам адчулі сябе цяпер няёмка, як дызэртыры, што ўцяклі з поля бітвы.

І людзі, у якіх была ў той ці іншай ступені віна перад колгасам, пачыналі ўпотайку вызнаваць перад ім свае грахі, думаючы, як гэтыя грахі абярнуць у сьвятасьць. І сам Чыкілевіч успамінаў цяпер, як многа казаў ён людзям за колгас. Прыезд старшыні сельсавету і гэтага рабочага з гораду ды яшчэ разам з Пракопавым Мікітам не абяцаў Чыкілевічу нічога добрага.

«Ось яшчэ скула на маім карку!»—думаў ён пра Мікіту: «набрахаў на мяне, гад!» На колькі дапамог яму Пракоп, нагэтулькі, калі ня болей, пашкодзіць яму гэты шчанюк. Ну, але ён, Чыкілевіч, паглядзіць, што будзе далей. Няхай толькі праз яго пачнуць рабіць яму, Чыкілевічу, прыкрасьці, то... Чыкілевіч яшчэ і сам ня ведаў, якую помсту прыдумае ён. Але што-небудзь ды прыдумае!

Сам ён цяпер не паказваўся людзям на вочы, тупаў каля дому і каршуном паглядаў у бок Затоньня, чакаючы далейшых падзей. Для сувязі-ж з Затоньнем і для разьведак паслаў ён свайго сына Юрку. Юрка быў адзін сын у бацькоў. Дзьвёх сваіх дачок Чыкілевіч пааддаваў замуж. Адну ўзяў аграном і жыў з ёю цяпер дзесь на Каўказе. І жылі добра. Другая была

замужам за фэльчарам. Клопату з імі бацьком ня было. А вот з Юркам справа стаяла горай. Адчуваючы няпэўнасьць свайго гаспадарскага стану, Чыкілевіч думаў вывесьці ў людзі і сына свайго Юрка. Юрка годам раней за Мікіту скончыў сямігодку. З паўгода вучыўся ў ветэрынарнай школе, але яго вычысьцілі адтуль, як сына кулака: лішэнца. Такім парадкам нічога пэўнага ня было ў Юркі.

Мерыўся хлопец паехаць на поўнач на лесараспрацоўкі, але бацькі не хацелі пускаць яго так далёка і на такую цяжкую работу. І Юрка жыў покі што дома, падпільноўваючы зручнага здарэньня. Гаспадаркаю цікавіўся ён мала.

— Каб ужо я бачыў, што ты прыстроены, то ў мяне і клопату ня было-б,—казаў яму бацька:—як-небудзь з маткаю датаўклі-б веку.

Але за зямлю трымаўся ён моцна з чыста кулацкаю заўзятасьцю, спадзяючыся ў затоеных глыбінях сваіх мысьляй якіх-небудзь зьмен.

Навіны, сабраныя Юркам, насілі агульны характар. Так, ён даведаўся, што Мікіта хадзіў у сельсавет для таго, каб расказаць там, што кулакі раскідаюць колгас і па яго заяве прыехаў сюды старшыня сельсавету і той самы рабочы,

што ўжо выступаў тут на сходзе. Цяпер-жа ізноў склікалі сход, пры чым на сход скліканы толькі беднякі—колгасьнікі і неколгасьнікі. Што там гавораць на сходзе, Юрка ня ведае. Адно толькі вядома яму, што на гэтым сходзе быў і Мікіта.

Гэтыя скупыя навіны і давалі Чыкілевічу страву для разважаньня і для розных дагадак. Перш за ўсё вельмі падазронна, што на сход закліканы адны толькі беднякі і, што яшчэ больш дзіўна, Мікіта!

Лічыць іхнюю гаспадарку за бядняцкую нельга: Пракоп—сераднячок ды і не слабенькі. І чым жа гэты шчанюк заслужыў ласку? Ясна адно—Мікіта наплёў там чорт ведае чаго і, разумеецца, не пашкадаваў яго, Чыкілевіча. Ён стараўся адгадаць Мікітавы злыя намыслы і чым больш думаў аб іх, тым большую нянавісьць адчуваў да хлапца.

«Ось настала жыцьцё: сам сабе больш не гаспадар! Сваё-ж кроўнае дабро, здабытае ўласнаю працаю, становіцца табе ўпоперак дарогі. І якінебудзь выдадак, сапляк прымушае цябе дрыжэць і трывожыцца!»

— Тфу!—плюнуў абурліва Чыкілевіч, і мысьлі яго прынялі іншы кірунак—як тут выкруціцца і зрабіць так, каб ім аж моташна стала.

Але чалавеку вельмі трудна адгадаць, як павернецца справа, па якому рэчышчу паплывуць падзеі і якую прызначаць яны табе ролю. Так было і з Чыкілевічам. Як ні меркаваў ён, што можа быць для яго ў выніку гэтага сходу, з якога боку падыдзе да яго ліха, ён ніяк не чакаў, што справа павернецца такім чынам.

На другі дзень з раніцы па Затонскай вуліцы гналі невялікае стадка, штук дванаццаць, жывёлы, рознага ўзросту і роду: некалькі кароў, худых з закарэлымі сьцёгнамі, бычкоў і цялушачак. Жывёла, сагнаная ў такі нязвычайны час з розных двароў, са зьбянтэжаным рыкам, штурхаючыся, паволі пасоўвалася наперад у той бок, дзе жыў Чыкілевіч. За гэтым стадкам ішло некалькі мужчын і падлёткаў, падганяючы жывёлу. Жывёла была затонская, і людзі, што ішлі за ёю, таксама былі затонскія. Сярод жывёлы Чыкілевіч пазнаў і Пракопаву цялушачку-трацячку. Сярод-жа людзей найболей яскрава выдзялялася постаць Кандрата Казея, таго самага Казея, якога ня так даўно Чыкілевіч называў Пракопу, як кандыдата ў добрыя адміністратары ў колгасе. Мінуўшы вуліцу, людзі, што гналі жывёлу, павярнулі яе проста на Чыкілевічаву сядзібу, а потым, па загаду Казея, адчынілі вароты Чыкі-

левічавага двара і пагналі скаціну ў бок прасторнага хлява.

Усё гэта рабілі па загаду Казея, як-бы гаспадаром быў тут ня Чыкілевіч, а Кандрат Казей. У Чыкілевіча ня спыталі, не параіліся нават, як разьмясьціць скаціну ў яго хляве. Адчынілі хлеў, паглядзелі, памеркавалі трохі і самі сталі парадкавацца тут, як сапраўдныя гаспадары. Чыкілевічу сказалі толькі, каб ён ачысьціў адну палавіну хаты.

XXXIII

Чыкілевіч, яго жонка і сын сядзелі, як аглушаныя громам. Навала, што насунулася на іх, была так неспадзявана і так вялікa, што адабрала ад іх здольнасьць выказаць сваё абурэньне з прычыны такога гвалту: прышлі чужыя людзі, прыгналі сюды сваю жывёлу, захапілі двор і палавіну хаты і сталі тут гаспадарыць, не папярэдзіўшы, не сказаўшы ім ні слова!

Месца не знаходзіў сабе Чыкілевіч. Снаваў з вугла ў вугал, апусьціўшы голаву.

— Дажыліся, дажыліся! Вот табе і колгас, некалькі разоў гаварыў ён як-бы сам з сабою.—

Ну, што-ж? іх сіла, іх права!—стараўся ён заспакоіць сябе, жонку і сына.

— Нічога не клеілася ніяк. Панура маўчаў Юрка, абапёршыся на край стала. Маўчала і Ульляна, Чыхілевічава жонка, злажыўшы рукі, і толькі ўздыхала.

— Нічога не парадзіш,—не пераставаў адзывацца Чыкілевіч, а ў самога ўсё гарэла ўнутры ад крыўды і злосьці.

— І няўжо няма на сьвеце праўды. Павінна-ж быць нейкая справядлівасьць! Як-жа гэта так?—недаўмявала Ульляна:—убіліся самачынна, пішчом, гвалтам у твой двор, у тваю хату; камандуюць табою, распараджаюцца тваім дабром. За што? за які праступак? Ці мы тут кралі? грабілі? забівалі? Кроўнаю працаю прыдбалі кусок хлеба, і ён стаў ім упоперак горла.

Ульляна зьмяніла тэмп і характар свае жальбы і адразу перайшла на праклёны.

— Іх сіла—іх права,—яшчэ раз заўважыў Чыкілевіч, а Юрка дадаў.

— У кожнаго свая справядлівасьць: свая праўда. Клясавая справядлівасьць.

Але маці нічога не зразумела з Юркавай заўвагі, і яна казала сваё:

— Як-жа тут цярпець і маўчаць?

— А што ты зробіш?—пытаньнем адказаў ёй Чыкілевіч. І зусім іншым тонам прасіпеў:

— Каб была ў мяне сіла—паказаў-бы я вам кулака! Раскулачыў-бы, а вас так, што ўсіх вас пабралі-б чэрці!

Ён раптам увесь зьмяніўся. Злоба, нянавісьць выступалі з кожнага мускулу яго твару. Але гэтая ўспышка злосьці ў ім зараз-жа і пагасла. Усе трое здрыгануліся, і вочы іх павярнуліся ў бок дзьвярэй. Дзьверы адчыніліся. Высокі парог пераступілі ногі старшыні сельсавету Міколы Тура, і ўся яго постаць увалілася ў хату. За ім увайшоў старшыня колгасу Лукаш Гулак, за Гулаком—Кандрат Казей, цяперашні падсуседнік Чыкілевіча.

Увайшлі, і ніхто з іх не павітаўся з гаспадарамі, не казаў дзень добры ў хату. Чыкілевіч усё гэта ўзяў пад увагу і растлумачыў яго, як нядобры знак.

— Ну, дык вот!—гэтак пачаў сваю прамову старшыня сельсавету:—з твайго, васпан Чыкілевіч, двара, вярней, з быўшага твайго, пачынаецца тут, у Затоньні, колгас.

Чыкілевіч слухаў, але ўвага яго больш за трымлівалася на дробных рэчах. Так ён ізно зьвярнуў сваю ўвагу на тое, што старшыня на

збаў яго васпанам. «Васпан» быў да рэчы ў старыя часы, а цяпер ён гучэў ужо, як лаянка і яшчэ адна абраза асобы гаспадара. «Таварыша» пашкадаваў для яго!

— Покі што,—казаў далей старшыня:—ты астаешся жыць тут, але гаспадар на гэтым дварэ і ў гэтым доме ня ты, а ён.

Старшыня паказаў рукою на Кандрата Казея.

— Ніякаю быўшаю тваёю маёмасьцю распараджацца сам ня можаш: ні прадаваць, ні мяняць ня маеш права—уся яна будзе апісана!—А ўсё, што трэба табе і скаціне, якая покі што лічыцца за табою, будзе выдаваць т. Кандрат... Вось! Далейшае-ж тваё тут прабываньне будзе залежаць ад самога. Гэта значыць: калі выявіцца тваё шкодніцтва хоць замах на злачынства ў дачыненьні да колгасу або да каго-небудзь з колгасьнікаў, то ты будзеш ня тут, а дзе-небудзь у іншым месцы. Зразумеў?.. Ну, дык вот!

Магільная цішыня была ў Чыкілевічавай хаце, калі старшыня сельсавету агалошваў гэту грозную рэзолюцыю. Ульяна пераводзіла вочы з старшыні на Чыкілевіча. У меру таго, як гаварыў старшыня, мяняўся ў твары Чыкілевіч. Злосьць і абурэньне яго нейк вытахліся, ці то ўжо перайшлі за такую мяжу, дзе яны проста

зьнікаюць, як дым ад пажару ў паветры. А калі старшыня скончыў сваю прамову, Чыкілевіч кіўнуў галавою ў знак згоды, а потым, памаўчаўшы момант, закалыхаўся сухім, дзервяным сьмехам.

Старшыня зірнуў на яго і адчуў нешта накшталт страху.

— Чаго сьмяешся?—па-начальніцку запытаў старшыня.

Чыкілевіч успомніў адно здарэньне на судзе, паставіў сябе на месца таго падсуднага, якога асудзіў судзьдзя, і яго словамі адказаў:

— Каротка, міласьціва і справядліва! Дзякую табе, Мікола, за тваю мудрасьць, дабрату і ласку. Дай табе божа, каб і цябе так справядліва судзілі і ўсіх тых, хто судзіў і мяне. Няхай жыве колгас, няхай растуць і будуюць у ім мае сьлёзы і мая крыўда! Ня шкодзіў я колгасу і шкодзіць ня зьбіраюся.

— Ну, і то добра!—сказаў Мікола Тур.

Абодва старшыні і Кандрат Казей вышлі з хаты.

Трое Чыкілевічаў момант заставаліся ў анямелым маўчаньні.

Першым загаварыў сам Чыкілевіч.

— Ну, вось табе і колгас!.. Ну, нічога не паробіш,—тонам прымірэньня загаварыў ён:—бывае і горш. Будзеш-жа як-небудзь жыць.

Язык яго казаў аб прымірэньні з горкаю долю, а мысьлі напружана шукалі спосабу самай жорсткай помсты.

— Былі гаспадары, а сталі горш за батракоў. І за што, за якую кару?—з болем у голасе пытала Ульляна.

— Батракі—самае пачэснае цяпер званьне,—заўважыў Юрка, а бацька дадаў:

— О, каб мы былі батракамі ды лодырамі—былі-б шчасьлівыя людзі.

— А ўсё гэта Мікіта Пракопаў павёў, каб яго сьляпога вадзілі!—Ульляна ізноў разьлілася патокамі праклёнаў.

Яны абмяркоўвалі сваё становішча. І калі нарэшце, як гэта і бывае зазвычай, прышлі да пэўнага заспакаеньня, Чыкілевіч сказаў:

— Што-ж? будзеш кланяцца Казею.

XXXIV

Гучна і шумна стала ў Чыкілевічавай хаце, на той палавіне, дзе асталяваўся Кандрат Казей. Сюды прыходзілі колгасьнікі—Марьяніч, Амяль-

лян Нічыпарук, першы падпісаўшы пратакол, старшыня колгасу, члены праўленьня і іншыя колгасьнікі. Тут адбываліся іх сходы-нарады, выносіліся розныя пастановы, складаліся пляны работ. Карацей сказаць, Чыкілевічаў двор і дом сталі цяпер галоўнаю кватэраю, баявым штабам ватонскага колгаснага руху.

Ня раз стаяў Чыкілевіч, прылажыўшы да сьцяны вуха, і слухаў аб чым гаварылася там, за сьцяною. Ён лавіў асобныя абрыўкі іхняй гутаркі і ў мысьлях, а часамі і ў голас, але так, каб яго не пачулі, падаваў самыя злосныя, самыя абразьлівыя рэплікі, у якіх выліваў сваю кулацкую злобу супроць «лайдакоў», як называў ён колгасьніцкую беднату. І асабліва ненавісны стаўся Кандрат Казей.

— Прышлі на гатовае, селі няпрошаныя, а ты кланяйся ім, жабруй перад імі, выпрошваючы сваё ўласнае дабро. А вы што зрабілі? Запаскудзілі двор, забрудзілі хату. Латошаць толькі языкамі, а скаціна стаіць недагледжаная.

Хадзіў Чыкілевіч, як зацкованы воўк на сваёй палавіне. Але, сустрэўшыся з Кандратам Казеем, ён ветліва ківаў яму галавою і першы вітаўся з ім, называючы яго таварышам Казеем. І ўся панурасьць яго твару зьмянялася тады прыем-

наю ўсьмешкаю. Былі ў Чыкілевіча прычыны ладзіць з Кандратам: трэба было заслужыць яго давер'е, каб праз гэта здабыць сабе права бяз лішніх сьведак заходзіць у клуню—у клуні быў патайны пограб, а ў пограбе хаваўся кубел з салам і іншы скарб.

Але Казей паддаваўся туга, а яго круглыя жоўтаватыя вочкі пазіралі насьмешліва і хітра. Гэта быў чалавек, як-бы спэцыяльна прызначаны для таго, каб заганяць у сухоты кулакоў. Перш за ўсё павесіў замкі на клуню і сьвіронак і ніколі не пускаў туды аднаго Чыкілевіча. Пакі Чыкілевіч спраўляўся там, Казей стаяў і высьвістваў розныя мотывы рэволюцыйных песень. А то і проста сыпяваў няпоўным голасам, нікалечкі не зважаючы на Чыкілевіча.

„Ўставай. пракляцьцем катаааны!
Ўставай, хто в голаду век пух!"

сыпяваў часамі Казей у сьвірне, а Чыкілевіч у мысьлях казаў:

«З голаду пух, бо гультай. Нябось, калі хто працаваў, то меў і хлеб і да хлеба... Стаіш., трасцат ваёй галоўцы, над маім каркам. Сам панам стаў, а мяне ў нявольнікі абярнуў і жарэш маё

дабро, і я яму цяпер не гаспадар. А часамі і ў Чыкілевічаву палавіну зазірне наш Казей.

— Сядай, суседзе!—ветла сустракае яго гаспадар, а ў самога рукі згортваюцца ў кулакі. Але Казей не садзіцца, пакруціцца трохі і выйдзе нічога асаблівага не сказаўшы. Для Чыкілевіча такія візыты былі зразумелы.

— Глядзіць сваімі злодзейскімі вачамі, каб яны яму павылазілі, ці ўсё на месьце,—тлумачыў ён жонцы.

Іншы раз вечарамі Казей уладзіць вечарынку. Папрыходзяць хлопцы, дзяўчаты. Грыміць за сьцяною гармонік. Казей хоць і жанаты чалавек, а любіў такія вечарынкі, дзе ён сам выступаў у ролі музыкі—ён быў ня кепскі гарманіст.

Так праходзілі дні на Чыкілевічавай сядзібе.

Пануры быў Чыкілевіч і ўсё нешта думаў, але думак сваіх нікому ня выказваў. Нядобрыя сны пачалі сьніцца Ўльляне. Прысьнілася ёй раз, што яна чэрпала ваду сваім чаравікам і піла яе. Гэты сон устрывожыў Ульляну. Яна расказала яго Чыкілевічу.

— А, мала там што зьвярзецца ў сьне!—махнуў рукою Чыкілевіч. Бабка-ж Палуся паківала галавою, , калі Ульляна расказала ёй гэты сон.

— Ой, ня добры, мая мілая, твой сон!

І растлумачыла:

— Піць ваду з свайго чаравіка азначае сьмерць.

Ульляна спалохалася. Як усе цёмныя людзі, яна верыла ў сны, жыла імі.

Лепш ужо памерці, як гэтак жыць, як мы жывём.

Але ўміраць ёй зусім не хацелася.

Юрка наогул быў маўклівы хлопец і таксама ня вельмі быў ахвочы дзяліцца сваімі мысьлямі, нават з бацькамі. Але цяпер, бачучы, як блізка прымаюць бацькі да сэрца суседзтва Казея і наогул гэты сьціск, ён рашыў выказацца на сямейнаў нарадзе.

— І чаго вам так хватацца за гэту таспадарку?—пачаў Юрка:—ўсё-ж роўна нас адгэтуль выпруць. Дык лепш не чакаць гэтага часу, а кінуць усё і куды-небудзь перабрацца.

Бацька і маці са зьдзіўленьнем паглядзелі на сына.

— Нічога ня зробіш Толькі будзеце згрызацца, жывучы тут, а проціў вады паплаваеш ня доўга. Адміраюць хутары, саступаюць месца калгасам,—казаў далей Юрка.

Чыкілевіч засьмяўся.

— Самі яны адміраюць?—запытаў сына.

— А гэта ўсё роўна, ці памёр Гаўрыла, ці скула яго задавіла,—груба адказаў сын:—а факт той, што аднаасобніцкая гаспадарка дажывае свае апошнія дні.

— Кідаць сваю хату, сваю зямельку, сваю гаспадарку, ісьці немаведама куды? што ты гаворыш, сынок?—з дакорам адазвалася Альляна.

— Ня хату, а паўхаты,—паправіў жонку Чыкілевіч:—што-ж? можа твая і праўда, можа і давядзецца на старасьці надзяваць торбу ды ісьці ў сьвет жабраваць,—горка заўважыў Чыкілевіч.

— На што жабраваць? Можна рабіць і работу.

— Якую?—рубам паставіў пытаньне Чыкілевіч.

— У горадзе работы многа. Попыт на рабочыя рукі вялікі.

— Дзякую табе, сынку! Да хто-ж мяне, пазбаўленага голасу, на работу возьме? Да і ці ў мае гады ламаць крута жыцьцё?

Юрка змоўк, але над яго мысьлямі задумаўся бацька. Ён успомніў Пракопа. Таксама кінуў чалавек сваю гаспадарку і хату. І ніхто яго ня гнаў. Аб тым-жа, якую паслугу аказаў Пракопу ён, Чыкілевіч ня думаў і сябе ў гэтым ня вінаваціў.

А што-ж? можа Юркава і праўда.

Чыкілевіч пачынае думаць у другім кірунку. Ён камбінуе новы плян. Ён думае аб тым, як падгатаваць пад нагамі грунт, замацавацца на новай позыцыі і ўжо тады расквітацца з Казеем і Мікітам за ўсе свае крыўды і насаліць колгасу так, каб ён доўга памятаў аб гэтым. Але ў яго мысьлі зноў уплятаецца патайны паграбок ў клуні, кубел з салам, з запасамі круп і іншы скарб. Як-жа з імі быць? Шкода пакідаць дабро, а яно-ж яму вельмі і вельмі спатрэбілася-б. Гэты кубель апаноўвае яго мысьлямі. Ён думае, камбінуе розныя проекты і нарэшце сам сабе ўсьміхаецца.

— Ці былі калі такія выпадкі, каб чалавек думаў, як абакрасьці самага сябе?

XXXV

Некаторы час Мікіты ня відаць было на Чыкілевічавым дварэ, хоць праўда, раней ён ніколі туды не хадзіў. Можа яму трохі нязручна было цяпер паказвацца тут пасьля таго, як у яго выйшла такая баталія з Чыкілевічам, у якой прымаў удзел і Мікалай Мірлікійскі, а можа замінала і тая акалічнасьць, што праз яго ўшчамілі Чыкіле-

віча, як кулака і ворага колгасу. Ды ў Мікіты, сказаць і часу ня было цяпер: ён заняўся грамадзкаю работаю. Т. Брыль, другі раз прыехаўшы ў Затоньне, арганізаваў тут комсамольскую ячэйку, а яе самым актыўным членам стаў Мікіта. Мікіта горача і гарліва адаўся сваёй справе, старанна выконваў інструкцыі, што даў яму Брыль. Па справе ячэйкі здаралася яму хадзіць у сельсавет, трымаць сувязь з другімі ячэйкамі, а часамі прыходзілася наведвацца і ў раён. За гэты час была абсталявана хата-чытальня, быў выпушчан № насыценнай газэты. Ды трэба-ж было парупіцца, каб газэта вышла добрая, каб моцна і трапна біла яна стары быт, ды прыдумаць ёй і адпаведнае імя. А гэта таксама адняло шмат часу. На комсамольскім сходзе было пастаноўлена даць газэце такое-ж імя, якое павінен мець і колгас. Некалькі вечароў перабіралі комсамольцы розныя імёны для газэты. Былі розныя проекты: «Чырвоны араты», «Новае Затоньне», «Шлях рэволюцыі», «Сьвітаньне», «Чырвоны кастрычнік», «Ясная раніца», «Сьцяг перамогі» і іншыя. Усе гэтыя проекты прапускаліся праз строгую крытыку. Аказалася, што даць трапнае імя, каб яно было і арыгінальнае і ідэолёгічна вытрыманае, не такая ўжо простая

рэч, тым болей, што гэта імя павінна было падыйсьці і да газэты і да колгасу. Нарэшце, пагадзіліся на назьве «Ленінскі засеў».

У першым нумары «Ленінскага засеву», у перадавым артыкуле была вызначана програма газэты і намечаны тыя задачы, што ставіць перад сабою «Ленінскі засеў». Гэтыя задачы былі такія: новая колектыўная форма гаспадаркі, бязьлітаснае змаганьне з клясава-варожымі элемэнтамі, з кулакамі, як ворагамі колгаснага будаўніцтва, падрыхтоўка соцыялістычных кадраў, новы быт, разьняволеньне жанчын і інш. Таксама ставіла сабе газэта і задачы самакрытыкі, «ня гледзячы на асобы», як значылася ў програме газэты. І тут-жа быў зьмешчан артыкул, дзе трактавалася аб тым, якімі спосабамі змагаецца кулак з колгасам і савецкаю ўладаю. Артыкул напісаў Мікіта, маючы на ўвазе Чыкілевіча, хоць ён і не называў яго, прыдаўшы яму агульны характар клясавага ворага. Але ўсе Чыкілевічавы спосабы змаганьня былі апісаны праўдзіва.

Першы № «Ленінскага Засеву», вывешаны на сьцяне хаты-чытальні, узварушыў Затоньне. Каля газэты таўкліся групы грамадзян і слухалі, як затонскі грамацей чытаў у голас розныя разьдзелы газэты. Нават бабка Цыпклета стаяла

тут і слухала, трасучыся ад злосьці, у артыкуле аб спосабах змаганьня клясавага ворага былі апісаны і тыя спосабы, што ўжывала і сама бабка Цынклета.

— От сьмярдзюхі!—казала яна потым: ды чаго дадумаліся!.. А каб вам чэрці скуру напісалі! Чаму-ж гэта пра вас ніхто ня піша?

О, каб бабка Цынклета ўмела пісаць! Дала-б яна чапаласу ў ім! І колгас гэты апісала-б яна. Што гэта за колгас? Чалавек працаваў, стараўся, а цяпер нагналі скаціны і кормяць яго кормам, і самі, як вусені, ядуць яго дабро, пішчом убіўшыся ў яго хату.

Але бабка Цынклета, як і дзед Піліп, пісаць ня ўмелі, і нехаця прыходзілася ім замяняць пяро сваімі языкамі.

Тым-жа часам комсамольская ячэйка і яе сакратар набывалі ў Затоньні ўсё большае значэньне, у меру таго, як разгортвалі яны сваю чыннасьць. І асабліва злаваліся на Мікіту. Усе, што былі супроць колгасу, гатовы былі ўтапіць Мікіту ў ложцы вады, бо хто-ж, як ня ён, сеяў раздор між людзьмі? Да апошняга, сказаць, часу, усё было ціха, жылі сабе людзі ў згодзе, калі ня лічыць дробных сварак, без якіх нідзе не абыдзешся. Былі бяднейшыя і багацейшыя, як

хто стараўся і як паводзілася каму. Бяднейшы часамі пабагацее, а багаты зьбяднее, калі надзыдзе якое ліха. Ня ведалі ніякіх кулакоў, ніякіх капіталістычных элемэнтаў. А цяпер што стала? Пачаліся нейкія патаемныя сходы, сталі настройваць адных проціў другіх, узьнімаюць калатню, падзялілі ўсіх на кулакоў, сераднякоў, беднякоў і батракоў, колгасьнікаў і неколгасьнікаў, павыдумлялі нейкіх рупараў і кулацкіх падпявалаў.

Так гаварылі тыя, што былі супроць колгасу і ў колгас не пашлі. А тут яшчэ і гутаркі пачалі хадзіць, што колгасу адвядуць самую лепшую зямлю і ў адным кавалку. І ўсё гэта комсамольская ячэйка і Пракопаў Мікітка чмуцяць! Вярнуўся-б Пракол, ды паглядзеў-бы, што робіць яго сынок! Не па бацьку пашоў, гад! Так уздыхалі Мікітавы ворагі. Яны радаваліся і цешыліся з Пракопавага ўчынку шэсьць тыдняў таму назад, калі Пракоп пакінуў Затоньне, і спачувалі яму. А цяпер яны шкадавалі, што няма яго тут, і няма каму суняць ня ўмеру гарлівага сына-раскола. Ім здавалася, што каб быў тут Пракоп, то справа павярнулася-б іначай.

Кіпела Затоньне, выбітае з каляіны заскаруслай пліны сялянскага жыцьця. Раскалолася ста-

рая вёска, а ў яе шчыліны напорыста ўрываліся подыхі новага, нідзе нябачанага яшчэ жыцця, зьмятаючы з свае дарогі ўсе перашкоды.

XXXVI

Мікіта і Таццяна, зачыніўшы акяніцы ў хаце, сядзелі за сталом. Каля Мікіты стаяла лямпа, а ў руках у яго было пісьмо ад Андрэя. Андрэй, разумеецца, горача падтрымліваў Мікіту і хваліў яго за тое, што запісаўся з маткаю ў колгас. Пісаў таксама і пра бацьку, з жалем кваліфікуючы яго ўчынак, як контр-рэволюцыйны і тлумачучы яго бацькаваю несьвядомасьцю. Але Андрэй заспакойваў брата і матку, што бацька дзе-небудзь знойдзе сабе работу і будзе жыць, калі не захоча варочацца дамоў і што само жыцьцё прымусіць яго прызнаць сваю памылку.

Мікіта і Таццяна гаварылі аб Андрэю і наогул аб сваіх сямейных справах, аддаючыся розным успамінам.

Быў даволі позьні час. Стомленае таўкатнёю дня і рознымі колгаснымі згрызотамі, Затоньне апускалася ў спакой ночы. Цемра, глухмень і цішыня стаялі над вёскай. Таццяна ўстала, пазяхаючы, з лавы—заперці трэба дзьверы на засаў

ды лажыцца спаць. Але ў гэты момант бразнула клямка на дзьверах, і чыесь ногі затухкалі ў сенях.

— Хто-ж гэта?

Таццяна палахліва зірнула на сына.

— Можа хто з комсамольцаў,—сказаў Мікіта і таксама затрывожыўся.

Яшчэ момант—дзьверы расчыніліся, і ў хаце паказалася постаць пажылога селяніна ў доўгім кажусе і з кіем у руках. Насунутая глыбока на галаву шапка і ўскудлачаная барада закрывалі твар. Пераступіўшы парог, чажылы чалавек спыніўся моўчкі.

Маці і сын пазіралі недаўменна.

— Пракоп!—у хваляваньні і ў вялікім зьдзіўленьні крыкнула Таццяна.

— Добры вечар вам,—прывітаў хату Пракоп і засьмяяўся, а потым загаварыў:

— Ну, вот і я!

І весела затрубіў носам.

— Бацька! Скуль ты ўзяўся?!

— Гм! Можна сказаць з таго сьвету вярнуўся,—паважна адказаў Пракоп і крэпка паціснуў сыну руку.

Мікіта кінуўся памагаць бацьку разьдзецца, а Таццяна раптам накінулася на Пракопа і пача-

ла яго прабіраць і клясьці, але бяз злосьці, скарэй ад вялікай радасьці.

— А бадай-жа ты, чалавеча, спрогся, колькі ты нарабіў нам гора і клопату! От цягач, брадзяга! Ну, ці ёсьць дзе на сьвеце такі валацуга?

— Ну, не расхадзіся так,—спакойна азваўся Пракоп:—а то завярнуся і пайду,—пастрашыў ён жонку, вешаючы на ашэстак кажух.

— Куды ты пойдзеш?—зьняважліва запытала Таціяна:—нябось-бы не вярнуўся, калі-б думаў зноў павалачыся куды,—заўважыла яна і штурхнула яго па-прыяцельску ў плечы.

— Адно-ж вы не пасварэцеся хоць!—умяшаўся Мікіта.

— Тут не сварыцца, а біць яго трэба!—прыгразіла маці.

Тады Пракоп прыняў паважную позу, зрабіў адпаведную міну і сказаў:

— Сьмешная ты, маці! Няўжо-ж ты думаеш, што я такі дурны і палезу ў воду, не пабачыўшы броду? Не, брат: Пракопа ты за тры капейкі ня возьмеш! Тут самакрытыка трэба ды яшчэ і якая!

Затоньне спала глыбокім сном, а ў Пракопавай хаце гарэла лямпа, хоць з вуліцы і ня відаць былі—акяніцы былі зачынены. На прыпечку та-

рэлі трэсачкі, над імі стаяў трыножнік, а на трыножніку трэлася скаварада. Таццяна, запаліўшы лучыну, пашла ў камору па сала. Яна не магла ня зірнуць на Мікалая Мірлікійскага, і, у парыве радасьці і наогул узьнятага настрою з прычыны шчасьлівага звароту Пракопа, яна пацалавала абраз, і недарэчныя мысьлі, зусім не рэлігійныя, узварухнуліся ў яе галаве, і яшчэ больш недарэчныя словы ўсплылі з архіву яе памяці:

„А мой-жа-ж ты Мікалаю,
Дзе-ж я цябе пахаваю?"

Яна палажыла абраз, выбрала ёмкі кавалак сала і пашла ў хату, каб згатаваць Пракопу, ну, і Мікіце вячэру, адпаведную гэтаму выдатнаму і рэдкаму ў жыцьці выпадку.

Гэта думка прышла ў комсамольскую Мікітаву галаву ў той-жа вечар, як вярнуўся бацька, пасьля гутаркі з ім.

«Добра было-б!» казаў сам сабе Мікіта: «але для гэтага трэба, каб бацька згадзіўся».

І Мікіта запытаўся:

— А што калі-б мы склікалі сход, то ці выступіў-бы ты, тата, ну з інфармацыяй аб сваім аглядзе колгасу «Хваля рэволюцыі»?

Пракоп затрубіў носам і паглядзеў на сына. Ён не разумеў самога слова «інформацыя», а калі Мікіта растлумачыў, то Пракоп рашуча заявіў:

— Гэта я скажу! Сам думаў аб гэтым! Потым яны ўдвох абмяркоўвалі плян і характар дакладу, што меўся зрабіць на сходзе Пракоп.

Вестка аб звароце Пракопа шпарка абляцела на заўтра затонскія хаты і зрабіла яшчэ большае ўражаньне, чым вестка аб яго зьнікненьні з сяла, і дзьверы Пракопавай хаты ніколі так часта ня рыпелі, як на гэты раз. Прыходзілі затонцы паглядзець на Пракопа, даведацца, дзе ён быў, што з ім сталася і як прыняў ён самы факт запісу яго гаспадаркі ў колгас.

Пракоп ня дужа разыходзіўся ў гаворцы—такая тактыка была ў Пракопа і ў Мікіты,—ён толькі казаў, што хоць яго і ня выбіралі, але ён сам узяў на сябе ролю дэлегата ад затонцаў і хадзіў аглядаць колгасы, а што бачыў ён там, то яму проста трудна расказваць кожнаму аб тым: для гэтага будзе спэцыяльна склікан сход, і на сходзе ён скажа, што ён там бачыў і з чым вярнуўся дамоў. Мікіты-ж у хаце ня было, а гэта людзі бралі на ўвагу і думалі, што ў бацькі з сынам нелады.

Сход быў ня меней людны, як у той раз, калі прыяжджаў Брыль і пісьменьнік Базыль Базылец. Нават Чыкілевіч прышоў паслухаць Пракопа.

Сход адчыніў старшыня колгасу Лукаш Гулак, пры гэтым ён сказаў кароткае ўступнае слова.

— Таварышы! колгасная справа—для нас новая справа, і ня ўсе яшчэ разумеюць яе. Шмат хто баіцца колгасу, думае чорт ведае што. Дык нам цікава паслухаць, як жывуць тыя колгасы, што ўжо маюць пэўную практыку, як організаваныя раней. Вось наш таварыш Пракоп сам, сваім адумам, перш чым запісацца ў колгас, рашыў пайсьці паглядзець, што робіцца ў колгасах, аб чым і мае далажыць сходу.

На Пракопа пазіралі цяпер сотні пар вачэй. Пракоп затрубіў носам і пачаў:

— Дык вось, таварышы-грамадзяне! Што я вам скажу? Вы ведаеце, што я быў прапаў. Не хацеў я колгасу. «Згары ты», думаю, «гэты колгас! Новую выдумалі паншчыну. Які буду я там гаспадар?» Ну ведаеце, думаў я так, як можа шмат хто з нас думае яшчэ і цяпер, і пашоў, абы ў колгасе ня быць. Цягаўся я, цягаўся—дзе-ж ты ў чорта зімою работу знойдзеш, калі апроч

плуга, касы і тапара ніякага струманту ў руках не дзяржаў? Думаў я думаў і нарэшце думаю: а давай зраблюся дэлегатам ды пагляджу бліжэй на колгас. І пашоў. Няёмка мне было, баяўся, каб дакуманту ня спыталі, бо які-ж я дэлегат?

І расказаў падробна Пракоп пра колгас «Хваля рэволюцыі», пра сталоўку, дзе так добра кармілі, пра лазьню, у якой змылі з яго «аднаасобніцкую кулацкага гатунку» гразь, пра кватэры колгасьнікаў, пра кантору, пра знамяніты Лапкоў будынак. А калі стаў ён расказваць пра маёмасьць колгасу і яго здабыткі і ўпамянуў кныра «Пана Пілсудзкага», то комсамольцы і колгасьнікі зарагаталі і дружна запляскалі Пракопу.

Калі Пракоп скончыў, то некаторы момант сход маўчаў, глыбока, зьдзіўлены, а потым сталі закідаць Пракопа пытаньнямі, што сьведчылі аб вялікай зацікаўленасьці сходу колгасам «Хваля рэволюцыі». І толькі дзед Піліп выказаў сумненьне, ці праўда гэта ўсё.

— Калі-б я ня бачыў усяго гэтага сваімі вачыма,—адказаў на сумненьне дзеда Піліпа Пракоп:—я і сам не паверыў-бы. Але вось я што скажу вам, таварышы, пашлеце вы туды дэлега-

цыю з тых, хто не дае мне веры. І трэба нам, таварышы, паслаць туды людзей вучыцца будаваць сапраўдны колгас.

Колгас перамог.

З апушчанаю галавою ішоў Чыкілевіч на сваю сядзібу, адчуваючы, як звужаецца круг яго жыцця і гінуць яго надзеі. Што-ж рабіць? Успомніў Юркавы словы. Выхад адзін—перабрацца ціхенька, пакі ня позна, у горад. І паціху зьбіраўся ён. У горадзе як-бы трохі і клёвала. Знаёмы сальнік гатоў быў трохі дапамагчы яму. Заставалася толькі як-небудзь выратаваць кубель з салам, крупу і іншы кулацкі скарб, схованы ў патайным склепе ў клуні. Але пакі ён абмяркоўваў плян, як дастаць з склепу дабро, не драмала і зоркае вока Кандрата Казея. Калі сена над склепам было аскубана, Казей зьвярнуў увагу на сваяасаблівасьць гуку ў яго пад нагамі. Тупануў нагою раз—трупіць пустатою, глухі звон аддаецца. Стаў рабіць досьледы, і вострая дагадка асьвятліла яму галаву. Замкнуў клуню і незаметна шмыгнуў на сяло.

Калі, счакаўшы, на дварэ зноў паказаўся Казей і не адзін, а з старшынёю колгасу, з Марынічам і Амяльлянам Нічыпаруком, то Чыкілевіч

крыху затрывожыўся. Яшчэ больш узрасла яго трывога, калі Лукаш Гавака запытаў, ці ёсьць у яго што-небудзь у клуні.

— Ёсьць тое, што бачыце: сена, салома,—адказаў Чыкілевіч, а твар яго зьбялеў, як палатно.

Старшыня не сказаў болей нічога.

Мужчыны пашлі ў клуню. Амяльлян Нічыпарук нёс лом, а ў Марыніча была лапата.

— Прапала сальца, прапала крупа, самавары і срэбра!—прастагнаў Чыкілевіч.

Як прышыбленая громам, маўчала Ульляна.

— Заперці іх і спаліць разам з клуняю!—Юркавы вочы загарэліся дзікім агнём і ён хацеў ужо бегчы, каб ажыцьцявіць сваю пагрозу.

— Сьмерць, сьмерць наша!—дзіка крычала Ульляна, паваліўшыся на зямлю.

Незаметна засунуў Чыкілевіч тапарышча сякеры ў рукаў пільчака і выскачыў з хаты. За ім пабег і Юрка.

Мужчыны-ж у клуні, раскрыўшы патайны склеп, былі так захоплены гэтаю знаходкаю, што і не заўважылі Чыкілевіча з сынам. Старшыня і Казей стаялі над склепам і цягнулі мяшок з крупою. Галасы Марыніча і Амяльляна глуха гулі ў склепе.

Выцягнуўшы мяшок, старшыня і Казей несьлі яго на ток.

— Грабежнікі!—закрычаў Чыкілевіч.

Сякера высьлізнула з яго рукава, і, высока падняўшы яе за канец тапарышча праваю рукою, ён рынуўся на мужыкоў.

Жахнуўся Юрка. Гарачая кроў яго астыла.

— Спыніся!—крыкнуў бацьку і хацеў схапіць яго за руку. Рука з падняятаю сякераю адхілілася ад Казеевай галавы і халодным вастрыём сяканула ў Юркаў твар ніжэй вуха.

— Ой,—крыкнуў ён і акрываўлены звалiўся на мёрзлы ток.

Сякера выпала з рук Чыкілевіча.

— Сынок мой! што я нарабіў!—загаласіў бацька і паваліўся на Юрку.

Яго адцягнулі і зьвязалі. Потым яго забрала міліцыя, Юрку перанесьлі ў хату. Рана яго была хоць страшная і глыбокая, але не сьмяртэльная.

Бабура зрабіў хітрэй.

Калі комсамолец Гаруй паехаў на бухгальтарскія курсы, то Анэтка зраклася бацькоў, сардэчна разьвіталася з ім і паехала да Гаруя і запісалася з ім. І збылося Лапкова прароцтва аб тым,

што Анэтка будзе колгасьніцай. Сам-жа Бабура ціхенька ліквідаваў сваю маёмасьць, здабыў сабе дакумант, што ён батрацкага роду і з гэтым дакумантам пашоў шукаць сабе шчасьця на новым месьце, а яго дзецям былі шырока расчынены дзьверы на арэне жыцьця.

16-V 1931 г.

LATVIJAS VALSTS BIBLIOTEKA

Бел. архивъ
Прилепъ

1964 г.
Бел. архивъ
1994 г.

B000000 195864 1